*Прысвячаю маёй*
*малой Радзіме*

Уладзімір Васько

# Энергія душы



***Уладзімір Васько нарадзіўся ў вёсцы Ліпічанка Шчучынскага раёна. Скончыў Гродзенскі педінстытут імя Янкі Купалы.***

***Працаваў у рэдакцыях Шчучынскай (1959-1960), Дзятлаўскай (1967-1972) і Лідскай (1972-2000) раённых газет. Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў з 2007 года. Жыве ў Лідзе.***

***Друкуецца ў рэспубліканскім, абласным і раённым друку. Выдаў кнігі «Прасветленнасць» (1981), «На схілах берагоў» (1997), «Кругаварот жыцця» (2011), «Лясная рапсодыя» (2013), «Зігзагі лёсу» (2017).***

# Уладзімір Васько

# Энергія душы

*Вершы, проза*

Ліда
Лідская друкарня
2018

pawet.net

УДК 821.161.3-821
ББК 84(4Беи)
В19

**Васько, У. Г.**
В19 Энергія душы : вершы, проза / Уладзімір Васько. – Ліда : Лідская друкарня, 2018. – 160 с.

ISBN 978-985-6437-46-8

У выданні «Энергія душы» змешчаны вершы і проза аўтара. Кніга апавядае пра вёскі Наднямоння, родную прыроду, адносіны паэта да людзей і часу. Чытач знойдзе тут лірычныя, спавядальныя творы, таксама вершы грамадзянскага гучання, фантастычную аповесць для дзяцей, ёсць месца паэтычнай фантастыцы і прозе.

**УДК 821.161.3-821**
**ББК 84(4Беи)**

**ISBN 978-985-6437-46-8**
© Васько У. Г., 2018
© Афармленне. ГАУПП «Лідская друкарня», 2018

# Паэзія

## *У Ліпічанскай пушчы*

Не вельмі я люблю лесапасадкі.
Мне больш па сэрцу самасейны лес:
У ім свае адвольныя парадкі,
А праз пасадкі паспрабуй, пралезь.

Вось дуб-філосаф думае аб чымсьці.
Аб чым ён думае – нам ведаць не дано.
А помніш, мы пад ім былі калісьці?
Даўно гэта было? Даўным-даўно.

А вунь бярозка вёрткай балярынай
Падскоквае на маладой траве.
Яна злілася з трэллю салаўінай,
Ёй толькі танцы, песні ў галаве.

Сама да ног спяшаецца сцяжынка.
А дрэвы ўздоўж яе – усе ўразброд.
Тут зачаруе кожная галінка –
У пушчы Ліпічанскай мой курорт.

## *Дарога*

Я сам сабе не лепшы лёс стварыў,
Не тую "кашу" ранкам заварыў.
Я на памылках коўзаўся ў жыцці,
Не ўмеў да мэты правільна ісці.
Ішоў я на святло, трапляў у змрок,
Мне падстаўлялі ножку назнарок.
А я, наіўны, давяраў усім,
І сапасаваў дарогу назусім.
Я думаў зло абыйдзе, абміне,

Не дакранеццам пальцам да мяне.
А атрымалася наадварот.
Ды я шчаслівы: мой жыве народ,
І Беларусь мая жыве, жыве,
І конь мой пожню свежую жуе!

*2010*

## *Гняздо паэтаў*

*(З нагоды адкрыцця знака-каменя
траім паэтам ў вёсцы Зачэпічы,
што на Дзятлаўшчыне)*

Зачэпічы – гняздо паэтаў.
І на мяне, нібы камета, мэта
Звалілася пра гэта напісаць,
Набеглыя радкі зарыфмаваць.
Тры постаці – тры мужныя паэты
Прамень, Граніт, Струмень.
Я ўбачыў іх на вулцы сілуэты
Ў гэты дзень.
Стаяла восень. Ветру не было.
А наваколле золатам цвіло.
На камені тры надпісы звінелі:
Прамень, Граніт, Струмень.
Пяткевіч з Дубатоўкам прыляцелі
Ад гродзенскіх мясцін,
Са Слоніма наведаўся Чыгрын.
Я, Суднік і Чарняк
Прысунуліся з Ліды,
А з Дзятлава прадстаўнікі эліты –
Валера Петрыкевіч, Юргілевіч.
Прамоўцы слоў гарачых безліч
Шпурлялі ў натоўп і ў восень.
І мне невыпадкова падалося,
Што тут прысутнічаюць з намі разам

Прамень, Граніт, Струмень.
Я ўбачыў іх выразна,
Хоць хмаркі па зямлі і слалі цень.
Прафесар з Гродна
Аляксей Пяткевіч
Казаў, што Івашэвіч і брукар,
І ў школе дзецям выкладаў буквар,
І ведаў прозвішчы ўсіх паэтаў,
І ў Беліцы быў старшынёй Савета.
Зачэпічы прыкметна апусцелі,
Ды ўсе, хто ёсць,
Да каменя прыйшлі
І кветачкі жывыя прыняслі.
Стаялі ціха, моўчкі, не шумелі,
І толькі восень гукі-трэлі
Лістоты выдавала ўгары,
Ды мак таўклі бліз хатаў камары.
Пятрусь Граніт – Іван ён, Івашэвіч.
Бываў я ў яго доме шмат разоў.
Грыбы збіралі з ім каля Зачэпіч
І ў Нёмане лавілі мянтузоў.
І на кватэры ў Максіма Танка
Прайшлі да класіка ў працоўны кабінет.
А на вакзале смуглая цыганка
Сказала: “Пойдуць вашы кнігі ў свет”.
Зачэпічы – гняздо паэтаў:
Прамень, Граніт, Струмень.
Яны любоўю нашаю сагрэты,
Іх прозвішчы не затушуе цень.

*2016*

## Прысвячэнне

Пра што пісаць?
Якой асобе свой верш чарговы прысвяціць?
Каго ў слове увасобіць,
Каго на подзвігі натхніць?

Стаю. Наўкола пазіраю:
Чым сэрца зноў узварушыць?
Табе мой край, мой родны краю,
І мой радок, і успleск душы.

*2011*

***

Так чыста, гладка зроблен верш.
І слоў нямнога – толькі жменька.
Іх, як ланцуг, не разарвеш.
Ды сэнсу ў іх – адна капейка.

*2011*

## Злыдні

Размах маіх рук паўпланеты ахопіць
І кожнаму злыдню яшчэ раз напомніць:
Схавацца яму не ўдасца нідзе –
На сушы, у лесе, у доме, у вадзе.

Яго я ўсюды рукамі дастану
І доўга вазіцца з брыдою не стану.
Ды, мабыць, без злыдняў – круці не круці –
Не будзе ніколі ў нашым жыцці.

*2011*

## *На ўзгорку маладосці*

…А вось той бераг, тыя Пышкі –
Лясны прыгродзенскі масіў.
Гляджу адсюль, як быццам з вышкі,
На далягляд рачны і сінь.

Тут мы студэнтамі гулялі.
Як голас наш тады звінеў!
Як моцна сэрцы трапяталі!
Які быў смех! Які быў спеў!

Дзе вы цяпер, мае сяброўкі?
Дзе вы, найлепшыя сябры?
Стаю. А поруч вецер гонкі
І ўздых загадкавы ў бары.

*2011*

## *Дайце прайсці*

Расступіцеся! Дайце прайсці
У стан паэтаў неардынарных.
Не век жа мне у пустыні пасціць
У ботах прапыленых і парваных.

Расступіцеся! Ласкай прашу,
Бо ўрэжуся – будзе нямала.
Я верш на руках, як дзіцятка, нашу.
Яго зязюля накукавала.

Ён з чыстай і добрай душы прарос.
Імкнецца да сонца, бы колас.
Яго карміў я лістотай з бяроз –
І ён узвысіў свой голас.

Расступіцеся! Дайце прайсці
У стан паэтаў неардынарных.
Я рыфмамі ўмею грахі адпусціць,
А рытмам вылечваю раны.

## *Па мову*

Ішлі яны берагам. Лес дзе-нідзе …
І раптам сустрэў іх дапытлівы дзед:
– Куды вы так, хлопцы, пяшком, басанож …
– Па мову, дзядуля.
– Па мову?
– Няўжо ж.
Бо ў горадзе штосьці яе не чуваць.
Мы пойдзем па вёсках святую шукаць.
Ці ёсць яна ў Зблянах?
– Ды, кажуць, жыве.
А хто ж ад народа яе адарве?
Яшчэ Панямонцы гукаюць на ёй,
Збіраючы ў лесе грыбы за ракой.
– А Пескаўцы?
Хочам і там мы пабыць.
– І ў Пескаўцах, думаю, будзе шчэ жыць.
Гамоняць на ёй Шаўдзіні і Шаршні,
Бурносы, Дакудава, Орля, Гузні.
– Мы хочам дабрацца яшчэ і туды,
Бо родная мова з крынічнай вады.
Ну дзякуй, дзядуля.
– Бывайце, браткі.
Сціскайце ў дарозе мацней кулакі.
І хлопцы ўздоўж Нёмна ідуць і пяюць.
А сосны ім водар і сілы даюць.
Вітаюць іх зыкі пчалы і чмяля,
І бусел крылом ім махае здаля.

Задуму іх дуб старажытны ўхваліў
І сэрцы агнём векавым распаліў.
І дзяцел адобрыў іх смелы імпэт.
А гэта былі музыкант і паэт.
І хораша хлопцам так крочыць было,
Дзе ўсё наваколле буяла, цвіло.
Ды раптам аднекуль ці звер, ці мо чорт
Узнік на сцяжынцы, скрывіўшы свой рот.
І мовіў так брыдка, так гадка, не ўлад:
– А ну, недацёпы, шуруйце назад!
Задумалі мову па вёсках шукаць?!
Ды мне на яе і на вас напляваць.
Хіснуўся падбел малады ў бакі –
І сціснулі хлопцы мацней кулакі.
– Ну, што, пабаксуем, стары прайдзісвет? –
І ў лоб засандаліў злачынцу паэт.
Музыка ляўшою пад дых садануў –
І чорта як вецер наднёманскі здуў.
І зноўку пакрочылі хлопцы далей,
Ды ўжо пачалі прыглядацца пільней,
Каб зноў на шляху не ўзнік ліхадзей,
Не зблытаў іх карты, не ўкраў іх надзей.
У вёсках над Нёмнам ва ўсіх пабылі,
Збіралі па слоўцу, дзе толькі маглі:
У хатах, на вуліцы, ў полі, ў лужку –
І мовы набралі па поўным мяшку.

## *У дарозе*

За полем – лес, за лесам – поле.
Вось так і шоў бы цэлы дзень.
Па міласэрнай Божай волі
Ласкае сонца, цешыць цень.

А сэрца поўніцца свабодай,
І я ўсяму сусвету рад,
І кліча новай асалодай
Шырокі, родны далягляд.

*2012*

## Хадзюкі

Мы на свята прыехалі ў госці
У мясціну, дзе сосны наўкол.
Тут жыла, тут цвіла ў маладосці
Паэтэса Хрысціна Лялько.

Гэты хутар мне казкай здаецца,
Ды з чыёйсьці ўдалай рукі
Ён ў свет неабдымны ўвальецца.
Называецца ж ён Хадзюкі.

Добра тут. І ўтульна, і ціха.
Цёплы лес. Белы сад. Дзікі мёд.
І Хрысціна, нібы салаўіха,
Сустракае сонца ўзыход.

Хоць цяпер яна ў сталіцы.
Толькі цягне магнітам сюды,
Каб на родны куток памаліцца
І напіцца крынічнай вады.

*2012*

## Ноч

У суседа па дачы патухла святло.
Я таксама сваё патушыў.
Ды стаю ля акна, ды гляджу ўсё ў акно:
Толькі поле і лес. І нідзе ні душы.

Ветрык мяккім лісіным хвастом
Замятае лыжню да шашы.
Прыглядаюся: заяц прысеў пад кустом
І развешвае ледзяшы.

Эх, каб разам з ім праскакаць
Праз марозны іскрысты абшар,
Сакавітую рунь адшукаць
І набрацца сярэбраных чар.

Лёгкі ветрык галінкі не гне.
Зоркі ў небе так ярка гараць!
Ноч для зайца і для мяне
Як высокі, бяскрайні палац.

*2012*

## Марна

Шукаю кропку апоры,
Ды марна. Усё марна.
Не зрушыць высокія горы
Рычаг неакрыленай мары.

Не зрушыць ні слоты,
Ні гора, ні тоўстага бюракрата.
Не зрушыць ні неба, ні мора,
Ні крошку нябачную – атам.

Закінуць мо гэту задумку?
Навошта мне кропка такая?
Зраблю першакласную дудку –
Хай вецер на ёй паіграе.

*2012*

## *Клубок*

Разблытваю клубок былога лёсу,
Выпроставаю крывуліны дарог.
Мне многае ў жыцці не ўдалося,
Не ўсё зрабіць я, што задумаў, змог.
І сам ў гэтым, пэўна, вінаваты,
І перашкоды розныя былі.
Здаралася, што быў наіўнаваты,
Дзе іншыя сцяну ўзламаць маглі.
Разблытваю клубок, ды пазнавата.
Я пад мінулым падпішу: “Амін”.
Але ляціць, ляціць да нашай хаты
Вякоў наступных жураўліны клін.

*2012*

***

Гукні ў прасторы: мо яны
Цябе пачуюць, падтрымаюць,
Лясы і травы акрыяюць.
Гукні, як лось сярод вясны.
Гукні ў народ хутчэй, цяпер –
І ён твой голас прывітае,
І той, хто ў прыцемках блукае,
Памкнецца сэрцам да цябе.

*2012*

## *Спявачка*

Гітара на гладкіх каленях,
А позірк, бы ў юнай арліцы.
У ім ад нудоты збавенне
І радасць, што сонцам іскрыцца.

Ах песня! Ах гэта спявачка!
Як хораша мне! Я ўзлятаю.
Ты з неба, ты Бога сваячка.
Кахаю цябе я, кахаю.

Твой тварык вясёлы, чароўны,
А голас за душу кранае.
Я трапіў, табою натхнёны,
У свет салаўінага раю.

Спявачка, спявачка, спявачка,
Я ў думках цябе абдымаю.
Ты з неба, ты Бога сваячка,
Ты кветка святочнага мая.

*2012*

## На хутары Хрысціны Лялько

Чыгунка. Бетонныя шпалы.
Сцяжынка на хутар вядзе,
І ветрык, ласкавы і шалы,
Купае лістоту ў вадзе.
Ад рэек ідзем у нізіну,
Дзе кволы туман растае.
Карціць нам убачыць Хрысціну
І цётку, Зузанку, яе.
Бярозкі, асінкі, арэшнік.
Вунь беленькі домік, платы.
Ля іх парыжэлы алешнік
І два старажылы – каты.
А восень глядзіцца карцінна,
І ветрык згубіў дзесьці злосць.
Прасілі Зузанка з Хрысцінай

На зіму ім дроў накалоць.
І вось мы ўжо на падворку.
Сабачка не брэша на нас,
І куры заводзяць гамонку
Пра добры і радасны час.
І выбегла з хаты Хрысціна,
Сабой ажывіла ўвесь двор.
Ой, хутар! Не хутар – маліна,
Для ўзнёслага духу – прастор.
Зузанка прыйшла, паглядзела …
Гамонка ў яе, нібы ўсхліп:
– Шкада, што вось заўтра нядзеля,
А так вы даўжэй пабылі б.
– Мо супчыку? – кажа Хрысціна. –
Ёсць моцны, гарачанькі чай.
– Нам кожная ў кошце гадзіна.
Ты з чаем пакуль пачакай.
Пайшлі да дрывотні спаважна
(Люблю калоць дровы, люблю)
І шчыра, натхнёна, адважна
Ўзяліся за працу сваю.
Сякеры, як птушкі, ўзляталі
З пагрозай для грознай зімы,
З сукоў высякалі медалі,
Якіх заслугоўвалі мы.
Каза са здзіўленнем казіным
Глядзела ўтрапёна на нас.
У ладачкі-ладкі асіны
Пастуквалі тысячы раз.
А мы ўсё калолі, калолі
Сасновыя дровы ў двары
Да поту на майках, да солі,
Да прабліскаў сонца ў бары.
І вырас кастрог адмысловы.

Такого нідзе не знайсці.
Ды чуем удзячныя словы
І просьбу ў хату зайсці.
На кухні забліскалі чаркі.
Мяркуем: з чаго тут пачаць?
І тосты ў гонар Зузанкі
І ў гонар Хрысціны гучаць.
Прыўшоўся і суп да спадобы,
Духмяны, здаровы, грыбны.
Стол поўны, нібы для аздобы.
Якой не было тут яды!
Каўбаскі, гуркі, памідоры,
Кумпяк, макароны, салат.
Прызнацца, жывём не ў горы:
Зашмат нават страваў, зашмат.
Ды час і развітвацца. Годзе
Сядзець за гасцінным сталом.
І мы на падворак выходзім,
Дзе пахне каза малаком.
Абдымкі. Журба. Пацалункі.
І толькі ні кроплі нуды.
Бывайце, лясныя малюнкі,
Яшчэ мы прыедзем сюды.
Плывуць аблачынак арэлі.
Красуецца восень наўкол.
Музычнай рукой загарэлай
Махае Хрысціна Лялько.
Чыгунка. Бетонныя шпалы.
Дарога ў Ліду вядзе.
І ветрык, вясёлы і шалы,
Купае лістоту ў вадзе.

*2012*

## Шаўдзіні

Я прыехаў сюды на кані,
Проста так без усякай патрэбы.
Каля лесу стаяць Шаўдзіні,
Па-над Нёманам сінім, як неба.

Адлюстроўвае хаты рака,
Бацяна на высокай таполі.
Хто калі тут на лёс наракаў?
Ды, здаецца, ніхто і ніколі.

Хочаш рыбку злавіць? Дык ідзі.
Хочаш ягад набраць? Калі ласка.
Хочаш грыб у вядро пакладзі,
Што стаіць пад карычневай каскай.

Ну, а людзі – адны дабракі,
Любяць праўду і нашу Айчыну.
Не зрукі ім падман, не зрукі
Браць у вёску замежных айчымаў.

*2013*

## На дачы

Ёсць на дачы хаціна з бярвенняў у мяне.
Тут наўкол так прыгожа, прывольна і ціха!
І на ліха мне шум гарадскі, ну на ліха?
Рэзкі візг тармазоў за сто вёрст абміне.

Ля дарогі стаіць мой асінавы плот.
За дарогай  лясок, малады і зялёны.
Я пад вішняй сяджу, салаўямі натхнёны,
А паблізу ў цяньку спіць пярэсценькі кот.

Пахне сенам: я ўчора траву пакасіў.
Зацвілі памідоры і бульба – таксама.
Вось спаткаюся з рыфмай найлепшаю самай –
І усміхнецца лагодна зялёны масіў.

*2013*

## Прызямленне

Задумаць што-небудзь такое,
Каб свет навакольны здзівіць,
Каб славай памерацца з Ноем,
Галодных усіх накарміць,
У космас забрацца б – на месяц,
На Марсе хоць раз пабываць.
Ах, думкі! Ах, мары! Як цешаць!
Іх трэба ж практычна здзяйсняць.
А гэта ўжо мне не пад сілу …
Дык абы пра што не зюзні.
Вазьмі лепш вунь тую кабылу
І з лесу воз дроў прывязі.

*2013*

## Таўлай натхняе

Гісторыя лёсы ламае,
Як дрэвы завея ліхая.
Ды постаць жывая Таўлая
На подзвігі й сёння натхняе.
Ад Рудаўкі крочыў ён смела
Да Вільні, да шчасця, да ведаў.
Ды ўлады накладвалі вета
На шлях і задумы паэта.
І гумай, і шомпалам білі.
Турму яму домам зрабілі.
Ды ён не змарнеў, не зламаўся:

За праўду і волю змагаўся.
Адвагай быў вельмі багаты
І ўрэзаўся вершам ў краты.
І ў волата вырас хлапчына,
І гонарам стаў для Айчыны.
І нас анідзе не зламае
Ніякая сіла ліхая,
Бо мужная постаць Таўлая
На подзвіг і сёння натхняе.

*2013*

## Падару песню

…Ад Кургана ў горад я іду.
Чайкі лёгкакрылыя лятаюць.
Дрэвы заглядзеліся ў ваду,
Нібы Гедыміна ўспамінаюць.

Экзатычны мост цераз раку.
Сноп, адліты ў бронзу да дажынак.
Леў, нібы спыніўся на скаку,
Шле мне пра былое напамінак.

Ад будынкаў шэрых след прапаў.
Ліда ўся ў промнях залацістых,
Быццам хтосьці злітак адкапаў
І паклаў каля азёр празрыстых.

Недарэмна лебедзі сюды
З даляў неабдымных прылятаюць,
Недарэмна майскія сады
Ўсмешкамі дзявочымі вітаюць.

Я на крэпасць гляну, пастаю…
Як яна за год памаладзела!
Я ёй песню падару сваю –
Хай жыве, як светлая надзея!

*2013*

## Ліда мая дарагая

…Захапіцца – гэта вельмі мала …
Палюбіў цябе я назаўжды!
Помніш, як задумлівы Купала
Прыязджаў перад вайной сюды?
Я цябе ў душы штодзень люляю.
Ты мая Радзіма, мой куток.
Я цябе і ў сне не прамяняю
На Парыж, на Лондан, на Н'ю-Ёрк.
Вабіць вуліц квецень маладая.
Вабіць вокнаў яркае святло.
Ты мне, як матуля, дарагая,
Як настой духмяны родных слоў.
На трывалым ты стаіш падмурку
І трымаеш годна гонар свой,
І масты твае цераз чыгунку,
Нібы ўзлет фантазіі жывой.
«Лідсельмаш» і «Лакафарба» лашчаць
Позірк мой. Яго не адвясці.
Ты маё загадкавае шчасце,
Радасць першародная ў жыцці.

*2013*

## Адзінота

*Жыхару вёскі Пескаўцы*
*Міхасю Дудзіцкаму*

На падворку гурбы пад пахі.
Ноч самлела ад цішыні.
А бярозы ў белых папахах
ужо чакаюць цяпла з вышыні.
А ў хаце старэнькі Дудзіцкі
ў тэлевізар панура глядзіць:
там то суд за ўчынак бандыцкі,

То тлумачаць, як кашу варыць.
Забаляць у Дудзіцкага вочы,
Галава падурнее ад слоў.
Хоць завый тут, ды голас не воўчы,
І ў сасудах не воўчая кроў.
Млосна стане на сэрцы ў дзеда …
Толькі што тут казаць і каму?
Вёска Пескаўцы так парадзела!
Жыць прыйшлося й яму аднаму.
Кіне «скрынку» глядзець і на ганак
Выйдзе чыстага неба ўдыхнуць …
Месяц жоўты, нібы абаранак,
Адбірае ў старога нуду.

*2013*

***

Нахлынула дзікая шэрасць,
Бяздумнасць газет і экранаў,
Красвордаў, сканвордаў замшэласць,
Пустых анекдотаў – дурманаў.

Нішто не хвалюе, не кліча.
Не цягнуцца рукі да неба.
Такая прыйшла акалічнасць,
Як цвіль бездухоўнага хлеба.

*2013*

## Пра Насцю і Лебяду

…Нашча іду да Насці,
Як да споведзі ў рань іду.
Насця, ці прымеш нашча
Мяне ты у сваю Лебяду?

А над ракою Лебяда
Ёсць вёска Лебяда.
І гэта не бяда,
Што назва яе – Ле-бя-да …
Каліны тут цвітуць,
Рабіны тут цвітуць,
Дзяўчаты тут цвітуць –
І ветру іх не здзьмуць.
Насцеж прастор і поле,
Насцеж мае лугі і гаі,
Насцеж усё раздолле.
Насця, не адкажы, прымі.
Насця – маё ты шчасце,
Як сонца жаданы ўзыход.
Стань ты маёю, Насця,
Я перайду Лебяду ўброд.
А над ракою Лебяда
Ёсць вёска Лебяда.
І гэта не бяда,
Што назва яе – Ле-бя-да…

*2013*

## У Панямонцах

Красуюцца над Нёмнам Панямонцы.
Прыпарыла. Сцішала. Прыпякло.
І залацяцца карасі ў лодцы,
Якіх навудзіць сонца памагло.

А ліліі ўпрыгожылі затоку.
У кожнай з іх дзявочае святло.
І ад яго загадкавага соку
Ўсё наўкола ярка расцвіло.

Не патрывож, не напалохай чаплю:
Ёй сніцца лёгкі, каляровы сон,
Як лебедзь-цар да берага прычаліў
І ёй адбіў даверліва паклон.

А Нёман тут, як род людскі, – бясконцы.
Чаруе лозаў маладая плынь…
Пабудзь хоць дзень у вёсцы Панямонцы
І цёплы след у душы сваёй пакінь.

*2013*

## Сялец

Каля Нёмана ціха стаіўся Сялец.
Белых воблакаў лёгкая накіп на небе.
Ты не думай, што вёскам прыходзіць  канец,
Але думай аб іх, як аб масле і хлебе.
Фестывалі прайшлі ў гэтай вёсцы лясной,
Але людзі жывуць і  па вуліцах ходзяць,
І цюльпаны цвітуць сакавітай вясной,
І сады, хоць старыя, яшчэ пладаносяць.
Гарадскія ў Сяльцы раскупілі дамы.
І  сваіх жыхароу тут жыве палавіна.
І ўпрыгожваюць ранкам дымкі каміны,
І  цвіце выпускніцай пры школе каліна.
Мір уплёўся ў кветкі і лёсы людзей.
Ды была тут вайна, і былі партызаны.
І стаяць яшчэ дзоты (адзін у вадзе),
І смыляць у дзядулі даўнейшыя раны.
А чыгуначны мост аднавілі даўно.
Ён глядзіцца карцінна на фоне прыроды.
Эх, каб зняць гэты здатны пейзаж у кіно,
Хоць з любой выпадковай і простай нагоды!

*2013*

## Адзінокая вёска

Забытая вёска ў полі,
Забітыя вокны ў хатах,
Зачынена крама з нядолі:
Людзей бо зусім малавата.
Старыя бабулькі – як цені.
Дзядулі – карчамі ля плоту.
Дарога, нібы ў здраньцвенні,
Чакае прылёту асоту.
Не бачна ніводнай кароўкі,
І зніклі апошнія козы.
Загінеш ты, вёска – палёўка,
І ўсё зараўняе бульдозер.

*2013*

## Грэх

…Як быццам мы ўсе патрыёты,
Гарою за мову стаім,
І думаем часта самотна:
Яна ж не на месцы сваім.
На ёй размаўляць перасталі
(І, мабыць, па нашай віне…),
Ад дзетак у садках адабралі,
У школах яна не ў цане.
А хто выхавацелькі? Нашы.
Настаўніцы хто? Ды свае.
Чаму ж мы з двухмоўнае «кашы»
Загналі ў закутак яе?
Дзе прага да роднага слова,
Наказы дзядоў і бацькоў?
Дзе ўласная наша выснова,
Аснова з найлепшых асноў?

Самым трэба брацца за розум,
Паўсюдна на ёй размаўляць –
Такі мой – без хітрыкаў – роздум.
Грэх спадчыну сёння губляць!!!

*2013*

## Пра вечнае

Як адлёт журавоў, развітанне з табою балюча
Адгукнулася у сэрцы маім праз вякі.
Ты была для мяне і травою лясною гаючай,
І ракой, абдымаючай лоз астраўкі.

Ператруцца стагоддзі ў радасцях светлых і крыўдах,
Пераменіцца воблік зялёнай, пакутнай зямлі, –
Будзеш ты прылятаць на сваіх непараненых крылах,
Буду я прылятаць – толькі Бога аб гэтым малі.

Не, ніштo не ўмірае! Мне вечнай здаецца планета.
І вечнымі людзі, якія ступаюць па ёй,
І вечнаю ты, і вечным каханне паэта,
І вечным імя дарагое тваё.

*2013*

## Велічны спеў

Азёры. Аблокі. Бярлогі.
Праз пушчу ідзем напрасткі.
Якія нябачныя богі
Наладзілі птушкам свісткі?!
Найлепшы займеў салавейка –
Так цешыць і душу, і слых!
Мой сябра Іван Муравейка
Ад радасці проста застыў:
– Паслухай, як здатна выводзіць!

Не тое, што нейкі крумкач …
– Ён Моцарт пушчанскі, выходзіць?
Сальеры тады, мусіць, драч?
– Бадай, што не будзе памылкай,
Калі ты іх так назавеш.
І ты ў сваіх вершах не ціўкай.
Глядзі, каб пявучым быў верш.
– Ды буду старацца, старацца.
Бывае і ў натхненні віна…
Мне б толькі ў пушчы набрацца
Птушыных мелодый спаўна.
А пошчак і посвіст пярнатых,
Здаецца, й яшчэ памацнеў.
І мы з Муравейкам дахаты
Нясем гэты велічны спеў.

*2013*

## Мая Айчына

Нічым не замяніць маёй Айчыны.
Я пупавінай да яе прырос.
Тут кожны дуб магутны – малайчына,
Салодкі водар кліча да бяроз.
Мілуюць сэрца рэкі, пералескі,
Пакатыя ўзгоркі ля дарог,
Каля крыніц – вясёлыя пралескі,
На полі канюшына і гарох.
Жытнёвых хваль аблічча маладое
Кранаецца даверлівай рукі.
А за мяжой? А за мяжой – не тое.
Мы там як адзіночкі – байструкі.

*2013*

## Прызнанне ў любові да Ліды

Зацьменне сонца – без цябе.
З табою свет, як азарэнне.
Прымі сыноўняе маленне,
Як першаквецень на вярбе.
Такія думкі я лаўлю,
Калі ў сабор іду на свята.
Стаць птушкай вольнай і крылатай
У гэты час я нараўлю.
Мне зверху бачны не з малых
Палац лядовы, стадыёны.
Дамы, нібы акардыёны,
Стаяць на вуліцах прамых.
Не, я з раскошай не парву.
Якія тут харчкамбінаты!
І я шчаслівы і багаты,
Што ў гэтым горадзе жыву.
Тут след гісторыі не знік:
Для галак здатнаю выгодай
Ўзнялася вежа піўзавода,
І я ў нудоце не панік.
Эх, каб за куфлямі прысесць
З дружынай слаўнай Гедыміна!
Маё прызнанне, як маліна:
У Лідзе ёсць што піць і есць.

*2013*

## Добры настрой

Заглядзелася сонца ў раку,
Асвятляючы вёрткія рыбкі.
Добры дзень спадару рыбаку!
Добрай раніцы, срэбныя блікі!

Добры дзень стагадовым дубам!
Добры дзень, адзінокая лодка!
Добры дзень, бусляняты, і вам
І табе прыбярэжная плотка!

Вось дык раніца! Вось дык размах!
Вось дзе радасці сінія сховы!
Рады сонцу казяўка і птах,
І шчупак, і пастух, і каровы.

Ну а я? Што казаць пра мяне?
Я на небе бязвоблачным сёмым.
Я ў рэальнасці, ці мо ў сне?
Як мне лёгка і хораша сёння!

*2013*

## *Чалавек – мурашка*

Зямля – мурашнік. Мы ўсе – мурашы.
Ствараем нешта, нешта здабываем
І зарабляем пэўныя грашы,
Якіх удосталь вельмі рэдка маем.
Не ўсемагутны ўсё-ткі чалавек:
Не справіцца з жукамі з Каларады,
Ніяк не можа вылечыць калек,
З эстрады часам падае да здрады.
Ну й што, што ў космас неяк сігануў,
Але ж да зорак не дастаў рукамі?
Дык ён яшчэ так мала дасягнуў,
Як і мурашка, што паўзе на камень.
Праз тысячу гадоў мо падрасце,
І падужэе розумам і целам,
Калі не стане грудаю касцей
Ад зброі, што стварае агалцела.

*2013*

## Ах, якое хараство!

Завіруха. Мне б не збочыць.
Дрэвы ходзяць хадуном.
Дзесьці след згубіўся воўчы,
Спіць вавёрка моцным сном.
Я іду адзін праз цемру
Па дарозе з Жалудка.
Ветру я, як сябру, веру,
Не баюся вепрука.
Лес хістаецца, як п’яны,
Снег цярушыць за каўнер.
Я гарачы, апантаны.
Я студэнт. Я кавалер.
Родны дом у Гродне сніўся.
Вось і рушыў да яго.
Я малюся, як маліўся,
На цяпло жытла свайго.
Мне прыемна шпарка крочыць
І не думаць ні пра што.
Завіруха цешыць вочы.
Ах, якое хараство!

*2014*

## Брыдота

Хаджу па асфальце ці роснай траве,
Гляджу на жыццё і з нізін, і з пагоркаў, –
Мне часам становіцца прыкра і горка:
Якая брыдота між намі жыве!

Вось гэты забіць можа лёгка і проста,
А той вунь прадасць каго хочаш за грош,
А гэты духоўны смаркач, недаростак
У нервы ўвап’ецца, як гадкая вош.

І з імі нічога не зробіш, – не думай! –
Хоць ты ў памкненнях сваіх абамлей.
Лупцуй, не лупцуй іх славеснаю гумай, –
Усё, як ішло, так і пойдзе далей.

*2014*

***

Дробнатэм'е… Дробналессе…
Завыванне, а не песня.
Чым душу запаланіць,
Зрок і слых свой наталіць?
Аднастайнасць… Аднастайнасць,
Як асенняя туманнасць.
Дзе ты духа апантанасць?
Дзе ты сонечная радасць?

*2014*

## Аптымістычная мелодыя

Падводзіць вынікі мне рана,
Душа бо ў сіле і рука,
І не сканфужаны мой ранак,
І дух упарты, як рака.
І ўвойдзе ў берагі не хутка
Разліў пачуццяў маладых,
І далягляд мой не ахутан
Туманам восеньскай нуды.
На гладкіх лідскіх тратуарах
Вачыма прагнымі лаўлю
Усмешкі на дзявочых тварах –
Я іх, як майскі дзень, люблю.
Яшчэ на пляжы ў летні поўдзень
Я на руках магу хадзіць
І быць з усімі ў карагодзе,
Хто любіць жыць, а не скуліць.

*2014*

## *Волат*

Адзінокі над возерам дуб
У змаганні з вятрамі найпершы.
У яго пазалочаны чуб,
Любіць ён першародныя вершы
Белых воблакаў, хваль залатых,
Завірух, навальніц і туманаў.
У яго не прытуплены слых,
Зрок сягае да акіянаў.
Вам і мне яго не абняць –
Пяцярым трэба брацца за рукі.
Ах, як хараша лісця звіняць
На галінах разлапістых, пругкіх.
Ён не помніць народзін сваіх,
Бо стагоддзяў прабегла нямала.
Колькі грозных падзей і ліхіх
Ад сябе яго моц адганяла!
Прытуліся да дуба хоць раз,
Каб набрацца адвагі і сілы.
Ён не ведаў ніколі параз
Пры навалах бяздумнай стыхіі.

*2014*

***

На ўзбочыне дарогі,
Між лясоў і траў,
Пасяджу пад сонцам трохі
Без турбот і спраў.
Скіну стому, скіну клунак,
Дух перавяду,
Успомню першы пацалунак,
Праганю нуду.

*2014*

***

Радзіме шкодзіць толькі той,
Хто ў бядзе яе пакіне,
Хто за яе не пойдзе ў бой,
Як мыш, схаваецца ў мякіне.

*2014*

## Суседзі

– Прыкончу, зараза, – крыкнуў ён злосна.
І морда зрабілася жорсткай і грознай.
І так наляцеў, нібы тыгр на суседа,
Як быццам нічога святога не ведаў.
Набраўся ў тусоўках па горла благога.
Не верыць ў праўду, не верыць у Бога.
…Ну, а сусед не сварыўся, не біўся,
Апошнім кавалачкам хлеба дзяліўся.
Сумлення свайго не прапіў за капейкі,
Вучыўся жыццю у Ігната Дамейкі.
І зла не рабіў ні бандыту, ні жонцы,
Ні бацьку яго, ні матулі, ні дочцы.
А ён, паглядзі ты, нажом пагражае …
Пустая істота, тупая, чужая.

*2015*

## Пагулянка

Я ў аддалены лес паспяшыў спазаранку.
(Выеў вочы ў горадзе вулічны дым).
Сыпле вецер сняжынкі на шапку-вушанку,
Адчуваю сябе, як салдат, маладым.
Пахаджу, паблукаю.Што кінецца ў вочы?
Назіраць, любавацца – ніякі не грэх.
Можа ўбачу дзе след чалавечы ці воўчы,
Можа сойка рассыпле свой пошчак, як смех.

Зачароўвае ўсё, бы бярэ ў абдымкі:
Белым-белыя ёлкі, галінкі дубоў.
Абтрасае з арэшын вавёрка пушынкі,
Дзяцел шле тэлеграмы камусьці без слоў:
Можа тым, што ўжо адляцелі ў вырай.
Ну а ён не баіцца халоднай зімы,
Макраватай карой дзюб завостраны вымыў
І кіпцюрыкі ёй, нібы з мылам памыў.
Пахадзіўшы з паўдня, шкандыбаю ў горад.
Добра ўсё-ткі ў лесе зімой і вясной.
Я ўжо не слабак і не кволы заморак,
Я ўжо, бы асілак, сапраўдны герой.

*2015*

***

Ёсць хлеб і да хлеба хапае,
З гарэлкі хоць мора ўтварай,
Ды сум да душы прыліпае,
Хвалюецца сэрца за край.

Ем булку духмяную з мёдам
І ёсць сёе-тое адзець,
Ды дух нібы скаваны лёдам,
Прасвету няма анідзе.

*2016*

## Надвячорак

Стамлёны дзень прылёг на ўзгорак,
Рукою сонцу памахаў,
І ветрык кволы, як заморак,
Прыдбаў пасцель сабе з імха.
Вавёркі рыжыя залезлі
Ў норкі-домікі даўно.
А на ствале слізняк разлезлы
Глядзіць з-пад панцыра ў акно.

Вось-вось даліну затуманіць,
дымкі над вёскай паплывуць,
ноч зоркі яркія запаліць,
сама прыляжа на траву.

*2016*

## У споведзь

Куды ідзем? Што ўбачым на шляху?
Што нас чакае – слава ці пагібель?
Спалілі саламяную страху
І шыфер хутка ў балота кінем.
Метал выходзіць на пярэдні план.
І перад ім ўсё ўжо адступае.
Не птушак, самалётаў караван
Ў цёплы край у вырай адлятае.
У сонцапёк і ў цёмны дзень слаты
Ўганяем дым ў неба, як зубіла, –
І абалонка вуглекіслаты
Парнік ужо для ўсёй Зямлі зрабіла.
Яе наўсцяж абставілі і так
Магутныя крылатыя ракеты.
А ў кіёсках, крамах і ларках
Стаіліся ў абоймах цыгарэты.
Па смерць ў шчыльнай і нямой чарзе
Застылі міны, бомбы і патроны –
І чалавецтва на адной назе
Не ўцячэ пад пальмавыя кроны.
Куды ідзем?Што ўбачым на шляху?
Што нас чакае –слава ці пагібель?
Наеліся па горла ўсе граху.
Калі ж у споведзь да Хрыста пахілім?

*2016*

## Супярэчлівасць

Як улагодзіць звера ў чалавеку?
Як улагодзіць навальнічны гром?
Хто возьме сёння над Зямлёй апеку?
Яна ж для нас пакуль адзіны дом.
Ці нельга абыйсціся без забойстваў?
Ці так ужо заведзена здаўна?
І хвалямі спяшаюцца наўпроста
Ў чужыя землі варвар і вандал.
Ці рады мы за дабрабыт суседа?
Альбо няхай згарыць яго дабро?
Ці аддамо сабаку паўабеда?
Альбо ад аб'ядання лепш памром?
Бываем мы – хоць да душы прыкладвай.
І злосць па гарцу можам раздаваць.
Умеем стукнуць хораша прыкладам,
Пасля сумеем лоб забінтаваць.
Ты супярэчлівы і ён, і я – таксама.
У кім знайсці ўзор ці ідэал?
Калі хто і ўзвядзе духоўны замак,
Яго разбураць бомба ці напалм.
Не пудрай засыпаем свет, а сажай.
Каго за гэта трэба дакараць?
Не вер, хто шчыра і з ўсмешкай скажа,
Што заўтра ўжо не будзем ваяваць.

*2016*

## Спадзяванне

Няўтульна стала сёння на Зямлі,
І ў космас перабрацца не сумелі.
Ляцяць, ляцяць стальныя караблі,
Ды прыпыняюцца на МКС – на мелі.

Жытла пакуль што не змаглі знайсці,
Як Розуму вышэйшага, другога,
Каб на Венеры дзетак ахрысціць
І зноў вярнуцца да свайго парога.
Далей сягаюць думкі, чым метал.
Не ўсе ажыццявіць іх удаецца…
І Марксава ракета “Капітал”
Пры ўзлёце на шматкі парою рвецца.
Ды ў нас ў запасе трыллёны год,
І знойдуцца разумныя нашчадкі,
Якія і адправяцца ў палёт
Вышэй, чым сёння нашы касманаўты.

## *На лыжах*

Шырокі прасцяг задубелага поля.
Вясёлая песня прыгнутых сцяблін.
Пранізлівы вецер, здаецца, праколе
Чысцюткія пацеркі цёплых слязін.
Бялюткую коўдру ў цёмных заплатках
Знямелых праталін ні ў чым не віню.
Вушанка ў снезе, у снезе марнатка.
Гэй, курапаткі, я вас даганю!
Гарэзны, ўзнёслы, на лыжах імчуся,
Ахоплены юнай рамантыкай я.
Адважны, да неба рукой дакрануся,
Душа нарасхрыст маладая мая.
Люблю я азартных завеяў прабежкі,
Аблокаў імклівую плынь і зямлю,
Прыроднай стыхіі сардэчныя ўсмешкі
І ўсё, што хвалюе, бязмежна люблю.

# Я і свет

Хто я такі? – сам у сябе пытаю.
Хоць на Зямлі жыву, а ў космасе вітаю.
Мне падабаюцца і зоркі, і свяціла.
Любіць Радзіму мама навучыла.
Свет навакольны стукае мне ў скроні,
Пегасы – мае птушкі, мае коні.
Хто я такі?
Вось рукі, вочы, ногі.
Пралеглі па зямлі мае дарогі.
Не ўсе я іх прайшоў, не ўсе ўбачыў.
Дзяліліся ўдачы на няўдачы.
То падаў, то ўставаў
І за жыццё чапляўся.
Карысным для людзей
Заўсёды быць стараўся.
І ўсё ж сябе не ведаю нікольki.
Мяне праткнулі космаса іголкі.
Я золакам сцякаю на планету,
Хачу ўхапіць адсюль за хвост камету.
Хто я? Дзе я?
Якая ў сэрцы вера?
Не перадасць вам гэтага папера.
Люблю сяброў, дзяўчат і летуценні.
Вось мае вусны. Вось мае калені, –
Перад мацнейшым я на іх не кленчыў.
Аб дапамозе роспачна не енчыў.
І ўсё ж сябе не разумею часам.
Касмічным зачараваны Парнасам
Цягну цяжкую лямку па Зямлі,
Каб зоркі ўбачыць мой імпэт змаглі.

*2016*

## *Дзе вехі?*

Жыццё мяне футболіць, нібы мяч,
Нагамі б'е, як вогір капытамі.
І тут хоць смейся, хоць паціху плач –
Нічога не мяняецца з гадамі.
Ад тэлебачання баляць мазгі,
І блытаніна нейкая ў прыродзе,
І за гарляк сціскаюць абцугі
Магнітных бураў пры любой пагодзе.
Хваробы падступаюць да людзей,
Ніхто ўжо шчыра, здатна не смяецца.
Дзяўчаты кураць. Хлопцы без надзей
На лепшае ў будучым, здаецца.
Дзе вехаў паласатыя слупы?
Паэты дзе такія, як Ясенін?
Так і жыву, нібыта той сляпы,
Які ўвесь век шукаў іголку ў сене.

*2016*

## *Думы*

Што ў космасе? Напэўна, гук пусты …
Ці ёсць там хоць адна душа жывая?
Ці толькі астэроідаў хвасты
Ды зорак яркіх незлічоных зграя?

Але хвалюе чалавека ён,
І хочацца адкрыць там таямніцы.
Эх, каб знайшоўся б выведак-шпіён,
Прывёз адтуль знаёмы смак вадзіцы.

…А можа, мы прыйшлі адтуль даўно?
Ды толькі памяць стала ўжо слабая.
Яе адбілі кіслае віно,
Туманных дзён трывога немалая.

Каго ж не маніць той далёкі свет,
Загадкавы і прыцягальна мілы?!
І ты, зямны ўзрушаны паэт,
Пішы аб ім, наколькі хопіць сілы.

*2016*

## Сон

Даўным-даўно пра Марс мы марылі,
І вось ўжо на ім стаім.
Нам неба хмары не захмарылі,
Тут не да нас, напэўна, ім.
Мясцовасць не зусім адметная:
Дарог, сцяжынак – анідзе.
Зямля тугая, бы каменная,
Ніхто насустрач не ідзе.
А нам дваім бязмежна рупіцца
Прыдбаць больш радасны пейзаж:
А вось дзе возера накруціцца,
Ці ўбачым лес такі, як наш.
Шлі, шлі (задумка недарэмная),
І раптам ўскалыхнула нас:
Стаіць гара золата-медная
І ўся блішчыць, нібы алмаз.
Ды на яе не ўскарабкацца:
Крутая страшна, бы сцяна.
І як магло такое здарыцца –
Як жа ўзнікла тут яна?
А на вяршыню сеў задзірысты
Арол, вялізны, нібы конь.
І крылы велічныя выпрастаў,
І затаіў у вачах агонь.
І як такім ён толькі вымахаў?!
Ды бачым – валіцца ўніз.
І мы прачнуліся ад выбуху –
Каля акна ўпаў карніз.

*2016*

# “Прарокі” ў забягалаўках

Што суджана Зямлі?
Што суджана Жыццю?
Что чалавецтву суджана?
Хто скажа? Я хачу пачуць.
Ніхто не скажа – ні прарок, ні пудзіла.
Дзе край сусвету? Краю не знайсці.
І ўсё ж ва ўсім гармонія вялікая.
І нам з табой так радасна ісці,
І зоркам вельмі хораша цвісці,
І чалавецтва, як сям'я шматлікая.
Але жыццё няроўнае, як лес.
Хапае ў ім усякай какафоніі.
Бывае дзе прагрэс, а дзе рэгрэс,
І выпіраюць скулы дысгармоніі.
Направа глянь, налева паглядзі:
“Прарокі” квасяць думкі ў забягалаўках.
Ты позірк свой ад іх лепш адвядзі,
Ідзем туды, дзе месяц свеціць яблыкам.
Дні прабягаюць шпарка і вякі.
А мы кідаемся снарадамі і бомбамі.
Мысленне наша – спрэс чарнавікі,
І душы падаюцца катакомбамі.
Не пра цябе кажу я так, не пра сябе,
А пра палітыкаў, баевікоў – увогуле.
Магчыма, да людзей, паніклых ў журбе,
Размовы нашай дойдзе водгулле.
Чаго чакаць? Хто нас уразуміць?
Няўжо і будзем так то біцца, то валтузіцца?
А дзесьці, мабыць, лепшы свет звініць
І ні адной карчмы на светлых вуліцах.

*2016*

# *Лідскія паэты ў космасе*

На невядомую планету,
У невядомы час
Закінуў лёс зямных паэтаў –
Ну, прама на Парнас.
А там натхнення, як паветра!
Само ў рот цячэ.
І не было, на шчасце, ветру,
Што мог бы здьмуць іх прэч.
І так на творчасць пацягнула
І ўздыбіла душу!
Бурак Алеся аж ўздыхнула:
– Паэму напішу! –
– Але на чым? – заўважыў Суднік. –
Паперы ж тут няма … –
Гушчынскі рэзка слова ўсунуў:
– Мне кум дасць ці кума! –
– А дзе твой кум? – падскочыў Мельнік. –
– Яны ж вунь на Зямлі.
Ды што ты тут пра іх нам мелеш?! –
– Мялі, мялі, мялі! –
Усё ж нехта падтрымаў паэта, –
Табе заплацім мы за гэта. –
І стала весялей.
А на двары стаяла лета,
Пах “Сонечны” алей.
– Мы пра Сямёнаву забылі …
Мо ў вас папера ёсць? –
– Перавяла я ўсю на былі,
Паслала ў “Маладосць”. –
Тут Рэлікоўская сказала:
– Не кінем таленты ў бядзе.
Я помню, некалі пісала
Санеты кіем па вадзе. –

Пакуль спрачаліся, шумелі
І смажылі траску,
Два Мацулевічы прыселі
І пішуць на пяску:
“Мы паляцелі ў космас рана,
Як на траве расла раса,
Каб адарвацца ад урана,
Які Зямлю апаясаў”…
Тут ветрык ласкава падыхаў
І скінуў стому з рук.
Бараздзіна сказала ціха:
– Я чаю завару. –
Замітусіўся шпарка Дронаў:
– Навошта гэты чай?
Я захапіў гарэлкі мора.
Ты, Іра, выбачай.
Пакуль Хітрун нарэзваў сала,
Лупіў Стадуб яйко,
Верш на хусцінцы напісала
Паэтка І.Сліўко.
– А дзе ж Васько? – схапіўся Міша
І выцер з рук алей.
– А ён пра космас нешта піша
Алоўкам на скале. –
Там мы жылі, пілі і елі,
Вадзілі карагод.
Там па-сяброўску і сустрэлі
Касмічны Новы год.

*2016*

# На Венеры

(Да 125-годдзя з дня нараджэння
Максіма Багдановіча)

“Зорка Венера ўзышла над Зямлёю” –
І мы адчалілі туды
Марознай, снежнаю зімою
З гурбой дзяўчынак маладых.
Было ўсяго ім па семнаццаць,
А нам амаль па дваццаць пяць.
Мы ўмелі здатна цалавацца
І ў гульні розныя гуляць.
Во дзе рамантыка, прызнацца!
Ляці, спявай, шумі, крычы,
Каб болей смеласці набрацца
І не расходаваць харчы.
У караблі касьмічным цёпла,
Так, як ў траўні, на Зямлі.
Збоч бліснуў месяца пярсцёнак,
Каля каметы праплылі.
Ляцелі год, а можа болей.
А што ж вы думалі – прасцяг.
Не адчувалі ў сэрцах болі,
Было прыемна, бы ў гасцях.
Нарэшце, селі на Венеру
Між нейкіх тоўстых-тоўстых дрэў.
О, цуд! Сваім вачам не веру:
Сам Багдановіч нас сустрэў.
І не адзін, а з Зоськай Верас.
Прыйшлі з букетам нацянькі.
(Яна любіла вельмі верас,
А ён у жыце васількі).
– Ну, прывітанне вам! З прылётам! –
Павіншаваў зямлян Максім. –
Ну, як там Ліда! Як там Гродна?

Што пішуць хлопцы на Зямлі?
– От пішуць нешта, сказы вяжуць
І нават кнігі выдаюць.
Рыфмуюць проста: “мажу”, “смажу”.
Вярлібры часта ў друк даюць.
Паэтаў многа развялося,
У Гродне толькі трыста пяць.
– Ці чула ты такое, Зося?! –
Максім не змог сябе стрымаць. –
І гэта, лічыце, выдатна?
А я кажу, што не зусім.
Хай дзесяць лепш пісалі б здатна,
Глыбока, вольна – аб усім.
І мову родную забылі …
Эх, да чаго вы ўжо дайшлі!
Хіба мы гэтаму вучылі
З Купалам вас там – на Зямлі?!
– Максім, – сказала ціха Верас, –
Не налятай на землякоў.
Яны пястуюць у сэрцах вернасць
Сваёй Айчыне. Дух бацькоў
Жыве ў іх моцна і трывала,
Як голле дуба на ствале.
І ты, і Колас, і Купала
Для іх пакуль за ўсіх мілей.
Давай пакажам лепш зямлянам
Сядзібу нашу, агарод.
Ідзіце, родныя, за намі,
Хай вам запомніцца прылёт.
Венера стала ўжо абжытай.
Працуем, дбаем як-ніяк.
Тут, бачыце, якое жыта,
Як ваш хваёвы маладняк.
Збоч конікі на струны траўкі
Свае націснулі смычкі.

А каля выструганай лаўкі
Ляжаць, як бочкі, кабачкі.
Глядзім, цікуем. О, Усявышні!
Ад радасці хоць закрычы:
Над галавой звісаюць вішні,
Нібы футбольныя мячы.
Вось яблык грымнуўся пад ногі,
Велічынёю мо з гарбуз!
А на ўзмежку белы, строгі,
Стаіць, як бык, вялізны трус.
Максім прагнаў яго лазінай:
– Бяжы, скачы ў свае палі!
А мы з паэткай Кучмі Зінай
Яму ў тым дапамаглі.
Вось хатка, што была бліз Вільні …
І не ў такі далёкі час
У яе Пяткевіч і Панізьнік
З Бічэль заглядвалі не раз.
Максім нам дзверы адчыняе
І прапускае за парог:
– Тут мы жывём, адпачываем
Пасля крутых зямных дарог.
У хатцы так прыгожа, чыста!
На сценах многа абразоў.
Вазоны свецяцца квяціста,
Шмат слуцкіх здатных паясоў.
Гляджу ў покуць, прыкмячаю
Букет са спелых каласкоў.
– Ты, Зося, завары нам чаю
З блакітных нашых васількоў.
А вы, радзімыя, сядайце.
Як гаспадар прашу ўсіх я.
Сябе, як дома, адчувайце,
Усё ж мы – адзіная сям'я.
А сам пайшоў на кухню жвава,

Каб Зосі там дапамагчы.
Запахла яблыкамі, кавай.
Цікава, што ў іх за харчы?
І неўзабаве стол кляновы
Прыняў талеркі на сябе.
На іх, чырвоных і ліловых,
Ляжалі стравы на абед.
З мяснога не было нічога.
Спрэс садавіна і пірог,
І міска мёду. Дзікіх пчолаў
Тут прыручылі – Бог памог.
Прагаладаўшыся ў дарозе,
Уплятаді мы ўсё падрад.
І нашай стоме і знямозе
Прыйшлося адступіць назад.
І столькі сілы ў нас ўлілося,
Бы завадных хто накруціў.
Усім раптоўна падалося
Дамоў на крылах паляцім.
І вось паклікала Айчына:
– Спяшыце, дзеткі, да Зямлі!
Гаспадары спакойна, чынна
Нас да ракеты правялі.
Прыйшоў паціху час растання
З Максімам, з Зоськаю – з усім.
І цёплым, шчырым пажаданнем
Усхваляваў  зямлян Максім.
– У добры шлях! І да спаткання! –
Паціснуў кожнам руку. –
І перадайце прывітанне
Дануце, Голубу, Жуку!
Ракета ўзмыла – і дахаты
Мы зноў ляцелі цэлы год.
З нас кожны стаў душой крылатым,
Навек запомніўся палёт.
*2016*

## Пажаданне

Будні і сьвяты. Трывогі. Спакой.
Жыццё, як ланцуг, толькі з рознымі звеннямі.
Прыемна, калі ў чашчобе  лясной
Маленькая птушка світанак вызвеньвае.
Прыемна, калі за крутою гарой
Праз дрэвы прасвеціцца мора хвалістае.
Прыемна, калі я злячуся з табой,
Такою жывою, такой прамяністаю.
І дай Бог, каб сум абыходзіў мяне,
Навалы ўсе абміналі захмарныя,
Праклёны таго, хто так моцна кляне,
Заўжды станавіліся спробаю марнаю.
Ды лепш, каб на тое прычын не было,
Не ведаў ніхто ні маркоты, ні немачы,
На тварах людскіх толькі б шчасце цвіло,
Свяціліся ўсмешкі чаромхай квітнеючай.

*2016*

***

Няпэўнасць нейкая наўкол.
Што ўсхваляць? Чым даражыць?
Душа бы села на прыкол,
Не прагназуе, як нам жыць.
У вершах варта б заклікаць.
Але каго? Слабых? Крутых?
Час нас на біўнях і клыках
Нясе няведама куды.

*2016*

***

Ці плакаць, ці ў роспачы еньчыць?
Наперад ісці ці назад?
Цяжарам кладуцца на плечы
Ствалы паслухмяных гармат.
Праз прызму духоўнай галечы
Гляджу я ў заўтрашні дзень.
Дакуль будзем нервы калечыць
Скапленнем нядобрых падзей?

*2016*

***

Святое імкненне да праўды
Каралі паўсюль і заўжды:
Саджалі паэтаў за краты,
Кармілі пахлёбкай з  нуды.
Марылі свядома ў цямніцах,
Каб розум знявечыць навек,
Прымусіць складаць небыліцы
Сабе і нашчадкам наздек.
Наносілі геніям траўмы,
Палач іх штодня катаваў.
Ды голас раз'юшаны праўды,
Як грозны вулкан, бунтаваў.
Яшчэ пяцікласнікам, мусіць,
Раптоўна ў сабе я адчуў:
Мяне ўсё ж ніхто не прымусіць
Пісаць так, як сам не хачу.

*2016*

## Высаджваю дэсант

Каб зноў за локаць не кусаць,
Не стаць падзей адвёрткай,
Лячу да мэты, як аса,
Скачу вавёркай вёрткай.
Было ўпушчэнняў вельмі шмат,
Бадай адны прабелы…
Цяпер высаджваю дэсант
Ў заўтра з думак смелых.
Памылкам прыйдзе ўжо капут!
І ўсё ж не гарантую,
Што зноў не ўліпну там ці тут,
Прыму сасну за тую.

*2016*

## Цуд стварэння

Чым горшы ты за гэтага і тога?
Але чаму не верыш, братка, ў Бога?
Няўжо ты сапраўды пайшоў ад малпы?
І рукі ў цябе былі, як лапы?
Тады хто продкі ў твайго сабакі?
Магчыма, тыгры альбо нават ракі?
Адкуль, скажы, пайшла твая карова?
Яе "му-му" ці стане заўтра мовай?
І дзе, у якіх вяках аселі продкі
Вось гэтага ката ля скавародкі?
Магчыма, гэта мышы ці суркі?
Ці закаўмлычныя хляўныя пацукі?
Ой, як твой Дарвін моцна памыляўся.
Інакш той цуд стварэння адбываўся.

*2016*

***

Ой, як шумеў наш парк калісьці!
Эх, каб вярнуць той час назад!
Як гаманіла здатна лісце,
Святлелі тварыкі ў дзяўчат!
На танцпляцоўцы стук абцасаў
Чуваць было за многа вёрст.
Мы нібы выбіліся з часу,
Ідзем ў нейкі змрок наўпрост.
А як круцілі каруселі
Вясёлых хлопцаў і дзяцей!
Што, за кампутары заселі?
Не бачым сонца і людзей?
Пустуюць лаўкі і дарожкі,
Заціх, змяніўся сёння парк.
І толькі ў ім дзяўчынкі-крошкі
Малых выгульваюць сабак.

*2016*

***

Са словаблудства выпутацца як?
Яно ж нас акружыла канчаткова.
Духоўны згінуў у начы маяк,
Не памагла і месяца падкова.
У мешаніне сказаў халастых
Не вылушчыць і дробнае зярнятка.
А трэба ж думаць за сябе і тых,
Што з-пад пялёнкаў зыркаюць украдкай.
Праз словаблудства, як праз лес, іду.
Не зачаплюся, не ўпаду, канешне.
Але нічога ў ім не знайду,
Хіба лапшу сабе на вушы вешаць.
Ці так далёка зойдзем мы з лапшой?
Не ведаю ў каго і запытацца.
Ды адчуваю сэрцам і душой:
Са словаблудства не ўзвядзеш палаца.

*2016*

***

Чаму нас цягне да благога,
А не да лепшага? Скажы.
Чаму мы ўсе далей ад  Бога,
Нібы аблезлыя смаўжы?
Чаго нас пражыць да "чарніла",
Гарэлкі, піва, кан'яка?
І так глядзімся ўжо паныла,
Ужо замарылі чарвяка.
Няўжо самых сябе заморым?
Рака назад не пацячэ…
Цяпер бушуе мора гора,
А заўтра будзе горш яшчэ.
Чым галава ў нас забіта?
Хто абязлюдзіў родны парк?
Чаму нас цягнуць, як магнітам,
Ларкі атрутныя "Табак"?

*2016*

## Сусед

Сусед мой не прарок, не ідыёт,
Ды нешта ўсё ж прадсказвае, бывае.
Раней сцвярджаў, што Бліжні Ўсход
Вайною зацяжною запалае.
І ўсё збылося гэта. Паглядзі,
Што робіцца ў Сірыі, Іраку,
Як гінуць людзі – сэрца халадзіць.
Такое не прыснілася й Бараку.
А раз дзяўчыне шпурлянуў праз плот:
"Ты выйдзеш замуж за дацэнта, Ася".
І, праўда, выйшла. Ды амаль праз год
З дацэнтам Ася – раз! – і развялася.
Аднойчы я кажу яму: "Сусед,
Закінь ў заўтра Беларусі вуду".
А ён гавара: "Ты ж, браток, паэт.
Вось і закідвай, ну а я не буду".

*2016*

## *У пошуках праўды*

У моры кніг бязглуздзіцы хапае,
Ды ёсць і кнігі, што аж дух займае.
Я Быкава шукаю на паліцах –
Вось на каго не сорамна маліцца,
Бо ў кожным сказе розуму багата,
Лунае думка птушкаю крылатай.
Ад кніг яго не проста адарвацца,
Як ганчаку ад вепрука ці зайца.
Карціць мяне з героямі быць разам:
Душа стаіць за кожным мудрым сказам.
Чытаю іншы раз аж да паўночы,
Пакуль не праслязяцца з жалю вочы.
Вось дзе сапраўдны беларускі творца,
Няпраўды і бязглуздзіцы забойца.
Я з ім іду праз лес і сенажаці,
Цераз балоты, раўчукі і гаці.
Бываю часта раненым, галодным,
Ды ўсё нясу, нясу свой груз паходны.
Хаваюся ў акопах ад снарадаў,
Бягу між хутароў, вясковых хатаў.
Была вайна, прыгладжваць факты нельга:
Ад гэтага не па сабе нам неяк.
Я Быкава шукаю на паліцах,
Каб праўдай неўміручай наталіцца.

*2017*

## *Бомж*

Бездапаможны, згаладнелы бомж
Са смецця ў скрынях выбіраў аб'едкі.
Ватоўка і падвязаны галош
Здалёк смуродам патыхалі едкім.
Ніхто і не задумваўся, чаму

Яго такая доля напаткала,
Ці чысты ён душой, ці праз турму
Дарога чалавека пралягала.
Ніхто ў ягоны бок і не глядзеў,
Не супыняў да хлеба цягу-прагу,
Ды і дяржава ў клопатах штодзень
Згубіла на гаротніка ўвагу.

А бомж і не чакаў, што ў мітусні
Яму памогуць – вераб'ю ў мякіне.
Такога ён ніколі і не сніў,
Бо ўсе казалі: "Капыты адкіне"…

*2017*

## *Творчасць*

Калі не спіцца, падступаюць думкі
І лезуць саматужна ў галаву.
Прымаю, як ад Бога падарункі,
Радкі, што з неба хораша плывуць
У белым і чырвоным апярэнні.
Я іх лаўлю антэнай валасоў,
Адкідваю ўбок усе сумненні,
Сябе не зачыняю на засоў.
Узлятаю з ложка, чысты ліст хапаю
І аўтаручкай верш вяжу, вяжу.
У гэты час пра ўсё я забываю
І толькі чуйна слухаю душу.

*2017*

***

Далячынь зялёная – шыр маёй душы,
Сонцам паланёная, праўду мне скажы:
Будзеш вечна славіцца ці чужынцаў рой
На цябе наваліцца чорнаю чумой?

Хто памкнецца выкачаць чысты твой сувой –
З лесу хлопцы выскачаць дружнаю гурбой.
З цёмнаю агідаю я пайду ў штыкі,
Як ваўкоў раскідаю ў розныя бакі.

*2017*

## Графаманам

Нічога з патугаў не выйдзе
Без божай іскрынкі ў душы.
Не будзьце дарэмна ў крыўдзе,
Што твор ваш нязрушна ляжыць.
Не трацьце на верш і гадзінкі.
Карчуйце ў лесе карчы.
Сапраўдных паэтаў – адзінкі,
Астатнія ўсе – рыфмачы.

*2017*

***

Не вяжуцца словы ў радкі,
Застой у жыцці і натхненні.
Праз кнігі ў наш свет трапяткі
Былыя ідуць пакаленні.

І ў іх усё не проста было.
Усякае іх данімала:
То снегам у твары мяло,
То сонца ў пот заганяла.

Душылі бязхлебіцай люд,
На верш башмаком наступалі,
Ды быў і іскрысты салют,
І лёс станавіўся на палі.

Галоўнае духам не ўпасць,
Прайсці праз усе ліхалецці.
Калі мо й адхлыне напасць,
Калі мо й палепшыцца ў свеце.

*2017*

***

Скорасць верша, як скорасць ракеты.
У неба свядомасці ўрэжацца ён –
І ўсе графаманскага складу паэты
Падумаюць: гэта касмічны шпіён.
Рыхлыя, вялыя рытмы і рыфмы
Пойдуць, як статуі, уніз галавой.
А гэты праб'ецца праз буры і рыфы
Народы Зямлі павядзе за сабой.

*2017*

## *На моры*

Быў цёплы вечар. Мора слала хвалі
На гладкі, адшліфаваны пясок.
А мы з табой, абняўшыся стаялі,
Ласкаў мой слых твой тонкі галасок.
Блішчэлі зоркі. Месяц плыў павольна.
Гармонік дзесьці весяліў народ,
І на душы было так хораша і вольна,
А ветрык малады да нас ішоў уброд.
Агні гарэлі ля гары пакатай –
Яшчэ не спаў туманны Геленджык,
Не спалі людзі ў маленькіх хатах,
Пра мора напяваў праходзячы мужык.
А хвалі песні на пясочку слалі,
Спыніўся ў небе залацістым час,
І мы з табой да ночы прастаялі,
А ранкам сонца абвянчала нас.

*2017*

***

Святочна прыбраўся чэрвеньскі дзень
У белыя воблачкі, квецень акацый,
У бэзавы колер, у ліпавы цень –
Ён так захацеў сёння ўсім спадабацца.
І людзі ў святочным убранні ідуць
Па вуліцах чыстых,па гладзенькай плошчы,
Усмешкі чаромхі прывабна цвітуць,
І вецер дзяўчатам сукенкі палошча.
Каб гэтак было і паўсюль і заўжды,
А дрэннае ўсё адплыло ў былое,
Каб шар наш зямны выгнаў рэшткі нуды,
Квітнела, буяла жыццё маладое.

*2017*

## Пад ліпай

Заначую пад старою ліпай.
Канюшыны насцялю пад бок.
На двары такі рахманы ліпень!
А ў небе месяц – абібок.
Буду нюхаць пах мядовы кветак,
Буду зоркі ў прыгаршчы збіраць,
Буду слухаць, як каля шкарпетак
Конікі заядліва цвірчаць.
Спаць кладуся ноччу – без дзяўчыны,
Хоць з дзяўчынай і было б латвей:
Да відна мы з ёю не спачылі б,
Цешыў бы нам сэрцы салавей.
Начаваць пад ліпаю – раскоша:
Рукі хоць раскінь на ўвесь сусвет.
А наўкол так ціха і прыгожа,
І ў душы варушыцца паэт.

***

Можа, добра, можа, кепска,
Што за табой растаўся я
Ля зялёнага падлеска,
Дзе ва ўсю ішла гульня.
Свята песні, свята танца
Не хацеў я пакідаць.
Ты ж хацела ў лес падацца,
Ягад спелых назбіраць.
Ты практычная – і гэта
Стала мне не па душы,
Бо ў мяне душа паэта,
І яе не засушыць.
Над ракой мільгалі плацці,
Шум ляцеў ва ўсе канцы.
Я хацеў пабыць на свяце
У наднёманскім Сяльцы.

*2017*

## *Дзе паратунак*

Аварыі, пажары, нарката,
Бураны, узрывы, шумныя паводкі –
Як розуму змутнелая вада.
А Ной, напэўна, не падасць нам лодкі?
Скруціць гатовы аслабелы люд
Баярышнік, падробная гарэлка,
Курыны грып і спіданосны блуд
І ў поўдзень летам сонечная грэлка.
А трэба неяк ратавацца нам.
Ды дзе і ў чым жаданы паратунак?
Ці зноў маліцца колішнім багам,
Што недзе ў небе набылі прытулак?

*2017*

## Час

Гняце нас час і разбурае,
Пераўтварае ў старых,
Хваробы часта падкідае
Альбо куляе дагары.
Жыві ты з ім безкампрамісна,
Не паддавайся на ману.
І хоць на сэрцы непамысна,
Ты аб'яві яму вайну.
На лыжах едзь у лес, у поле,
Ці асядлай веласіпед.
Паменш трымайся на прыколе
Ля тэлевізара ў абед.
Спяшы, вясёлы, на прагулкі,
Падкідвай мяч, спявай, скачы –
І ён з табой не пойдзе ў грудкі,
І ад здароўя дасць ключы.

*2017*

## Завіруха

Завіхурыліся ў танцы
Белыя сняжынкі.
Гэй вы, хлопцы-навабранцы,
Юныя дзяўчынкі!
Разам з імі паскачыце
Лёгка, а не грузна,
Навакольны свет здзівіце
Полькай беларускай.
Я рвануся з вамі ў скокі,
Спрыту мне хапае.
Гляньце месяц белавокі
Нам ўжо маргае.

Грэйся, грэйся, завіруха,
Весяліся з намі!
Гэй ты, полька-патрасуха!
Снег ляціць клубкамі.

*2017*

***

Я адчуваю подых твой
І подых часу адчуваю.
Тваёй усмешкаю жывой
Я час за мора праганяю.
Няхай бяжыць туды хутчэй,
Дзе кракадзілы жмурацць вочы,
Дзе Ніл загадкавы цячэ,
І піраміды рай прарочаць.
Убачыць там гарачы грунт
І гарызонт у пясочным дыме.
А мы застанемся вось тут
І будзем вечна маладымі.

*2017*

## *На провадах зімы*

Яшчэ гракі не прыляцелі,
Пустуюць гнёзды, дрэмле парк,
Стаяць маўклівыя арэлі,
Не скінуў ясень андарак.
Шпакоўня ціха, адзінока
Чакае колішніх жыльцоў,
Хвастом сарока-белабока
Цярушыць снег на прадаўцоў.
Ля іх натоўп святочны трэцца.
– Ах сёння провады зімы!
Давайце вып'ем, каб сагрэцца!
– Не, лепш не пробаваць “чумы”.

– Але ж не бачна кавы, чаю.
Дык чым жа роспач заглушыць?
Давайце вып'ем хоць з адчаю.
– Не, лепш не варта нам грашыць.
– Так што, хадзіць з паніклым носам,
На свет прыжмурана глядзець
Такім бязжаласным марозам
У гэткі яркі, срэбны дзень?
Глядзі зімы якое царства!
Гарыць бальзам з пякучых траў.
– Ну, вы як хочаце, спадарства,
А я дамоў пашкандыбаў.
– Ну і валі!

*2017*

***

Ніхто мяне не ўтрымае
Ад тых мясцін, дзе ходзіш ты.
У снегапад і квецень мая –
Заўжды хачу ляцець туды.
Святое неба над табою.
Святое мроіва – як міф.
Я рукі складваю з мальбою:
Прымі мяне, прымі, прымі.
Як песня – ветра парыванне,
Як ветразь – кофтачка твая.
Там шэпчуць травы пра каханне,
І лес шуміць, што ты – мая.

*2017*

## За борам, за гаем

Наіўныя хлопцы, Нёман наіўны.
Наіўна цвітуць маладыя маліны.
Наіўная сцежка, наіўныя чайкі.
Наіўныя лозы, наіўныя чаплі.

Наіўнае сонца, наіўныя хмаркі.
Наіўная вёска, наіўныя брамкі.
Наіўная цётка наіўна пытае:
– А што вам, сыночкі, ў грудзях далягае?
– Мы чулі, што дзесьці за борам, за гаем
Жыве наша мова, святая, жывая.
Туды вось і крочым ад самага ранку,
Ўчынілі сабе марш-кідок, пагулянку.
– А хіба ў горадзе з мовай няўвязка?
Няўжо ваяваць за яе гэтак цяжка?
– Не проста, бабуля, часы не такія,
Сказаць вам па-шчыраму, нават ліхія.
– А што там за борам, за лугам, за гаем,
Дзе родная мова такая жывая?
– Там хутар пры лесе стаіць адзінокі,
Стракочуць зімою і летам сарокі.
Там хатка старая, мохам накрыта,
І студня са зруба, пры студні карыта.
Жывуць там дзядуля з бабуляй удовай,
Яны карыстаюцца роднаю мовай.
– Чаму ж вы  такія наіўныя, хлопцы,
У белых кашулях зухі-малойцы?
Адважнымі будзьце, як бусел на клёне,
Адчуйце сябе змагарамі хоць сёння.
Пастаўце пры хаце з кіямі ахову,
Каб там хоць не ўкралі родную мову.

*2017*

## Аднакласніца

Сінія банцікі, вочкі блакітныя,
Вусны малінавым сокам налітыя,
Постаць прывабная, усмешка вясёлая,
Спрытная, узлётная птушка, не кволая.
Помніш, як мы на пароме гайдаліся,

Шышкі збіраць за раку адпраўляліся?
Хвалям празрыстым і сонцу ты верыла.
Я раўнаваў цябе нават да ветрыка.
Ён цалаваў твае вусны наспелыя,
Гонячы ў пушчу воблачкі белыя.
Здатна трымцела ўсё ласкаю божаю.
Ах жа якою была ты прыгожаю!
Як ты ўвайшла у жыццё, аднакласніца?
Хто ў гэты час ля цябе увіваецца?

*2017*

## "Арыгінальныя" паэты

Адны рыфмаванкі – ніякай паэзіі,
Як быццам прымаеш уколы магнэзіі.
У сабачай пагоні за новымі рыфмамі
Ў іх галасы ўжо сталі ахрыплымі.
У творах няма нават дохлай эмоцыі,
Ні думкі крутой, ні мастацкай прапорцыі.

*2017*

## Як быць?

Прыгледзімся, што дзееца наўкола,
Як цёмных сіл бурліць кругаварот:
То косіць люд заразная эбола,
То нейкі вірус прама лезе ў рот.
Апакаліпсіс асядлаў камету
І пракладае да Зямлі свой шлях,
Каб знішчыць нашу бедную планету,
Каб больш яна не цяўкала ў вяках.
Яшчэ крычаць з блакітнага экрана,
Што трэцяя вайна ўжо на мяжы,
Што не стрымаць смяртэльнага бурана, –
І як нам быць, спадарства, як нам жыць?

*2017*

# *Дух рамантыкі*

О, шматгалосы, хуткацечны час,
Я па хрыбтах тваіх крутых бягу,
Падлажу пад нябесную дугу,
Люблю ёй любавацца кожны раз.
Я над хрыбтамі дзікіх гор лячу,
Мой самалёт кіруе на ўсход.
Арлам адважным праз акно крычу:
– Дабрыдзень, птушкі! Я люблю ваш род!
Як тыгр, шыбую між густых кустоў,
Начую ў шатах на старой сасне,
Хоць не юнак я, маю ўжо пад сто,
Ды дух рамантыкі бурліць у мне.

*2017*

***

Мне б ластаўкай лётаць ў жыцці,
Круціць віражы над планетай.
Кругі і зігзагі чарціць,
Пры гэтым застацца паэтам.
Няўрымсліва вершы пісаць,
З людзьмі кожны дзень сустракацца,
На танцах у клубе скакаць,
З сябрамі спяваць і спрачацца,
У лесе маліну збіраць,
Паземкі, грыбы і чарніку,
Сініцам яду раздаваць,
Вавёркі арэхам прыклікваць.
Як з мною гамоняць дубы!
Бо бачаць, які я ўмелы:
Магу і сарокаю быць,
І буслам, і сокалам смелым.

*2017*

## *Душа*

Гарыць душа агнём зялёным
І ацяпляе ўсё наўкол,
І асвятляе шлях ўлюбёным,
Дрэнь адпраўляе на памол.
Яе нажыва не турбуе,
Хвалюе ўзлёт і крылаў ўзмах.
Яна, як траваядны буйвал,
Пасецца часам на лугах.
Яе стыхія – лес ды поле,
Ды сонца велічны ўзыход,
Ды аблачынак белых голле,
Ды кветак яркіх карагод.

*2017*

***

Не завіхурыцца пагода,
Дык прыпаўзе, як смоўж, туман.
Мо нас чакае лёс Садома,
Агульны велічны курган?

Няўжо знішчаць людзей – патрэба,
Ці кроў чужая – што вада?
І зварухнецца зноў над Эльбай
Бомбагаловы чорны ўдаў.

Не толькі вуліцы ачысціць,
Патрэбна душы падмясці.
А раптам знойдзецца нячысцік,
Да кнопкі зможа дапаўзці?

*2017*

## *Жыві свабодна*

Тапчу зямлю, бы слон ці мамант.
Ды што стварыў на ёй, святой?
Сказаць па праўдзе вельмі мала,
Каб атрымаўся тоўсты том.

Сябе на дробязі разменьваў,
А пра галоўнае не дбаў.
Не сеяў словы поўнай жменяй,
А па крысе, як жартаваў.

Цяпер каго вініць за гэта?
Ды самаго сябе, сябе.
Раз нарадзіўся ты паэтам –
Не будзь як коцік на вярбе.

А распусціся кронай дуба
І на ўвесь свет шумі, спявай,
Жыві свабодна, вольна думай,
Рукой да зорак даставай.

*2017*

***

Не слухай ні свата, ні брата,
Жыві, як падказвае Бог,
Пары ў небе птушкай крылатай,
Ідзі праз завеі трывог.
Навалу хмары халастую
Ўбок пяцярнёю адкінь,
Дарожную песню лясную
У сэрцы навекі пакінь.
Напорысты, дужы, адважны,
Спяшы са злачыннасцю ў бой,
А час ўсемагутны пакажа,
Які з цябе выйдзе герой.

*2017*

## *Бяруць у палон*

Вы ўсе ўва мне, а я жыву ў вас.
Харчуюся ўражаннямі з ранку,
Каплю іх, бы капейкі пра запас.
Ад сонца не завешваю фіранку.
Калі пагодная, усцешная вясна
Вакол буяе, пеніцца, шугае,
О, як хвалюе сэрца мне яна!
Як над жыццёвым брудам узвышае!
Акаймаваны хмаркай стромкі гай,
Я да цябе лячу, як апантаны.
Ты на баяне весела зайграй
Пра белыя прылівы, акіяны.
Я, бы галодны, змардаваны бомж,
Шукаю тайны ў таямніцах свету.
Лаўлю маланкі асляпляльны нож
І кідаю ў захмарную карэту.
Уражанні бяруць мяне ў палон –
І рады я такому лёсу-цуду,
І, як малы, круты Напалеон,
Ад іх нікуды ўцякаць не буду.

*2017*

## *Рыбакі*

Яны прыйшлі на возера ўранку,
Паставілі на лёдзе сундучкі,
Падаставалі з баначкаў прыманку,
Нажыўку начапілі на кручкі.
Сагнутыя, нібы крукі са сталі,
Сядзелі моўчкі каля трох гадзін,
Ды неўзабаве ногі мерзнуць сталі –
Паслалі Панцялея ў магазін.
І той, як малады, не замарудзіў.

Прынёс, паставіў каля ног без слоў.
Яшчэ ніхто й калючак не навудзіў,
Дык выпілі за будучы ўлоў.
Спрачаліся, заўзята гаманілі
Пра кошт на аргенціну, селядца,
Увішна цыгарэтамі дымілі,
Раз-пораз паглядалі на хлапца.
Усе былі груваcткія, у сіле,
А гэты хударлявы, бы Кашчэй.
Яны ў яго лагодна й папрасілі:
– Схадзі ты ў краму, Панцялей, яшчэ.
І ён паўшоў, ані не замарудзіў.
Прынёс, паставіў каля ног без слоў.
Ніхто з іх і калючак не навудзіў,
Дык выпілі за будучы ўлоў.
І зноў паселі каля вузкіх лунак,
Чакаючы, мо клюне што ў каго,
Ды пах гарэлкай на кручках ласунак –
І рыба ўцякала ад яго.
Пад вечар завіруха ўсчалася…
– Ідзем дамоў, – прамовіў Карп. – Браткі,
Рыбалка сёння нам не ўдалася…
Ды што ты зробіш, выпаў дзень такі…

***

Урачыста колас выплывае.
Вяселля ў сэрцы не стрымаць.
Прырода велічна буяе,
Квітнее ярка сенажаць.
Сукенкі вецер задзірае
Бярозкам белым ля дарог,
Нібы пры іх шукае рая.
Мо больш нідзе знайсці не змог?

*2017*

## Вайдыла

Разумным і адважным быў Вайдыла,
Як сокал, рыхтаваў сябе на ўзлёт.
Яго Альгерда слава прыманіла
І князя моцны старажытны род.
Славянамі былі Вайдылы продкі.
Дух праваслаўны нёс ён ў жыццё.
Прыгожы, стройны, малады і вёрткі,
Ішоў на подзвіг, як на адкрыццё.
Як сябру і найлепшаму дарадцу
Альгерд Вайдыле Ліду падарыў.
Ён змог з сястрой Ягайлы павянчацца
І ажаніўся, і шчаслівы быў.
Узвёў палац раскошны ў Дуброўні
І кіраваў, і ворагаў крушыў.
Сярод баяраў і вяльмож быў роўны
І справы адмысловыя вяршыў.
Яго дыпламатычнае прызванне
Цаніў Альгерд і іншыя князі.
Баярына далі Вайдыле званне,
Але Кейстут рашыў яго казніць.
Ды слава аб вялікім нашым продку
Гучыць і сёння, як спакон вякоў,
Не толькі ў мясцовым асяродку –
Ляціць яна з усіх зямных куткоў.

*2017*

***

Загарэлася дзеўка замуж ісці,
А бацька і маці кажуць, што рана:
– Да новага года яшчэ папасці,
Разважнаю будзь і не думай спантанна.
А хлопец прыспешвае, ды і яна
Баіцца, каб у дзеўках навек не засела.

Ужо падлічыла, колькі віна
І колькі гарэлкі купіць на вяселле.
І ходзіць яна як сама не свая,
І зоркі ў небе нічога не чыняць.
Эх, каб прыехаў разважны сваяк
І дапамог гэтай беднай дзяўчыне.
Махні ты на ўсё, прыгажуня, рукой
І ў ЗАГС паспяшы са сваім кавалерам,
Пакуль так бушуе пачуццяў прыбой,
І ў сэрцы жывуць і каханне, і вера.

*2017*

## Хто ён?

А час на месцы не стаіць,
Ім паганяе хтось нябачны,
Ён раўнадушны, не абачны
Імчыць кудысьці і імчыць.
І за яго мацней няма
Ніякай сілы ў сусвеце,
То лечыць ён,
То зноў калечыць.
Ён геній ці дзярмо з дзярма?

*2017*

## Паэзія-гарэза

Я сорак год кую жалеза
Гарачых рытмаў на стале.
Мая паэзія – гарэза,
І сам гарэзны я, бы леў.
А што ж вы думалі, у святы
Здаю Усявышняму залік.
Духоўна стаў упаўне багатым,
У космас думкамі пранік.

*2017*

## Пакінеш след

Нікому зла не жадай,
Адкінь яго аж за горы.
Зэку рубель падай,
Дапамажы яму ў горы –
І стане утульным свет.
Толькі не пі гарэліцы –
І добры пакінеш след
На гэтай зямельцы.
*2017*

## Па-новаму

Шукаю, чаго не маю.
Бягу далей ад нуды.
Напасці да сэрца прымаю –
Падзецца няма куды.
Загоіць паветра раны.
Разгоніць вецер тугу.
Расквеціцца сонцам ранак –
Па-новаму жыць змагу.
*2017*

***

Як прагная п'яўка, упіваюся ў свет,
Каб выбраць найболей уражанняў:
Усё-ткі які я не ёсць, а паэт,
Ды й талент не мераюць сажнямі.
Хвалюе не новы лядовы палац,
А сук на галіне аблупленай.
І хочацца неба з зямлёю спаяць,
Каб не была гуманоідам купленай.
І нават на тонкіх нагах камар'ё,
Што кашу таўчэ, – зачароўвае,
І з тэлеэкрана ў джунглях звяр'ё
Маё ўяўленне разгойдвае.
*2017*

## Геніі

Іх з Неба Зямля да сябе запрасіла.
Іх чыстая сіла па свеце насіла.
Ну, а нячыстая – знішчыць хацела,
Ёй геніям пакасць падкінуць карцела:
Бы груганнё, навісалі жандармы,
У асабістым жыцці іх распальвалі драмы.
Ды крылы звязаць ім было немагчыма,
Бо за плячыма стаяла Айчына.
Пакутуюць геніі: душаць іх каты.
А-у-у! Дзе вы сёння, духа атланты?!

*2018*

## Пабудзь, пажыві!

Здурнела пагода: то дождж, то туман.
Ды і ў грамадстве парадку няма:
Тэракт за тэрактам, глабальны падман.
Мы марым аб лепшым, ды пэўна дарма.
Даносяцца хвалі пакутаў людскіх
З далёкіх куточкаў планеты Зямля.
Мы сёння ў адказе суровым за іх,
А пазіраем маўкліва здаля.
Чакаем, пакуль і да нас дапаўзуць
Гадзюкі, што прагнуць нявіннай крыві.
У свеце паўсюль усплыла каламуць,
Хоць душы, як рыбу, таптухай лаві.
Ау, чалавецтва, ты чуеш мяне?!
Хутчэй пра свае хіракіры забудзь!
Не знішчы сябе ў апошняй вайне!
Пабудзь, пажыві, пажыві і пабудзь!

*2018*

# *Фантазія*

Жыві, фантазія мая!
Насі на крылах па сусвеце!
Мяне Сатурн заўжды прывеціць,
Пабуду на Плутоне я.
Паўночны полюс аблячу
І загляну ў Антарктыду,
У тэрарыста вырву міну,
Рыўком разбойніка скручу.
На тоўстым, велічным слане
Палову Афрыкі аб'еду
І зноў вярнуся да абеду
Ў Ліду, дзе прывольна мне.
Шумлівы, грозны акіян –
І ён зусім не перашкода,
Бо я дужэю год ад года
І не бярэ мяне уран.
Жыві, фантазія мая!
Насі на крылах па сусвеце!
Ой, як хачу я ўсё прыкмеціць!
Патрэбна сіла мне твая.

*2018*

***

Сцярвятнікам сяду на спіну
Бязглуздзіцы і галімацці.
Фальш у кусты закіну,
Каб час не сумеў знайсці.
А раптам атамны лапаць
Прыпаднясе нам крах –
Стагоддзямі буду плакаць
Па незабыўных сябрах.

*2018*

## *Аптымізм*

Аптымізм крыніцай б'е ўнутры.
Пішацца, працуецца выдатна.
Песімізм скуліўся дагары.
На душы памаладзелай здатна.
Хочацца тварыць, здзяйсняць, спяваць,
На кані скакаць цераз бар'еры,
Прыгажунь сустрэчных цалаваць,
Узлятаць арлом на Кардыльеры.

*2018*

## *Камар*

Як параўнаць нам камара
З бязмежным, велічным сусветам?
У лесе раніца і лета –
І ўжо кусаць людзей пара.
Во, зноў ля вуха празвінеў
І хоча рэзка ў шыю ўпіцца,
Ды я магу і разазліцца
І паказць яму свой гнеў.
Хоць ад укуса не памру,
Рука, як прэс, яго расцісне.
Удар – і амба камару,
І толькі кроў пад неба пырсне.
А я таксама, бы камар,
І мне сусвет не патакае,
Пашле аднекуль свой удар –
І лёс не лепшы напаткае.

*2018*

## *Крот, краты*

Во дзе знайшоў сабе жытло!..
І як ён там не задыхнецца?
Я стаўлю кожны дзень сіло –
Злавіць крата не ўдаецца.

Падрыў капусту, вінаград
І ўжо падлез пад памідоры.
Ну ты, падземны супастат,
Я разбуру твае ўсе норы!
А тут яшчэ стары сусед
Сваіх нагнаў (завёўся з намі) –
І натварылі столькі бед –
Больш, чым японскае цунамі.
Ужо ідуць амаль на ты.
І хутка сядуць мне на шыю.
Ах вы, паршывыя краты,
Я заўтра шапку з вас пашыю!

*2018*

## Прага

Гартаю кнігі, бы стагоддзі.
Люблю неўтаймаваны верш.
Мо вывучаць жыццё ўжо годзе?
Мо ведаць меней крыху лепш?
Ды не – дарэмная задумка.
І горш за ўсё ў кутку марнець.
Мне кніга даражэй, чым булка,
Чым каўбаса і селядзец.
Перад сабою стаўлю мэту –
Не абібочыць, не драмаць,
А ўсе (ці ўдасца) кнігі свету
Перагарнуць і прачытаць.

*2018*

## Дух

…А дух бунтуе. Дух не спіць у шапку,
Узнімаецца, бы вогір на дыбы.
Яму не кінеш подласці ахапку.
Ён фальш раструшчыць, бы ў бары грыбы.

Ён добра бачыць, дзе святло, дзе цемра,
Расколе амбіцыйнасці скалу
І можа стукнуць капытом у цемя
Ўсякай крывадушнасці і злу.
Упарты ён, нікім не пераможны.
Гуляць не стане з вамі ў паддаўкі.
І хоць жыве не бедна – не заможна,
Імкнецца прама ў зорныя вякі.

*2018*

## Суцяшэнне

Убок так позірк не касі,
Што ў іх катэджы, ты без хаты.
У казнакрадаў і багатых
І прыкурыць не папрасі.
І не зайздросць, як я, крутым:
Жывуць жа неяк небаракі,
Бамжы, бадзячыя сабакі,
Ды і бяздомныя каты.
І ты як-небудзь пражывеш.
Не затуманьвай смуткам вочы:
Мо зайцам лёс уверх падскочыць –
І стане параўнаўча лепш.
*2018*

## На Парнас, альбо дыялог з часам

Па сцежцы няроўнай угору бягу.
Парнас беларускі і вабіць, і кліча,
І мне падаецца, што ўсё я змагу,
А час параўняўся і слых мой казыча:
– І так ты спазніўся на многа гадоў.
Чаму не спяшаўся, як быў маладзейшы?

Ці шмат хоць пакінеш адметных слядоў?
Увогуле мне па душы твае вершы.
А ў плечы не трэба цябе падпіхаць?
Ты быццам задыхаўся, бедны паэце.
Мо допінг які хоць украдкай падаць,
Бо мноства такіх апынулася ў Леце?
– Ды выкінь свой допінг! Я чыстым хачу
Туды, на вяршыню Парнаса ўзабрацца.
Ці чуеш, што новы ўжо верш бармачу,
І абганяю настырнага зайца.
І час супакоіўся, і ні гу-гу,
І заяц спыніўся ў страху, і скрусе,
А я ўсё бягу, бягу і бягу,
І хутка ўжо там, на гары апынуся.

*2018*

## Буська

Красуня кранула мяне за руку
І ціха сказала: – Вавуньчык, ку-ку.
Я азірнуўся і ў радасць урос
Пад ліпкія ўсмешкі белых бяроз.
– Куды ды, Вавуньчык? – спытала яна.
– А проста гуляю з цямна да цямна.
– Ці можна з табою я поруч пайду?
– Калі пацалуеш мяне нахаду.
І буську ў парыве ўляпіла яна –
І мы з ёй гулялі дваіх да відна.

*2018*

## Шаблон

Прагну свежай думкі, як паветра,
Як мігцення зорак маладых,
Бы ў спякотны дзень парываў ветру,
Бы ў пустыні паўглытка вады.

Аглушыла траскатня пустая.
Кволы сэнс увяз у глеі слоў.
Шмат вякоў шаблон не адпускае
Са сваіх акоў усіх аслоў.
*2018*

## *Хто падскажа?*

Што будзе з намі цераз сто гадоў?
А ёсць яшчэ ў падліках міліярд.
Ці ўчуем мы на Марсе шум садоў?
Ці трапіць на Венеру наш брыльянт?
Ці зможам перабрацца на Сатурн?
Ці гэта чалавецтву не дано?
Я ноччу вочы сонныя пратру
І ўсё гляджу ў космас праз акно.
На картах ці на зорках варажыць,
Якою стане родная Зямля?
Мо перастануць людзі ўжо тужыць?
Не будуць поўзаць танкі на палях?
Ці зменяцца з гадамі руслы рэк?
Ці забляе на Месяцы каза?
Ці заляціць  за сонца чалавек?
Хто можа сёння гэта прадсказаць?
*2018*

## *З натуры*

Бяроза з раздвоеннымі ствалами,
Нібы дзяўчына ўгору нагамі.
А гнёзды сухія гракоў,
Як шапкі старыя бацькоў.
Кара ўся ў маршчынах на дубе.
Вярба нібы хоча прыкленчыць.
Асіна, п'яная ўдупель,
Абы пра што ляпеча.
*2018*

***

Ты  вогнедыхаючая лава,
З магнітнага, напэўна, сплава.
Рукамі апякаеш і нагамі,
А вусны – як гарачае цунамі.
Табе не тратуары падмятаць,
А ў палацах светлых піраваць.

*2018*

## Маржы

Сябры марозу, завірух і лёду,
Для іх стыхія – холад і вада.
Іх не кармі ні хлебам і ні мёдам –
Адно зімою пакупацца дай.
Не вялыя ў іх мускулы і скура,
А па сасудах бегае агонь.
Яны глядзяць ўніз як бы панура:
На шкло баяцца наступіць нагой.
Маржам ніколі не жадаў я ліха,
Але не іх ў душы сваёй купаў:
На юную прыгожую маржыху
Мой позірк зачаравана ўпаў.
Яна ішла пружыніста і лёгка,
Сабою аздабляючы сусвет.
Я плыў бы з ёю многа вёрст – далёка
І не спазнаў бы ні прастуд, ні бед.

*2018*

## Не прычыню зла

Даволі часта я ў сне лятаю.
(Не думайце, што беспілотнік я).
Бываю над прасторамі Кітая,
Карэйскіх бачу з вышыні ваяк.

Я не птушыны гадасны драпежнік,
Не тое, што якісьці там арлан.
І не адзін абачлівы памежнік
Не нанясе мне агнястрэльных ран.
Я просты, белы беларускі бусел.
Пагляньце, дзюба з мірнага агню.
Хоць зараз перад вамі паклянуся,
Што людзям зла нідзе не прычыню.

*2018*

## Не здатны

Не, я не змог бы кіраваць дзяржавай,
Бо ўпраўляць сабою не магу.
Во, каб палохаць на балоце жабаў
Ці на каленях дрот згінаць у дугу.
То тут я майстар, майстар адмысловы.
Яшчэ пляту прыгожыя кашы,
Лаўлю ў паветры новенькія словы,
Якія мне бываюць па душы.
Люблю вазіцца з пілкаю, сякерай,
Касіць траву ля маладых кустоў,
Круціць раман з пакладзістай Вікерай
І больш амаль не здатны ні на што.

*2018*

## Настаўленне

Ёсць прапанова грошы не грабсці,
Не звязвацца з карупцыяй ніколі,
Не красць, не аб'ядацца, а пасціць,
Каб не пабыць ад прагнасці ў няволі.
Калі ж і я што-небудзь украду,
Прашу вас, не бярыце на парукі,
Мякіны падсыпайце ў яду,
Альбо накіньце кайданы на рукі.

Капейку трэба чэсна зарабляць
І траціць на пакупкі эканомна,
Не прапіваць без толку, не губляць, –
Увогуле не жыць… крамольна.
*2018*

## *Каршун і сініца*

Ты, вока снайпера, мяне не падвядзі.
Глядзі, вунь на вярбе сівы каршун сядзіць.
Ён хоча на сініцу наляцець.
Я падайду бліжэй і крыкну: “Гець!”
Ну, а сініцы высыпаю крупы,
Якія ўчора за рубель купіў.
Яна нам выведзе нямала птушанят
І прынясе карысці людзям шмат.
*2018*

## *Невязенне*

Бы верабей у нітках
Заблытаўся ў жыцці.
Як залатога злітка,
Апоры не знайсці.
Бязважкасць наступіла.
Мой тонкі першы том
Буланая кабыла
Разбіла капытом.
Куды пайсці, падацца?
Хто змог бы памагчы?
Пачну з гары куляцца
І страчу зноў ключы.
Сплашное невязенне –
Хоць воўкам стань і вый.
Парваў, знасіў адзенне,
Ды й сам знасіўся, ды й…
*2018*

## Сатана

Не вырвацца з абдымкаў сатаны.
Ужо парваў кашулю і штаны,
А ён не адпускае ўсё мяне
І думае на дрэннае змане.
Няхай не спадзяецца. Устаю.
Я толькі сілы хітра прытаю.
Пасля гіпардам скокну на яго
І ўкіну падлу ў незямны агонь.
*2018*

***

Біся, сэрца, у маіх радках,
У кожнай літары, у кожным слове,
Аддавай энергію роднай мове
Адмаўленцам мовы на страх.
Я і верш мой – адзіная плоць.
Разарваць нас не ўдасца нікому.
Хто адважыцца – ударамі грому
Я тады пакажу сваю злосць.
*2018*

## На паляванні

Вось, вось завея паслабее,
За вуха рэзка не рване,
Шырока неба прасвятлее,
У вочы сонца зазірне.
Адзену чыстую ватоўку,
Накіну шарфік нахаду,
Вазьму ў свірне дубальтоўку,
На паляванне ў лес пайду.
Як заяц вынырне з-пад снегу –
Пальну ўгору альбо ўбок,
Каб уцякач у здатным бегу
Яшчэ й павысіў свой падскок.

Пасля пад дубам крыкну гучна
(І Пушкін сам сябе хваліў):
– Ну, малайчына ты, Вавунча!
Хоць сёння зайца не забіў.

*2018*

## Зайздрасць

Малоціць вецер снежную пшаніцу,
Развейвае мякіну па палях,
Зрывае з хвояў рыжую іглiцу,
Сумёты намятае на шляхах.
Ён сёння супакоіцца не можа,
Лісой не зашываецца ў нару,
Вальсіруе з бярозкаю прыгожай,
Цалуе яе белую кару.
Раўніва я гляджу яму ў вочы:
Імкнення да свабоды не суняць,
Адны праблемы – новыя сурочаць,
І нейкая сплашная мітусня.

*2018*

## Надыход цяпла

Збоч чыстага берага лебедзь плыве.
Вясна і каханне ў яго галаве,
А ўнізе пад ім аблачынак стагі –
І мне, і яму гэты свет дарагі.
Вітаю расу на ўзмакрэлай траве,
Віншую асу з надыходам цяпла.
А дуб малады ад нуды адгавеў –
І мара яго аж на Марс паплыла.

*2018*

***

За белай акацыяй сонца гарыць.
Ніхто не пасмее яго патушыць.
Ну а калі і патухне само –
Для чорнай дыры яно – эскімо.
Над колкаю ёлкай – кволы туман.
У сіняй пустыні – хмар караван.
У ціхай хаціне ніхто не жыве –
І шашаль паршывы сцены жуе.
Пасецца карова мая ля вады –
Я з кіем дубовым кірую туды.

*2018*

## Зіма

Прачнуўся ранкам, глянуў у акно,
А на падворку – пульхная мука,
Ці можа хто расплюхаў малако –
І разлілася белая рака.
Даюць канцэрт артысты – вераб'і ,
А галкі слухаюць іх траскатню.
Эх, трэба выйсці, “малака” папіць –
І мо ў вачах прыбавіцца агню.

*2018*

## Зэку

За цёмнымі кратамі нельга піць,
А голад спатоліць можна.
Жыў ты здатна ці жыў бязбожна?
Але ж прыйшлося цябе пасадзіць.
Усё пераблытана ў гэтым жыцці,
Гадзюкамі сцежкі перапляліся,
Не проста сваю, як рубель, знайсці,
А ўдасца знайсці – Хрысту пакланіся.

І бацька, і маці хацелі, каб ты
Быў чэсным, разумным і добрым,
Не біў слабаку кулаком пад дых,
Не пакідаў прыстарэлых у горы.
Чакай, можа прыйдзе жаданы дзянёк,
Сустрэне цябе незабыўная Ася.
Як выйдзеш на волю, прысядзь на пянёк
І перад сусветам пакайся.

*2018*

***

Ты вылучаешся ў натоўпе,
Бы кветка белая ў траве,
Бы сярод цёмных хмарак поўня,
Бы праблеск думкі ў галаве.
Я першы раз амаль не ахнуў,
Як позірк мой цябе злавіў.
Душа прыбавіла ў размаху
Сваіх нябесных, лёгкіх крыл.

*2018*

## Прыгоды бравага пакупніка

Згубіў капшук з грашыма – ну і што?
Не стану ж плакаць я на тратуары…
Калі не вып'ю два разы па сто –
Дык я пра гэта і ў сне не марыў.
Па магазінах пахаджу і так –
Хоць кволы смутак кропельку рассею.
На жоўтай будцы прачытаў: “Табак” –
І падалося: трапіў у Расею.
У краме позірк каўбасу прыдбаў,
Не “дарагую” – дваццаць два за кілю.
Каб тыя грошы, хто знайшоў, аддаў,
То трыццаць грамаў можа і купіў бы.

Пасля пакіраваў у новы парк
Насустрач дню і ветру-забіяку –
А там сабакаводаў і сабак
Больш, чым насення ў галоўцы маку.

## *Шэры дзень*

…Наранку крышку двор падмёў
І напалохаў вераб'ёў,
Курэй у зман рукой увёў,
Карову на папас завёў.
У поўдзень прапусціў нарыў,
Каб ён пад скурай не бузіў.
Катам кравянку падарыў,
Схадзіў па булку ў магазін.
Падвечар зноў памераў ціск –
Высокі (без усякіх слоў),
Перачытаў станоўчы ліст,
Які даслаў мне "Дзеяслоў".
Так шэры дзень, бы кот, прабег –
Нічога я не напісаў.
Піў моцны чай, кравянку еў,
Язык з Бурбуліхай часаў.

*2018*

***

Праходзяць шпарка дні, а творы
Марудна спеюць ў галаве.
Дзе нашы Керны, Айседоры?
Хто ўскалыхне так душу мне?
Я ўжо ў роспачы, ужо я
Не знаю як, пра што пісаць,
А ўсё, хоць добрае, чужое
Абрыдла кожны дзень чытаць.

Мо жураўлём злятаць за мора,
Набрацца яркага святла?
Мо ўраз наспее колас твора
Ад афрыканскага цяпла?

*2018*

## Не ладзіцца

Штосьці не ладзіцца ў нашым жыцці –
Я маю на ўвазе ўсё чалавецтва.
Кроў з яго тулава проста цюрчыць –
І гэта сучасным парадкам завецца.
Калі б гэту кроў у адно русла ўліць,
Рака ўтварылася б роўная Нілу.
Каму ад такога раскладу баліць?
Толькі не тым, што ўвабраліся ў сілу.
Чым больш стане ранаў на целе людскім,
Тым горш будзе кожнаму з нас паасобку –
І смерць можа ўзяць у стальныя ціскі
Жыццё, як ільдзіны драўляную лодку.

*2018*

## Пад напеў салавейкі

Завялі пралескі ў вачах,
Усмешка пакутлівай стала.
Я часта не спаў па начах:
Ой, як ты мяне хвалявала!
Нявопытным сэрцам сваім
Цябе пакахаў я бязмерна.
Калі ты стаяла з другім,
Мне так станавілася дрэнна.
Мы лёсы звязаць не змаглі
Пад лёгкі напеў салавейкі.
Дарогі і нас развялі,
Як многіх такіх маладзенькіх.

Паўвека мінула з тых дзён –
І зноўку звяла нас дарога,
Ды я ўжо не той маладзён,
І ты пастарэла намнога.
Завялі пралескі ў вачах,
Усмешка пакутлівай стала.
Я часта не спаў па начах:
Ой, як ты мяне хвалявала.
*2018*

## Заморак

Духоўны заморак мяне павучае:
Баіцца – Пегас мой зусім адзічае.
А яго сенам духмяным кармлю,
І крылы яго ахінаюць Зямлю.
Бываюць памылкі, бываюць пралікі.
Былі яны нават у самых вялікіх.
Ды бачу: Пегас мой прыгожа ляціць
Туды, дзе сузор'е яскрава трымціць.
Ні тут на зямлі, ні ў небе не збочыць,
Бо ў яго ўсёбачныя вочы.
З духоўным заморкам ці варта вітацца?
Найлепш з ім паўсюль і заўжды разміпацца.
*2018*

## Надвячорак

На ружаватым небасхіле
Адбітак галак маладых.
Аслаблы дзень ужо не ў сіле
Адкінуць коўдру цемнаты.
Маўкліва, велічна прырода
Пачне, як мы адпачываць.
А ў небе зорак карагоды
Ніякай шэльме не стрымаць.
*2018*

***

Па-за ліхім, каравым словам
Знайдзі высокае, сваё.
Не ўпадабляйся шэрым совам,
Не вымаўляй, што не тваё.
Сярод людзей, сярод сусвету
Лаві энергію цяпла,
Лунай у воблакі адзетым –
І прыйдзе Божая хвала.

*2018*

# Вепр, асёл і слон

*Байка*

Мы выпівалі ўсе, не піў адзін асёл.
Барсук разносіў тлустай лапай шклянкі.
Мінут пятнаццаць тост трымаў казёл,
Шашкі смакталі з фільтрамі цыгаркі,
Закускаю не песцілі сябе.
Вавёрка піва смакавала ў роце.
Занадта зацягнуўся наш абед –
Начальнік – слон злаваўся на рабоце…
Асёл пад вечар расказаў слану,
Дзе мы былі і што аб ім казалі,
Як лазіў п'яны вожык на сасну,
Як воўк з ласём казулю цалавалі.
Слон выклікаў назаўтра да сябе
Зачыншчыка банкета – вепра:
– Ну, як настрой, ці смачны быў абед,
Пілі гарэлку, кан'ячок ці вермут?
Вепр хмурна глянуў з-пад ілба і так
Пачаў непалахлівую гаворку:
– Пілі, начальнік, піва і кан'як,
Замочваў я сваю другую жонку.
– А што яна, як тая ўцячэ?

– Вядома, не. Але сябры… насталі…
Ды во ў мяне ёсць кан'ячок яшчэ.
Магчыма, ў добры час паспрабавалі б?
Слон паглядзеў, падумаў, памаўчаў,
Пасля пасунуў хобат ў сейф па шклянку
І падабрэў прыкметна ў вачах,
І вынуў на закуску шакаладку.
Настрой ў слана падняўся хоць скачы,
І ў вепра на душы спакойна стала…
Адзін асёл застаўся тут ні з чым:
Свайго начальніка ён ведаў вельмі мала.

## *Байка пра калючку*

Абступілі лідскія азёры
Ў гумовых ботах рыбакі,
Ды ўцёк кудысь карась мацёры,
Зніклі краснапёркі, шчупакі.

Гойдаюцца паплаўкі на хвалях,
Не ідуць раптоўна пад ваду.
Хітрымі і рыбкі сёння сталі,
Не клююць на ўсякую брыду.

Замахнуўся дзядзька зноў вудзілам:
Хочацца хоць што з вады дастаць.
Каб пакласць да ранку ў халадзільнік,
Ці на рынку за рубель прадаць.

І, глядзі, нібы пашанцавала:
Паплавок штосьць павяло ўбок –
І ў паветры ўжо затрапятала
Рыбка, мо з гарохавы стручок.

І ўзмалілася калючка: “Слаўны!
Адпусці! Што хочаш я зраблю.
Я табе і пенсію прыбаўлю,
І марнатку новую куплю”.

Толькі дзядзька верыць не збіраўся,
быў ён хітры і не раззявак,
Нешта ў галаве пакалупаўся
І прамовіў, апантаны, так:

“Развяла свае тут тралі-валі.
Хоць была б пародзістай, як лешч.
Мне марнатку карпы абяцалі…
Буду я ў старой рыбачыць лепш”.

***

Я сколак касмічнай энергіі,
Хоць цела з тутэйшых страў.
Вазіў мяне ў Сірыю Гергіеў –
І там я на скрыпцы іграў.
Я з белым мядзведзем не змушана
На льдзіне ўсю ноч вандраваў.
Душа, як быльнёг, не засушана
На ўлонні цэйлонскіх траў.
Да раніцы (нават не верыцца)
Мне шмат дзе ўдалося пабыць.
А дома буяе аселіца...
Калі ж мне яе пакасіць?

*21.IV.2018 г.*

***

Раскованна хмаркі плывуць,
Раскованна ходзяць каровы,
Паселі шпакі на траву
І з імі – нябачныя словы.
У вырай яны адляцяць,
А я застануся на лузе
І плакаць пачну, як дзіця.
Ах, як мне без іх заўтра будзе?!

*16.07.2018 г.*

***

Там, між планет, мая дзялянка.
Ты, графаман, туды не лезь,
Бо стукну гладкаю качалкай –
І скончыцца твой паланэз.
Шукай сваю – абсяг шырокі.
Не поўзай па чужых слядах –
І вецер на хвасце сарокі
Цябе закіне хоць на дах.

*7.VI.2018 г.*

***

І гусі – прадмет паэзіі,
І куры, і індыкі,
І ўколы пякучай магнэзіі,
І ржавыя ў скрынцы цвікі.
Нам варта прыгледзецца толькі
Да іх асаблівых прыкмет.
А мы ўсё пішам пра зоркі,
Пра наш неабсяжны сусвет.

*2.VI.2018 г.*

## *Ах, якая прыгажосць!*

Не пазычаю розуму чужога,
А радасці прашу, малю ў Бога.
Знявечаны маральна, прыпадаю
Туманам да расхрыстанага краю.
Я не чужы тут для ўсяго зямнога,
Для тога, што прыйшло да нас ад Бога.
Хвіліны шчасця ластаўкай лаўлю,
Расой жывою каласкі кармлю,
Сінечай раствараюся ў прасторах,
Ракой бурлівай паплыву да мора,
Прайдуся па пясчаных паплавах,
З пагорка крыкну ў захапленні: Ах!
Ах, як прыгожа і ўтульна тут!
Хоць тут адчую беларускі дух!

*28.IV.2018 г.*

## *Мастак*

Малюю на небе карціны
Не пэндзлем, а ўяўленнем.
Пасля гляджу са здзіўленнем
На гэтыя дрэвы, хаціны,
На белыя горы-аблокі,
Рагатых ласёў і аленяў,
Павольных маржоў і цюленяў,
Кудлатых катоў жаўтавокіх.
Занятак займальны і лёгкі,
Як быццам гульня для дзіцяці.
Вунь, бачу, на воблачнай ваце
Дзяўбуць памідоры сарокі.
А што мне рабіць тут, на лаўцы,
У гэтым закінутым парку?
Смярдзючую нюхаць цыгарку,

Якая дыміць у бляшанцы?
А вось замалюю паўнеба –
Тады і пакрочу дахаты.
– Сядзець і драмаць – не ганебна?
– Ганебна! – сказалі салдаты.

*27.V.2018 г.*

## Мой сябар

Уганяю ў вершы энергію,
Няхай там вякамі жыве.
Паеду да сябра ў Венгрыю,
Паходзім па мяккай траве.
І ён да паэзіі здатны.
Так любіць над словам пацець!
Выдатны паэт, ой, выдатны!
І піша, бы кошык пляце.
Ён сам беларус. На заробкі
Паехаў вясною туды.
Не ставіць у вершах ні кропкі,
Ні коскі, ні іншай брыды.
А шчыры, бы майская квецень.
Усмешку відаць за вярсту.
Заўсёды так цёпла прывеціць,
Хоць з ім на Венеру стартуй.
Ніводнай адмоўнае раскі.
І трэба ж ўрадзіцца такім.
А прозвішча простае – Пырскі.
А вёска яго? – Ды Ваўчкі.

*27.V.2018 г.*

***

Лёд Антарктыды растае пакрыху
І колецца, спаўзае ў ваду.
Вялізныя, размашыстыя крыгі,
Як жорны, усе сумненні ператруць.
Вада ў сусветным, змрочным акіяне
Паднімецца на метры ў вышыню –
І натаўцам не па сабе ўжо стане,
І я гару высокую прысню.
І гарады ў Еўропе пахіснуцца,
Падмыецца, разбурыцца Н'ю-Ёрк.
А раптам землятрусы ўстрапянуцца,
Мацней націсне сонца на курок,
Ці ўзыйдзе страсць да ядзерных нападак?
Дзе бессмяротны прамільгне Кашчэй?
Ці хопіць на Зямлі для ўсіх лампадак?
Ад слёз вада паднімецца вышэй.

*18.08.2018 г.*

## Боль

Мой родны кут – уся Зямля,
А кут былы стаў апусцелым:
Мятла нябачная змяла
І дух людскі, і нашы целы.
Адных занесла ў гарады,
А хто аджыў – пайшлі ў магілы.
Забыць, не прызджаць сюды
У шмат каго стае ўжо сілы.
Ды і ў рачулкаў спрыт патух:
Пара для іх зусім не тая...
Тут шчупакі не рвуць таптух:
Вада ў равах наскрозь пустая.
Хоць стань над Нёмнам, закрычы:

– Пашлі, браток, ў канавы рыбу,
Вярні ім дрэвы і карчы –
І я душой ў прасцяг не рыпну!
*24.08.2018 г.*

***

Як пахіліць да лепшага ўвесь свет?
Ці ёсць такая моцная рука?
Як супыніць наплыў празмерных бед,
Магнітных бур утаймаваць быка?
З кійкамі ходзяць людзі па Зямлі –
І гэта не ад зорнага дабра.
Маглі жа быць здаровымі? Маглі!
Не Бог жа ў нас здароўе адабраў?
Нашэйнікі і колцы-павадкі
Купляем для лахмаценькіх сабак –
І свет ад сабачні ўжо стаў брыдкім.
А некалі ўсё было не так...
У думках і пачуццях разнабой.
Дзе ідэалы? Іх няма, няма.
І род людскі як быццам сам не свой:
Адна на ўсіх духоўная чума.

*28.05.2018 г.*

***

Я на плячах сваіх трымаю свет.
Не з лёгкіх ноша. Ну, а што рабіць?
Не кінуць жа яго у прорву бед,
Дзе, як смала, метал вайны кіпіць.
Я толькі сілы ў космаса прашу –
І ён мяне не крыўдзіць, як-ніяк.
Я сонца ў душы сваёй нашу,
Яно надзейны ўнутраны маяк.
*15.08.2018 г.*

# Вершы
# для
# дзяцей

## Жалуды

Непадалёку ад вады
На дубе спеюць жалуды.
Галінку тата страсяне –
І ёсць занятак у мяне.
Я ў кошык жалуды збяру,
Лясніцтву потым падару.
У глебу кінуць жалуды –
Дуброва будзе праз гады.

## Конік

Скача конік на траве.
Што ў яго на галаве?
Як антэны, вушкі.
Ды няма папружкі,
Ні папружкі, ні аброці.
Скача конік па балоце.
Як нам коніка злавіць,
Накарміць і напаіць?

## У рэчцы

Блішчыць у рэчцы плыткай
Акунь з чырвонай рыбкай,
І чорныя жукі
Паўзуць па дне ракі,
І нейкія казяўкі
Хаваюцца ад п'яўкі.
А сом, як кот, вусаты
Плыве пад корч гарбаты.

## Дожджык

Намачыў ён кветкі, траўку,
Дахі і платы,
Брамку, Жучку каля ганку,
Белыя сады.
Проста з неба льецца, льецца,
Як жывы, урчыць.
А як сонейка ўсміхнецца,
Ён зазіхаціць.

## Канцэрт

Абляпілі птушкі голле, песню пачалі.
Хай пацешыцца прыволле неба і зямлі.
Хто прыходзіць – тут не лішні, слухае канцэрт.
Выступае тут на вішні хор, а не квартэт.

## Сайкі для зайкі

Мы у двары ў Валі
Пясочак прасявалі,
Пасля ляпілі сайкі
Для плюшавага зайкі.
Ды зайка саек тых не еў:
Ці не хацеў, ці не ўмеў?

## Галкі

На платах паселі галкі
І паглядваюць на ганкі.
Дзеці з хатаў выбягаюць
Крошкі з місак высыпаюць.
Галкі хлеб дзяўбуць увішна,
А наўкола снег, зацішна.

## *Хто ўгадае?*

Я шчаслівы, я шчаслівы:
У мяне ў кішэні слівы.
Хто ўгадае колькі іх –
Пачастую добра ўсіх.

## *Маліны*

Ірдзеюць ля даліны
Чырвоныя маліны,
І яркія парэчкі
Паспелі каля рэчкі.
І кажа мне мой тата:
– Бяжы хутчэй дахаты,
Заглянь да Олі, Юркі
І захапіце кубкі.
Пад вечар мы з даліны
Няслі дамоў маліны.

## *Пераклічка*

Сарока села на суку.
Зязюля ёй здалёк: “Ку-ку”!
На дубе каркнула варона,
Заклякатаў бацян раптоўна.
Салоўкі песня ўзнялася –
І пераклічка пачалася.

## *У магазіне*

У нашым новым “Малышы”
Нямала лялек і машын.
А з верхняе паліцы
Глядзяць на нас лісіцы.

А побач з імі зайчык
І каляровы мячык.
Я ж папрасіла ў мамкі
Купіць на зіму санкі.

## *Вожык*

Вылез вожык з асакі,
Паглядзеў ва ўсе бакі.
Па сцяжынцы коціцца,
Есць у нас не просіцца.
Мы падбеглі:
– Стой звярок!
Ён скруціўся ў клубок.

## *У агародзе*

Мама гнала гусяняты
На лужайку, на папас,
І для нас знайшла занятак
У агародзе ў гэты час.
Мой старэйшы брацік Валік
Нам ваду насіў з ракі.
Мы капусту палівалі,
Памідоры і гуркі.

## *Мышыны дом*

Мы сабралі многа шышак,
Збудавалі дом для мышак.
Коцік хвосцікам вільнуў –
Дом мышыны развярнуў.

## Раўчук

Праз лужок бяжыць раўчук
І смяецца, як хлапчук.
То нырне ён пад масток,
Абміне лазы кусток,
То пад кладку шмыгане,
То вясёлцы падміргне.

## Грыбок

Схаваўся пад дубок
Карычневы грыбок,
Стаіць на тоўстай ножцы
Пры ўтоптанай дарожцы.
Я нахілюся, пагляджу,
Знаходку маме пакажу.
Падрэжам ножку ля зямлі,
Каб тут грыбкі ізноў раслі.

## Вавёрка

Прыйшлі мы з татам у лясок,
І раптам бачу я: звярок
З галінкі на галінку – скок.
Мяцёлкай рыжай хвосцік,
Прадаўгаваты носік,
Маленькая галоўка –
А зваць звярка вавёрка.

## Вецер

– Што такое вецер? –
– Мы спыталі ў Пеці.
Пеця кажа:
– Вецер ходзіць па ўсім свеце,
Дрэвы прыгінае, горы абмінае.
Хто яго ўтварае наш настаўнік знае.

## Барок

Сцяжынка нас вядзе ў барок,
Дзе шмат дзятлоў, драздоў, сарок.
Растуць там ягады, грыбы
І водзяцца вавёркі.
А з дзеразы вяроўкі
Сплятаюца ў маткі.
Цвіце і пахне верасок,
Звісаюць шышкі з ёлкі.
Як добра, што такі барок
Расце ля нашай вёскі.

## На лужку

Тата выкасіў лужок,
Сена склаў ён у стажок.
Пахне мёдам наваколле,
Для дзяцей цяпер раздолле.
Ля стажка яны гуляюць,
Толькі сена не чапаюць.

## Пчолка

Сядзіць на кветцы пчолка,
У хвосціку іголка.
Рукой не дакраніся,
Нагой не датуліся:
Уколе так знянацку,
Што выпусціш з рук цацку.

## Гарбуз

Хто паклаў на наш абрус
Круглы, нібы мяч, гарбуз?
Дзед смяецца:
– З Мінска прынясла нам пліска.
Баба мне маргае, а сакрэт скрывае.
Толькі мама не схітрыла:
– Гэта я гарбуз купіла.

## Бычок

Наш пярэсценькі бычок
Па падворку скок ды скок.
Бабы слухаць ён не хоча,
Ля хлява вядром грукоча.
На вароты пaглядае,
Маму Кветку ён чакае.

## Вясна

Коцік жмурыцца ад сонца,
Мые лапкай носік.
А праменьчык у ваконца
Стукае і просіць:
– Адчыніце, дзеці, фортку,
Ўжо зіма ўцякае.
Хай вясна, як госць, з надворку
Ў хату завітае.

# Проза

# Водпаведзь

Скрундзь, калі не лічыць ката, жыве на хутары адзін. Яму ўжо пяцьдзесят два гады і варта было б прыдбаць жонку, якая варыла б яму ўсялякія стравы, мыла б кашулі і бялізну і разам спала б на адным ложку. Але дзе яе ўзяць? У бліжэйшых вёсках прыдатнай для сябе адзінокай жанчыны ён не знайшоў. У горадзе іх, канешне, хапае. Ці не пахіліцца ў райцэнтр? У Лідзе ён некалі працаваў і многіх ведае, а нядаўна, знаходзячыся на рынку і сустрэўшыся там са сваім былым напарнікам па рабоце, дазнаўся ад яго, што ў былым кінатэатры "Кастрычнік" па суботах праходзяць вечары для тых, каму ўжо за трыццаць.

У адзін з выхадных Скрундзь і падаўся ў горад. Пакуль звечарэла пахадзіў па вуліцах, па крамах, а калі ў вокнах "Кастрычніка" засвяціліся агні, пакіраваў туды. Перад гэтым, для храбрасці, кульнуў стаграмовую бутэлечку бальзама, узбадзёрыўся, павесялеў. І як толькі ўвайшоў ў танцавальную залу, адразу як навічок звярнуў на сябе ўвагу жанчын. А былі тут усялякія: і тыя, каму ўжо каля сарака, і тыя, каму ўжо за семдзесят. Скрундзь пэўны час стаяў і аглядаў публіку, прыкідваючы каго запрасіць на танец. Яму кінулася ў вочы адна самая маладая і самая прыгожая брунетка са ўзбітай, як капа сена, прычоскай. Яна таксама шчодра залыпала ў яго бок іскрыстымі вачыма.

Зайграла музыка. Ён ляўшою расправіў вусы і цераз усю залу пакіраваў да яе. А чаго там губляцца? Няхай бачаць, што ён, Скрундзь, не з труслівага дзесятка. Пад час танца ён без ўсялякай падрыхтоўкі і запытаў:

– Як вас зваць?

– Таня. А вас?

– Скрундзь. Ай, не. Скрундзь – гэта прозвішча. А зваць мяне Мацей.

Пасля танца Мацей прывёў Таню на тое самае месца, дзе яна стаяла. І не адыходзіўся ад яе. Ды і яна сваімі далікатнымі цёплымі размовамі трымала яго каля сябе, як на прывязі. Старыя дзевы і ўдовы зайздросцілі Тані. Як яна з першага вечара заваявала такога элегантнага кавалера? Па заканчэнні вечара Таня і Скрундзь разам выйшлі на вуліцу.

– Я жыву на хутары, – прызнаўся ён. – Аўтобус у наш бок ужо не пойдзе. А мне няма дзе начаваць…

– Бедненькі… Не гаруй, пераначуеш у мяне. Толькі спаць будзем на розных ложках.

– Воля твая.

Падняліся на чацвёрты паверх дома, які стаяў не так і далёка ад "Кастрычніка". У кватэры не тое, што быў беспарадак, тут проста царыў вэрхал. Па ложках, па крэслах на падлозе валяліся нейкія старыя лахманы, абутак.

– Гэта не мая кватэра, – паспяшыла апраўдацца Таня. – Тут жыла мая сяброўка, але яе пасадзілі нядаўна ў турму. Перад ад'ездам яна аддала мне ключы і папрасіланазіраць за яе дабром. Прабач я зараз сёе-тое прыбяру.

Яна хутка пасхоплівала адусюль заношанае адзенне, абутак і перанесла ўсё ў суседні пакой.

– Як ты глядзіш на тое, калі мы па кілішку вып'ем чаго-небудзь мацнейшага за чай? – запытаў Мацей.

– Станоўча, – адказала Таня.

– Тады я збегаю ў "Ластаўку" і куплю бутэльку "чарніла". А закуска ёсць?

– Вазьмі і закускі. Хоць ліверкі.

У магазіне ён доўга не бавіўся і даволі хутка вярнуўся назад. І калі на стол паставіў бутэльку 0,7 "чарніла", Таня павесялела. А тут яшчэ поруч паклаў абадок ліверкі і паўбаханкі хлеба. Што яшчэ для пачатку трэба? Чокнуліся, прыгубілі смярдючую атруту. Гамана ажывілася. Мацей у роспыты асабліва не лез: не хацеў быць назойлівым. Так, размўлялі абы пра што ды ўсміхаліся адзін аднаму. Пасля

ляглі спаць на розных ложках. Мацей, паварушыўшыся, не гучна кашлянуў у жменю, загаварыў.

– А можа перайсці ўсё-такі да цябе?

– Зараз. Толькі памкніся – адразу выстаўлю за дзверы, як міленькага.

Ён замаўчаў і неўзабаве заснуў. А раніцай прапанаваў ёй паехаць на хутар і там застацца жыць разам з ім. Гэта яе заінтрыгавала. Але сваю згоду яна выказала не адразу.

– А як жа гэтае дабро? – прамовіла Таня. – Яго могуць зладзеі раскрасці. Што я тады скажу сяброўцы?

– Каму гэтыя лахманы патрэбныя. Іх ні адзін чалавек задарам не возьме. Ды і мы калі-нікалі будзем наведвацца сюды.

Праходзячы каля "Еўраопта", ён папрасіў Таню пачакаць, а сам забег у магазін, каб купіць пяць буханак хлеба і кавалак сала.

– У мяне дома ёсць сушаныя грыбы, наварым супу, засквярым салам, – прамовіў ён, калі выйшаў на вуліцу. – Во будзе смаката!

Дома Мацей, сапраўды, не ўпаў тварам у гразь. Уключыў газавую плітку, паставіў на яе немалы чыгун з вадой, укінуў некалькі жменяў грыбоў…

– А цяпер ідзем, я пакажу табе свае ўладанні, – звярнуўся ён да Тані. – Грыбы няхай варацца.

Праз другія, супрацьлеглыя веснічкі яны выйшлі з двара на прастор.

– Вось, бачыш, возера. У ім рыба проста кішыць. А з трох бакоў яго акаймоўвае лес. У лесе водзяцца дзікія вепрукі, ласі, казулі, вавёркі, куніцы – усякая дзічына. Вось каб дзе ружжо раздабыць. Восенню я бы застрэліў вепрука. На ўсю зіму хапіла б сала і мяса.

– А дзе ты тое ружжо дастанеш? Яно ж не валяецца пад плотам.

– А ты украдзі ў каго-небудзь.

– Зараз. Я ўжо тры гады сядзела за кражу. Хочаш, каб яшчэ на тры гады пасадзілі.

Шла другая палавіна красавіка. Дзень быў цёплы і сонечны. Нераставала рыба. На вярбе распушыліся жаўтавата-белыя коцікі.

– Мы рыбу ловім разам з кошкаю, – пахваліўся Мацей. – Хочаш я табе пакажу, як яна ловіць?

– Давай.

– Хомця, Хомця, Хомця! Ідзі сюды, – паклікаў Мацей.

І кошка тут жа прыбегла. Каля берага, выціскаючы ікру, церлася аб мінулагоднюю азёрную траву і пясок платва.

– А ну, Хомця, цап-царап яе.

І кошка, як на мыш, накінулася на адну з плотак. Злавіла і ў зубах прынесла да Мацея, паклала каля яго ног. Дзесяць рыбін Мацей забірае сабе, астатнія дазваляе есці Хомці.

– Дык у цябе ж тут рай! – захаплялася наваколлем Таня.

– Лепш, чым рай, – задаволена адказаў Мацей.

Яна стаяла і любавалася лесам, возерам, удзячнымі вачыма глядзела на Мацея, пакуль той не прамовіў:

–Пайшлі, ужо нейдзе суп закіпеў. Хомця і адна справіцца з рыбай.

У чыгунку, і сапраўды, вуркатала. Мацей зрабіў меньшы агеньчык, каб не перла варыва цераз край, і яны зноў выйшлі на двор. Гаспадар паказваў Тані хлявы, свіран, дрывотню, садок. Усё ёй тут было да спадобы. І, здавалася, Мацей неблагі характарам. Так здатна пра ўсё апавядае, усміхаецца, хоць да раны прыкладвай.

– А сабаку не трымаеш?

– Я не люблю сабак.

– Пры лесе не перашкодзіла б мець. Ад зладзеяў абарона.

– От, разумных сабак зараз няма, а трымаць якога

дурня, каб усю ноч на месяц брахаў, не хачу.

Калі грыбны суп быў гатовы, Мацей засквары́ў яго дробнымі кавалачкамі сала, падсмажанага разам з цыбуляй, даў крыху астыць і наліў у дзве міскі – адну падсунуў да Тані, другую да сябе. Духмяны пах стравы напоўніў веранду, залу, разліўся па двары. Як толькі Таня высербала суп, задаволеная, прамовіла:

– А ты падобны на Сталіна. Такія ж вусы, твар.

– Многія так кажуць. А ў Ваверцы і Рулевічах некаторыя пляткараць, што я сын Васіля Сталіна, бо той служыў у Лідзе палкоўнікам на аэрадроме. Але кажуць, што я падобны не на Васю, а на яго бацьку Іосіфа. Аднак, як я мог быць сынам Васіля, калі мяне падчас яго службы ў Лідзе на свеце яшчэ не было. Глупства. Не вер гэтаму.

– Але ты, сапраўды, падобны на старога Сталіна.

– Мала што.

Пасля абеду яны зноў прагуляліся вакол возера, пастаялі пад старым дубам.

...Таня засталася жыць у Мацея.

У цэлым гэты год і два наступныя скл аліся для іх няблага. Яны за лета і восень на ягадах і грыбах зараблялі добрыя грошы, якіх хапала да наступнага ўраджаю дароў лесу. Да таго ж было нямала садавіны, гароднiны, рыба не зводзілася ні на дзень. А вось чацвёрты год выпаў для іх няўдачным. Ураджай на ягады і грыбы аказаўся слабым – і грошай у іх хапіла толькі да Новага года.

Мацей пайшоў у кантору СВК "Світанак", каб убачыць старшыню гаспадаркі ці заатэхніка і папрасіцца ў іх прыняць яго вартаўніком на ферму, бо цяжкай работы ён выконваць не мог: перашкаджала грыжа. Але заатэхнік, які трапіўся яму на вочы, сказаў, што месца вартаўніка занятае, а вось вакансія даяркі ёсць, і што калі твая Таня хоча працаваць даяркай, дык няхай хоць заўтра выходзіць на работу.

Мацей угаварыў Таню, і яна, хоць і буркаючы, пайшла на ферму. А назаўтра забіла ў хамут:

– Не пайду я больш туды. Там смярдзіць гноем, каровы мукаюць, быкі равуць. Я іх баюся.

– Нікуды не дзенешся. Калі хочаш жыць, трэба працаваць.

– Я сказала не пайду! І ўсё!

– Лайдачка! На маю шыю ўзабралася?! Хуценька збірайся – і ў дарогу.

– І не думаю!

– Ах, так?!

Ён расперазаў дзягу, ухапіў Таню леваю рукою за каўнер, а праваю з дзягай давай сцягаць па плячах, па мяккім месцы, па нагах. І пры кожным удары паўтараў:

– Ідзі на ферму! Ідзі на ферму! Ідзі на ферму!

А яна адказвала:

– Не пайду! Не пайду!

І так яны тузаліся з паўгадзіны.

Пасля Таня неяк выкруцілася з яго рук, адбеглася да парога і моцна выгукнула:

– Цьфу на цябе і на твой хутар, Мацюша ты недапечаны! Я паеду ў Ліду і больш сюды і носа не пакажу!...

*2015*

## Завіток

Жаўтавата-чырвонае кляновае лісце ў перамежку з ліпавым зблытаннымі касякамі і ў адзіночку ападала з дрэў, якія растуць ўздоўж вуліцы Ажэшкі. Не халодны яшчэ і не вельмі рэзкі вераснёўскі вецер разганяў яго ва ўсе бакі, даносячы да сцен педагагічнага універсітэта.

Каля вялізнага акна ў прыгожай салатавай сукенцы, з кароткімі рукавамі, сядзіць студэнтка Ірына Дуліна. Яна не

запісвае лекцыі па гісторыі старажытнай Грэцыі прафесара Чыжыка, а ўсё кідае позіркі то на мільгаючае лісце, то на аўдыторыю, у якой сцішана сядзяць яе аднакурснікі. Прычоска ў Дулінай, як перакаці-поле, і формай і колерам. Іншай да яе дробнага бялявага тварыка немагчыма і прыдумаць. Паводзіны Ірыны нагадваюць паводзіны вавёркі: такія ж хуткія рухі, так жа дапытліва стрыкае яна сваімі імгненнымі позіркамі. А вавёрка, паглядзіце, хіба не так: убачыць унізе пад дрэвам грыбніка, абстраляе, абстраляе яго сваімі маленькімі пільнымі вачанятамі і, скачучы з галінкі на галінку, аглядаючыся, уцякае прэч, хоць грыбнік і не збіраецца яе праследаваць.

Ірына разам з маці, якая не ўжылася ў Барнавуле са сваім мужам, прыехалі ў Гродна. Яны абмяняліся кватэрамі. А тут як раз на трэцім курсе філфака знайшлося вольнае месца: выключылі аднаго студэнта за непаспяховасць, бясконцыя пропускі заняткаў, прыхільнасць да алкаголю. У групе (на рускім аддзяленні) яе добра прынялі хлопцы і дзяўчаты за шчыры характар, знешні выгляд, уменне падтрымліваць размову. А Дубок, лірычнага складу хлопец, умеру танклявы, адразу і паклаў на яе вока.

Аднойчы ў актавай зале ўніверсітэта выступала з канцэртам нейкая вядомая маскоўская "зорка". Памяшканне было запоўнена студэнтамі, выкладчыкамі. Некаторыя нават стаялі на лаўках, прастаўленных ззаду за крэсламі. Але і на іх не было месца. Толькі каля Паўла Дубка яшчэ можна было ўціснуцца. Ірына, праходзячы збоч, спынілася насупраць і папрасілася дапамагчы ёй узабрацца на лаўку. Дубок узяў яе за рахманую маленькую ручку і пацягнуў на сябе. Ірына спрытна ўскочыла на лаўку і павярнулася тварам да сцэны. Узрушаныя блізкасцю яны стаялі, шчыльна сціснутыя першакурснікамі, і не вельмі захапляліся канцэртам. Голас спявачкі, і праўда, быў слабаваты, глухаваты, не выразны, што цяжка ўдавалася разабраць і некаторыя словы песні. Яна

брала публіку сваімі выкрутасамі і аголенымі нагамі.

Пасля канцэрта ўсе хлынулі ў раздзявалку, і Дубок, які меў намер праводзіць Ірыну дадому, згубіў яе недзе ў натоўпе. Затое на наступны дзень ён прапанаваў ёй схадзіць разам у кіно. Яна пагадзілася. Дэманстраваўся індыйскі фільм, у якім даволі здатна танцавалі і спявалі кудлаты хлопец і прыгожая, з падведзенымі бровамі, дзяўчына. Артыст, напэўна, уразіў Ірыну, бо пераходзячы цераз мост над Нёманам, яна без усялякае на тое прычыны, паварушыла слых Дубка:

– Мне падабаюцца хлопцы, у якіх на лоб спадае пакручасты завіток, як у гэтага індыйскага артыста.

– Але ж у мяне завітка няма, – расчаравана сказаў Павел, – у мяне валасы прамыя…

Яна прамаўчала і толькі скупа ўсміхнулася. Размова міжвольна пераключылася на новую тэму.

– Бачыш, – прамовіў Дубок, – вунь Каложская царква, а за ёю новы парк. Мы туды з хлопцамі ходзім рыхтавацца да летняй сесіі, загараем.

– Я ні разу там не была, але адсюль мне падаецца, што нічога цікавага там няма.

– Для мяне вельмі прывабная мясціна. Ты проста не можаш яшчэ адыйсці ад свайго Барнавула.

Яна насмешліва глянула на хлопца і выцяла:

– Магчыма і так.

Ён узяў яе за руку і не адпускаў аж пакуль не дайшлі да самага яе дома. Каля пад'езда доўга не стаялі: чаго там, заўтра ўсё роўна ўдасца ўбачыцца.

Аднойчы на вялікім перапынку Дубок, ведаючы ў сабе задаткі мастака, узяў кавалачак крэйды і пачаў маляваць на дошцы партрэты сваіх аднакурснікаў. Першай намаляваў Ірыну.

– Хто? – пытае, павярнуўшыся да аудыторыі.

– Дуліна!!!

Падабенства было бяспрэчным.

Ірыну ўсцешыла, што Павел пачаў менавіта з яе, ды і на партрэце яна аказалася прыгажэйшай, чым наяве.

Яшчэ калі-нікалі яны хадзілі разам у кіно, гулялі па горадзе.

Аднойчы Дуліна прыйшла на танцы, якія былі арганізаваны суботнім вечарам ва ўніверсітэце, з незнаёмым хлопцам. Падвяла яго да групы аднакурснікаў і кажа:

– Няхай пабудзе з вамі. Ваня яго зваць. Я на хвілінку адлучуся.

– Няхай сабе…

Студэнты паглядзелі на яго, як на іншароднае цела, і не сталі ўступаць у размову. Ён таксама маўчаў. Дубок паспрабаваў загаварыць – усё ж такі сапернік:

– Ну, як падабаюцца табе нашы дзяўчаты?

– Так сабе…

– Але ж у Ірыну, мусіць, закахаўся?

– Не ведаю… Ходзім.

Выгляд у Вані быў пакамечаны. Аднак на плоскі лоб звісала вузкая, пакручастая пасма валасоў, завіток, які, напэўна, і прывабіў Дуліну.

Неўзабаве прыйшла і яна сама, спрытна ўзяла Ваньку пад руку і ганарліва адвяла ў супрацьлеглы бок залы.

– Ну што, павесіла бараду? – кпілі сябры над Дубком.

– Яшчэ якую! Вострым клінам, як у старога казаха.

– Нічога. Перажывеш…

Усё ж апошняя кропка ў іх адносінах яшчэ не была пастаўлена. І вось на чарговай лекцыі, калі пажылы выкладчык рускай літаратуры Васілік зачытваў доўгую цытату з Бялінскага, Ірына крадком цераз Кацю, якая сядзела на адным радзе з Дубком, перадала запіску. Дубок разгарнуў лісцік і прачытаў: "Павел, ты самы добры, самы разумны, самы мілы ў групе, але я ніколі не назаву цябе каханым. Іра".

Дубок паглядзеў на Дуліну, пакруціў пальцам каля

правай скроні. Пасля ўзяў аўтаручку, унізе пад яе тэкстам напісаў "Дура" і перадаў паперку праз суседку …

Гады праляцелі як журавы ў небе. Раз'ехаліся выпускнікі па месцах сваёй працы. Дубка накіравалі ў Ліду, Дуліна засталася ў Гродне: на пятым курсе яна выйшла замуж за Ваньку, гэта і сталася прычынай, каб не адпраўляць яе ў вёску, ці райцэнтр.

…Неяк на пачатку восені Дуліна прыехала ў Ліду, заглянула ў школу, у якой Дубок працаваў дырэктарам. Ціха пастукала ў дзверы ўвайшла ў яго кабінет, сціпла прывіталася.

– А, Іра, – Павел Іванавіч падняўся са свайго месца. – Як даўно мы з табой не бачыліся!

– Больш дзесяці гадоў…

– Змянілася ты, папаўнела. Стала дароднай жанчынай. Ну як жыццё, сямейнае шчасце?

– Я самы няшчасны чалавек у свеце.

– Чаго так?

– Не клеіцца ў мяне жыццё з Ванькам. Ён храпе па начах, ад яго пастаянна патыхае перагарам. У нас няма нічога агульнага.

– Вось як!.. Ну а завіток на яго лобе пакуль трымаецца?

– Дзе там!.. Ванька увесь аблысеў. І толькі на самым нізе патыліцы застаўся неўкі сівы клок.

– Шкада… А такі быў хлопец!..

– Не смейся нада мною.

– Я не смяюся. Мне, сапраўды, шкада твайго мужа, што так перайначыўся.

– Бог адабраў у мяне на той час розум.

– Усе мы ў маладосці памыляемся. Не ты першая, не ты апошняя.

– Разводзься са сваёй жонкай, а я развядуся з Ванькам і мы зноў злучым свае лёсы.

– Ну, гэта ўжо залішне. У мяне растуць дзеці – сын і дочка, я кахаю сваю жонку і вельмі задаволены ёю. Мы

шчаслівыя і ў ніякіх пераменах не маем патрэбы. А ці помніш, якую тлустую кропку ты паставіла на нашых адносінах ва ўніверсітэце? Я не забыў пра гэта …

– Прабач…

– Але яшчэ і да тае кропкі я закахаўся ў першакурсніцу Зіну Весялоўскую. Аднойчы мы пайшлі з ёю у поле, прагульваліся каля жыта, у якім толькі-толькі з'явіліся першыя васількі. Яна нарвала іх, спляла вянок і надзела сабе на галаву. Стала яшчэ больш прыгажэйшай. А яе васільковыя вочы засвяціліся такімі добрымі, чыстымі агеньчыкамі, што я аж уздрыгануўся. Русавалосы цуд! Я тады падумаў: "Вось каб яна напісала такую запіску, як ты, то я, напэўна, не вытрымаў бы. Два гады чакаў я, пакуль яна не скончыць універсітэт. Ні да кога не заляцаўся. Пасля мы пажаніліся і сталі самымі шчаслівымі людзьмі. Яна зараз на ўроку ў гэтай школе. Хочаш, паклічу яе? Паглядзіш…

– Не трэба. Я не раз бачыла вас ва ўніверсітэце і ў горадзе. Раўнавала.

– Няпраўда. Я не прыкмячаў гэтага…

Дубок правёў Дуліну на вуліцу, пастаялі крыху, пагаманілі.

Дрэвы былі яшчэ зялёнымі, але асобныя лісцікі пажаўцелі і ціха ападалі долу, аздабляючы прышкольны двор. Яны напомнілі Паўлу тую студэнцкую восень, калі Ірына сядзела каля акна і любавался мільгаючым у паветры лісцем.

– Няшчасная я, – у каторы раз паўтарыла Дуліна.

Дубок яе супакоіў:

– Я прачытаў у "Медыцынскай газеце" артыкул, у якім распавядалася пра шырокае апытванне псіхолагамі людзей адносна сямейнага жыцця, дык высветлілася, што з тысячы чалавек толькі адзін шчаслівы. Так што ты не адзінокая у гэтым родзе…

*2015*

# Ідзі, мой міленькі!

Трэці тыдзень дзьме паўночна-ўсходні калючы вецер. Людзі ўціскаюць шыі ў каўняры, апускаюць вушы ў зімовых шапках, труць пальцамі шчокі, бараду, каб не прымарозіць. Не лёгка лебедзям на лідскіх азёрах. Яны то хаваюць пад крылы ногі, то галаву, то лятаюць каб сагрэцца.

Самае вялікае штучнае возера, насупраць дома паляўнічага, зімою замярзае поўнасцю і вадаплаваючыя птушкі ў гэтую пару сюды не залятаюць. Тут толькі сядзяць на сваіх сундуках, над лункамі рыбаловы і цікуюць за паклёўкай. А вось тры астатнія вадаёмы суцэльным лёдам нават і ў самыя вялікія маразы не пакрываюцца. На іх вялізнымі плямамі застаецца чыстая блакітная гладзь.

Лебедзі і дзікія качкі найбольш тут і атабарваюцца, па-рознаму тусуюцца, між сабой, часам пералятаюць з аднаго месца на другое. Найбольш спяшаюцца туды, дзе іх людзі падкармліваюць хлебам ці булачкамі. А падкармліваюць іх амаль паўсюдна, толькі ў розны час і рознымі порцыямі. Адзін чалавек прынясе цэлы батон і ўвесь пакрышыць птушкам, другі кіне на ваду зачарсцвелы, сухі кавалак хлеба, які пакуль не размокне, ні лебедзям, ні качкам не па зубах.

Ніна Лагун прыходзіць да птушак два разы ў дзень – раніцай і падвечар. Перад гэтым яна заглядвае ў магазін, купляе свежы батон і накіроўваецца да перадапошняга вадаёма па цячэнню Лідзейкі, на яго левы бераг, які парос чаротам і альшынай. Сюды менш за ўсё дабіраюцца лідчане, бо мясціна тут не ажыўленая, глухаватая. Але чатыры лебедзі – два белыя і два шэрыя, бацькі і дзеці, аблюбавалі гэты вадаём і на іншыя адсюль не пералятаюць. А не так даўно да іх прыбіўся пяты лебедзь, таксама белы, аднак напалавіну меншы за іх і, мабыць, хваравіты, бо нейкі вялы і маларухомы.

Чатыры веліканы не прымаюць яго да сваёй кампаніі, адганяюць прэч, як толькі той наблізіцца. Найбольш ненавідзіць яго самы грозны і магутны лебедзь, з доўгай, тоўстай шыяй і вялізнай галавой. Ён здалёк пазнае намер малога прыбіцца да іх чародкі і, размахваючы крыламі, настырна бяжыць па вадзе, каб з разгону ўзняць у паветра сваё грузнае цела і зверху напасць на няўклюду. Аднак той знайшоў для сябе добры паратунак: ён, хоць і не вельмі жвава, узкарабкваецца на прыбярэжны лёд і спяшаецца схавацца ў чароце. А велікан баіцца лёду, бо аднойчы ён, прызямляючыся ў гэтым месцы, паслізнуўся, упаў і моцна пабіўся. Малы разгадаў ягоную слабасць і карыстаецца ёю.

Ніна Лагун прыкмеціла варожыя адносіны велікана да безабароннай птушкі – і ўсю сваю ласку перанясла на пакрыўджанага лёсам лебедзя. Яна пераходзіць цераз мост, з насыпу апускаецца ўніз і між алешын і пасохлым чаротам па снезе крочыць берагам туды, дзе плавае адшчапенец. Наблізіўшыся, яна ціха кліча:

– Ідзі, мой добранькі, ідзі, мой міленькі, ідзі, ідзі, ідзі …

І той вылазіць з вады і, не спяшаючыся, асцярожна кіруе па лёдзі, да свае карміцелькі. Спярша ён баяўся падыходзіць блізка і Ніна Лагун кідала яму невялічкія кавалкі батона здалёк. Ён ахвотна падбіраў іх адзін за другім, імгненна праглынаў і спакваля ўсё набліжаўся да жанчыны. А неўзабаве і зусім пасмялеў і пачаў нават браць спажыву з яе рук. Ніна ласкава ўсміхаецца, падбадзёрвае:

– Добранькі мой, маленькі, частуйся, падрастай, каб дагнаў вунь тых вялікіх птушак, што крыўдзяць цябе.

Ён нібы разумеў сэнс слоў карміцелькі, па-птушынаму даверліва заглядваў ёй у вочы,ківаў галавой. Чалавек і птушка шчыра пасябравалі. Але вось аднойчы з раніцы ўсчалася моцная магнітная бура – і жанчыну ўраз апанавала слабасць, пацяжэла тулава, млявымі сталі рукі, ногі. Яна пайшла ў паліклініку і ўрач паставіў дыягназ – арытмія

сэрца. Накіравалі ў бальніцу. Хвалюючыся, збіраючыся з дому ў дарогу, Ніна сказала мужу:

– Не пакідай малога лебедзя ў бядзе. Падкармлівай яго. Ён плавае вунь там, на перадапошнім возеры, за паваротkай.

– Толькі гэтага мне яшчэ не хапала! – агрызнуўся муж. – Даглядаць нейкага дохлага лебедзя?.. Выжыве! Чорт яго не возьме!

– Чэрствая ў цябе душа, Валера, – прамовіла Ніна. – Не толькі пра мяне, нават пра нявінную птушку не паклапоцішся.

– Не засмечвай мазгі!

Неўзабаве муж адчыніў дзверы і выйшаў з кватэры. Жонка абрадавалася яго адсутнасці, дастала з шафы сто тысяч рублёў і пакіравала да суседкі па пляцоўцы. Не было часу доўга размаўляць, і яна адразу пачала:

– Валя, я даглядаю кволага лебедзя на возеры, але зараз кладуся ў бальніцу і баюся, каб з ім чаго дрэннага не сталася. Ці не магла б ты за гэты час падкармліваць? Вось табе і грошы для пакупкі батонаў.

Ніна расказала, дзе плавае малы лебедзь, як туды дабрацца.

– Ну, добра. Для мяне гэта не цяжка, – адказала Валя. – Толькі ж ты, глядзі, папраўляйся там.

Хвароба не вельмі паддавалася лячэнню, марудна адступала. Жанчыны ў палаце, звяртаючыся да Ніны, казалі:

– Чаго гэта ў цябе пастаянная заклапочанасць на твары, нейкае перажыванне? Здарылася што-небудзь?

– Вы таксама не вельмі часта смеяцеся,– пажартавала яна.

Выпісалі Ніну толькі праз месяц. Па дарозе дадому яна заглянула ў прадуктовы магазін, купіла два батоны – адзін для сябе, другі для птушкі. На лесвічнай пляцоўцы сустрэла суседку.

– Ну што, Валя, як там мой лебедзь?

– Падрос, акрыяў. Усе птушкі пераляцелі ўжо на вялікае

возера. Ён – таксама. Прыйшла ж вясна!

Ніна паставіла дома сумку ў спальні, не дастаючы з яе адзення, паклала на кухонным століку батон, другі з пакетам захапіла з сабой. Яна спяшалася на сустрэчу з малым лебедзем.

Здалёк убачыла, як птушкі тусуюцца на сярэдзіне возера. Пахілілася на гарадскі пляж, дзе на сонцы грэецца жоўценькі пясочак і стаяць разнакаляровыя грыбкі. На беразе напружыла зрок, каб распазнаць у чародцы свайго гадаванца, ды дарэмна: ён стаў аднолькавым з усімі птушкамі. І лебедзь не пазнаў сваю былую карміцельку.

Тады Ніна, не гледзячы на тое, што побач праходжваліся жанчыны і мужчыны з малымі дзяцьмі, пачала клікаць:

– Ідзі, мой міленькі, ідзі, мой добранькі, ідзі, ідзі, ідзі!..

І адзін з лебядзей нібы ўздрыгануўся, вышэй прыўзняў галаву, тут жа адлучыўся ад чародкі і, рамантычна пагойдваючыся на бліскучых хвалях, адліваючы белым апярэннем на сонцы, настырна плыў да берага, на якім стаяла Ніна Лагун …

…Ён пазнаў яе па голасу.

## *Балэбка*

Балэбка са сваёй жонкай Тафіляй жывуць у дзевяціпавярховым доме, на восьмым паверсе, у аднапакаёвай кватэры і ўтрымліваюць двух сабак. Кожны дзень ранкам і падвечар па чарзе яны выводзяць сваіх гадаванцаў на выгул.

З восьмага паверха ўніз Балэбка звычайна едзе з сабакамі ў ліфце, а Тафіля зводзіць іх па лесвіцы. Усім абрыдлі яны ў пад'ездзе.

Аднойчы ў ліфт ўвайшоў мясцовы трэнер па боксу з малым дзіцем на руках. Сабакі, якія знаходзіліся тут, паднялі брэх, а меншы, Бэдзя, увогуле дамагаўся ўкусіць трэнера за

лытку. Як не прыціскаў яго Балэбка нагою ў куток, нічога не атрымлівалася: малы шчэрыў зубы, свірапеў, палохаў дзіця, якое расплакалася і тулілася да бацькі.

– Яшчэ раз будзеш ехаць з сабакамі ў ліфце – размажу па сцяне, – прыгразіў трэнер.

– Ліфт агульны для ўсіх, – запярэчыў Балэбка.

– Адпраўлю ў агульную магілу.

– Падбіраў бы хоць лепшыя словы. Пасаромеўся б пажылога чалавека.

– Заткні пасць!

Большы, аблавухі Нэгус, спакойна сядзеў у кутку, дапытліва пазіраючы то на Балэбку, то на трэнера. Ён адчуваў, што паміж імі дзеецца штосьці нядобрае і гатовы быў у любую хвіліну кінуцца на дапамогу свайму гаспадару.

Неўзабаве дзверы ліфта адчыніліся – і ўсе выйшлі ў калідор, пасля – на вуліцу. Сабакі, удыхнуўшы свежае паветра, у парыве нацягнулі павадкі. Бэдзя паводзіў сябе неспакойна, брахаў на прахожых, кідаўся з боку ў бок, нерваваўся, а Нэгус раўнамерна бег побач.

У Балэбкі і Тафілі розныя методыкі выгула сваіх гадаванцаў. Балэбка звычайна трымае два павадкі ў адной, правай руцэ, а сабакі бягуць збоч; ён спяшаецца за імі, паблісваючы на сонцы двума меднымі дроцікамі, якімі счапіў падашву з наском туфля на правай назе. Тафіля ж, наадварот, у адной руцэ трымае павадок ад Бэдзі, у другой – ад Нэгуса, сама, перавальваючыся з нагі на нагу, як адкормленая хатняя качка, ідзе пасярэдзіне.

Як толькі гаспадары прамінаюць інтэрнат тэхнічнага каледжа, адразу адвязваюць павадкі ад нашэйнікаў і адпускаюць чацвераногіх сяброў на волю. Тут для іх адмысловая раскоша – шырокая лугавіна, пароснлая дзе-нідзе старою альхою, побач цячэ рачулка Віхлянка. Бегай, гуляй, падскоквай, шукай у траве якую-небудзь спажыву – ніхто не перашкаджае. Балэбка і Тафіля не ведалі б ніякіх

турбот і трывог, калі б не адна акалічнасць: уздоўж Віхлянкі пралягае ўсыпаная дробным шлакам і добра ўтрамбаваная дарожка, па якой людзі з паўночна-усходняга мікрараёна, каб спрасціць шлях і не ісці праз горад, шыбуюць на рынак. Па гэтай дарожцы, адпачываючы, таксама часта прагульваюцца пенсіянеры, маці з малымі дзяцьмі ў калясках – і для іх балэбкавыя сабакі як косць у горле. Вечна яны нападаюць, брэшуць, кідаюцца да ног, псуюць настрой. Аблавухі, непаваротлівы, лянівы Нэгус асаблівага энтузіязму не праяўляе: пару разоў гаўкне, ашчэрыцца, пасля прысядзе паблізу ў траве і маўчыць. А вось Будзя суправаджае брэхам пешахода аж да інтэрната, пакуль чалавек не схаваецца за будынкам.

Мужчыны абурана, часам са злосцю у такіх выпадках крычаць:

– Убяры сабак, падонак!

– Убяры сабак, шлюха!

Гаспадары ж усё роўна не шукаюць іншага месца выгула хатніх жывёл, пастаянна імкнуцца сюды і заўсёды адшчапляюць павадкі ад нашэйнікаў. Умоўны рэфлекс выпрацаваўся ці што?..

Праўда, на гэты раз нарваліся на сур'ёзны супраціў. Малады хлопец, з выгляду сціплы, прыгожы, спакойна крочыў уздоўж Віхлянкі – і тут яго апанавалі сабакі. Флегматычны Нэгус адвязаўся хутка, а звяглівы Бэдзя суправаджаў доўга і ўсё наравіў цапнуць маладзёна за калошыну. Той для пачаў шукаць выйсце і убачыў пры скрыні для смецця бліз інтэрната палавіну чырвонай цагліны, падняў яе і з усяго размаху грукнуў у лоб нападальніку. Сабака адразу ўпаў на бок, задрыгаў нагамі, заплюшчыў вочы. Здалёк убачыў жахлівую сцэну Балэбка і подбегам паспяшаўся туды паглядзець, што там здарылася, чаму не варушыцца Бэдзя.

Хлопец таксама паскорыў крок і неўзабаве ўліўся ў

вулічны людскі натоўп. Балэбка ўвішна корпаўся каля сабакі, спадзеючыся яго ажывіць, паставіць на ногі, але Бэдзя і не варухнуўся – цагліна, мусіць, праламала яму чэрап, – і малы зласлівец заснуў вечным сном.

– Усё, – выдыхнуў Балэбка, – няма Бэдзі. Ой, якое мне гора!

Ён прыйшоў дадому і пра ўсё распавёў Тафілі.

– Дурны Пракоп носам у г… гоп! – вылаялася тая. – Чаму ты не абараніў Бэдзю?

– Дурная Вушатка! – агрызнуўся Пракоп. – З цябе і чалавека няма і добрай гаспадыні: то бліны недапечаныя, паўсырыя падаеш на стол, то спаліш іх на чорнае. Як я мог абараніць, калі гэта адбывалася далёка ад мяне. Трахнуў цаглінаў у галаву, а сам уцёк. Паспрабуй дагані.

Пры выкрыку мужам зняважлівых слоў жонка, дзявочае прозвішча якой было Вушатка, звычайна абсядала і моўчкі праглынала зняваргу.

Ачомаўшыся, Тафіля параіла:

– Напішы ў міліцыю. І цяпер. Не адкладвай.

– Канешне, напішу. Такога сабаку забіў…

Пракоп вырваў з вучнёўскага сшытка ліст паперы, узяў аўтаручку і пачаў пісаць: "Спадар начальнік міліцыі, нейкі злачынец забіў майго сабаку Бэдзю. Яго і Нэгуса я вывеў на выгул на бераг Віхлянкі. Гэты хлопец праходзіў збоч, падняў цэглу і трахнуў ёю Бэдзю прама ў галаву. Сабака тут жа сканаў. Нэгус застаўся жыць. Прашу знайсці забойцу і сурова яго пакараць. Сабакі – сэнс майго жыцця".

Пракоп рашыў параіцца наконт тэксту з жонкай і зачытаў ліст Тафілі. Яна ўхваліла допіс і дабавіла:

– Напішы адрас і чысло.

– Я напішу на канверце.

– Канверт згубяць і не будуць ведаць, дзе цябе шукаць.

Пракоп вялікімі літарамі вывеў адрас, чысло, месяц і год, сваё прозвішча, запакаваў пісьмо ў канверт, аднёс на

пошту. "Ну, цяпер яны не выкруцяцца, – думаў Балэбка, ідучы дадому, – вымушаны будуць шукаць забойцу, даць мне адказ, што з ім зрабілі, як пакаралі".

…Праз тыдзень у кватэру завітаў капітан міліцыі. Спачатку ён гаварыў па-добраму, з цікавасцю распытваў пра здарэнне, пра Бэдзю, пасля міліцыянер зрабіў строгі выгляд і зычным голасам прамовіў:

– Вы вінаватыя ва ўсім! Навошта адчапілі ад нашэйнікаў павадкі? Хто вам дазволіў выгульваць сабак у зоне адпачынку?

Балэбка абмяк.

– Хлопец не вінаваты, – працягваў міліцыянер, – ён абараняўся. Сабака першым распачаў канфлікт і амаль не разарваў маладзёну порткі. Дзвесце метраў суправаджаў яго брэхам, нараўіў укусіць, а вы нават не памкнуліся адклікаць назад гэтага самага, як вы кажаце, Бэдзю.

– Я адклікаў…

– Не праўда, абманваеце. За тое, што выгульвалі сабак без павадкоў, дзве базавыя велічыні штрафу і дзве базавыя за тое, што водзіце іх у зону адпачынку. Мы апытвалі прахожых на дарожцы і знайшлі таго хлопца. Усе ў адзін голас заяўлялі, што вашы сабакі ўсім нервы псуюць. І ўвогуле вы распаўсюджваеце сабакаманію у горадзе.

Ракоп адчуў, што ўлез не ў сваё.

– Я табе казала не пішы, – аклікнулася з канапы Тафіля. – Знайшоў з кім звязвацца.

Міліцыянер строга глянуў на яе і працягваў:

– Панашывалі чырвоных, зялёных камізэлек на сабак. Зараз ватоўкі будзеце адзяваць, ежу будзеце ім класць у кішэні. Я прайшоў адзін раз ад цэнтральнага універсама да аўтавакзала і не сустрэў ні адной маці з каляскай. Затое ўбачыў процьму сабак. Дык, што выходзіць сабакі выцясняюць у горадзе дзяцей? Сабакаманія набірае абароты? Запашкудзілі ўсе газоны каля тратуараў. Дворнікі не паспяваюць адмываць граблі, мяняць венікі.

Пракоп з Тафіляй сцішыліся, не пярэчылі, чакалі, пакуль службовец не выплюсне на іх усю злосць.

– На гэтым тыдні каб заплацілі штраф, – закругліўся міліцыянер, паклаў на стол нейкую паперыну і пакіраваўся да выхаду, плаўна зачыніў за сабою дзверы.

– Дастукаліся, – з жалем прамовіла Тафіля.

– Дык ты ж мяне падбіла на пісаніну, – папракнуў жонку Пракоп. – Цяпер давай дзве базавыя велічыні са свае пенсіі і дзве адшчаплю я. Трэба ж разлічвацца, а інакш забяруць грошы ў прымусовым парадку.

...Застаўшыся без Бэдзі, Нэгус па начах сумаваў, тужліва скуголіў, скавытаў, не даваў спаць жыльцам пад'езда. Абураныя, яны настырна грукалі кулакамі ў дзверы, моцна выкрыквалі:

– Закрый сабаку пасць!!!

Знерваваны Балэбка не ведаў, як быць, што рабіць, пасля пайшоў на крайнасць: раніцай удосталь накарміў Нэгуса мясам, ласкава пагладзіў яго па галаве, выпусціў без павадка і нашэйніка на двор, а сам вярнуўся ў сваю кватэру.

Нэгус, уволю нагуляўшыся ў мікрараёне, прагаладаўшыся, падбягаў да пад'езда, заядла царапаў лапамі дзверы, скуголіў, але ніхто яму не адчыняў, а калі хто і выходзіў з калідора, адганяў бедалагу прэч.

Балэбка з Тафіляю ад пераж ывання замкнуліся ў кватэры, з тыдзень не паказваліся на людзі, не з'яўляліся на вуліцы – і на аднаго бадзячага сабаку ў горадзе стала больш.

*2017*

# Зняверaны

Галіна Бібіч раней гандлявала ў прадуктовым магазіне, які размешчаны непадалёку ад аўтавакзала. Тут заўсёды кішэлі пакупнікі. Адны ехалі ў вёску да старых бацькоў і стараліся набыць для іх хлеба, каўбасы, сыра ці яшчэ чаго з

прадуктаў. Іншыя імкнуліся прыхапіць што-небудзь з прысмакаў, каб перакусіць у дарозе. Людзі звычайна спяшаліся, баяліся спазніцца на рэйсавы аўтобус, і ніколі не лічылі рэшту, не бралі адрыўных чэкаў. А Галіна на гэтым спекулявала – і за месяц для яе, акрамя зарплаты, набягаў неблагі навар.

Аднак, такая прыхамаць цягнулася не доўга. Аднойчы яна аблічыла старога пенсіянера: на чэку, які ўкінула ў яго карзінку, кошт прадуктаў выбіла правільна, а плаціць за іх сказала на тры рублі больш. "От, стары, сляпы, глухі, – падумала яна, – што ён там убачыць на тым чэку. А мажліва і зусім не будзе браць яго, пакіне ў карзіне, як гэта робяць многія пакупнікі". Але нарвалася не на таго. Ветэран дастаў з кішэні акуляры і зверыў узятую з яго суму з тою, якая была выбіта на чэку, – яна разнілася. Стары падняў шум і пайшоў да дырэктара магазіна, пра ўсё расказаў і рэзка заявіў:

– Калі вы не звольніце яе з работы, я пайду да раённай улады.

Той расхваляваўся, пабаяўся за сваю скуру: паабяцаў, што разбярэцца, а праз некаторы час звольніў Бібіч з працы.

На першых парах Галіна расстроілася, упала ў роспач, аднак неўзабаве ўзяла сябе ў рукі. Дастала з шафы пук грошаў, палічыла і прыкінула, што іх дастаткова для таго, каб устанавіць гандлёвы ларок на шматлюдным аўтобусным прыпынку, дзе заробак будзе не горшы. Яна крута ўзялася за справу і хацела падключыць да прадпрымальніцтва свайго мужа Віталя Цыбульку. Але той наадрэз адмовіўся:

– Круціся ў гэтым смецці адна. У мяне не ляжыць душа да гандлю. Ён нават праціўны мне.

Галіна са спрытам кошкі накінулася на Цыбульку і вострымі кіпцюрамі пракалола на яго твары чатыры чырвоныя каснікі ад вачэй да барады. Кроў, як бярозавы сок вясною, шпарка пацякла ўніз, закапала на падлогу. Другі б мужчына на яго месцы даў бы ёй кулаком у сківіцу, а Віталь

спакойна пайшоў у ванную, змыў кроў з твару і прыпёк раны адэкалонам.

Галіна і раней пры канфліктных сітуацыях не раз баразніла шчокі Цыбульку, а ён яе ніколі не чапаў. Мужчыны з пад'езда на двары кпілі над ім:

– От пакалаціў бы ты калі яе, як жывёліну, кінула б свае звычкі.

А ён адказваў:

– Нельга. Гэта супрацьпаказана, Богам забаронена біць жанчыну.

Ну, а яна і карысталася яго безабароннасцю. Праўда іншы раз ён папракаў яе:

– Не дарэмна ў цябе такое прозвішча – Бібіч. Раздзялі па складах і атрымаецца: бі, біч. А яна з гэтага толькі смяялася.

Галіна і Віталь былі зусім розныя людзі. Яна ўсё жыццё клапацілася аб матэрыяльным нажытку, аб грашах, а ён найбольш дбаў аб сваім духоўным сундуку. З-за гэтага найчасцей паміж імі і ўзнікалі сваркі.

У апошні час, калі Галіна узяла ларок на аўтобусным прыпынку, супярэчнасці паміж жонкай і мужам набылі больш крутыя абароты. Віталю нічога не заставалася, як уцякаць ад яе чым далей. Ён на веласіпеде пачаў ездзіць па вёсках з намерам купіць дзе-нібудзь хоць якую занядбаную хаціну, абы не жыць пад адным дахам з Бібічыхаю.

У Гарнях, каля крамы, мужчыны не абрадавалі Цыбульку:

– У нас, калі хто і будзе прадаваць свой дом, то мала не запросіць. Сам ведаеш, блізка ад горада. А судзячы па тваёй вопратцы і старым веласіпедзе, у цябе вялікіх грошай няма.

– Мне каб за якую тысячу долараў…

– Жартуеш, брат. А за дваццаць не хочаш?

– Ды вы што?!

– Во табе і што. А ты думаў…

Цыбулька апусціў галаву і задумаўся.

–Ну, а ў Даліне? Там, можа, танней прададуць?

–Тое самае, калі яшчэ не даражэй. Даліна ж амаль злучаецца з Лідай. Шукай дзе-небудзь далей ад горада.

І Цыбулька на сваім драндулеце паехаў аж у Цецяракі – за дзесяць кіламетраў ад Ліды. Як толькі ён уехаў у вёску, у пачатку вуліцы сустрэў толькі аднаго маленькага дохлага сабачку, які з-за густой поўсці вакол вачэй мала што бачыў перад сабою і не брахаў на праезджага. Пуставалі і двары.

Цыбулька злез з веласіпеда і, не спяшаючыся, прыглядваючыся да хатаў, крочыў далей. На сярэдзіне вёскі ён убачыў дзвюх жанчын, якія стаялі бліз веснічкаў і аб чымсьці гаманілі. Цыбулька наблізіўся да іх, прывітаўся і запытаў:

–Можа хто ў вас, прынамсі, прадае хату?

Жанчыны пераглянуліся, нібы што ўспамінаючы, прыгледзеліся да незнаёмца.

–Табе дарагую ці танную?

–Мне каб чым найтанней, на аднаго чалавека.

–Навошта табе ўвогуле купляць? – загаварыла старэйшая. – Вунь за крамай, цераз адзін дом, стаіць нічыйная хатка. У ёй жыў стары бабыль, але ён ужо даўно памёр, а нашчадкаў і сваякоў у яго ніякіх няма. Хатка пустуе, ідзі і жыві.

– Клаўдзя, а давай мы яго падвядзем туды і пакажам гэтую хатку, – прапанавала маладзейшая.

Траіх, па-вясковаму гучна размаўляючы, яны пакрочылі ў згаданым накірунку. Як толькі наблізіліся да бабылёвай хаткі, Цыбулькі адразу прыкмеціў, што яна занадта занядбаная: падгнілі акяніцы, шашаль нарабіў дзюрак у сценах, якія пасівелі ад часу, на дзвярах не вісеў замок.

У сярэдзіне таксама было не лепш: па кутках шарэла павуцінне, пажаўцела столь, аблезлі ад пабелкі сцены, на падлозе віднеліся брудныя адбіткі ад слядоў мужчынскіх

ботаў. Не рай, канечне, аднак Цыбулька гатовы быў жыць хоць у сабачай будзе, абы не разам з Галінай.

З размовы Віталь даведаўся, што маладзейшую зваць Каця.

– Сюды вясковыя п'яніцы, – прамовіла яна, – прыходзяць выпіваць. Для іх тут забягалаўка. Добра, што і крама блізка. Зручна і ніхто іх не праганяе адсюль.

– А жонкі?

– Не чапаюць. Махнулі рукамі.

– Але мужыкі і да мяне будуць чапіцца, каб выпіваў разам з імі. А я не люблю піць і не ўмею.

– Навучаць …

– Дымам смярдзіць надта, – прамовіў Цыбулька.

– Бо ўчора былі і накурылі.

Клаўдзя пацікавілася:

– Вы, мусіць, бацюшкам працавалі? Барада такая, як ў бацюшкі і прычоска.

– Не, я толькі спяваю ў царкоўным хоры. А раней кіраваў народным ансамблем песні і танца на абутковай фабрыцы.

– Ой, як добра! – усхвалявана прамовіла Каця. – Каб вы нас навучылі спяваць святыя песні.

– З вялікай ахвотай, – адказаў Цыбулька, – абы ў вас на гэта было жаданне.

– Жаданне ёсць.

– Тады ўсё наладзім.

Падвечар Цыбулька паехаў у Ліду. Новых клопатаў у яго назбіралася шмат. Галіне ж пра знаходку жытла нічога не сказаў: баяўся, што падніме вэрхал. Пакуль заснуў, усё думаў пра Цецярукі, пра тых дзвюх жанчын, якія нарадзілі яму пасяліцца ў бабылёвай хатцы.

А раніцою, як толькі жонка пайшла ў свой ларок, Цыбулька ўзяўся за справу: купіў навясны замок, новыя пасцельныя прыналежнасці, сёе-тое з прадуктаў. Усё

ўпакаваў у шырокія цалафанавыя мяшкі, узгрувасціў на веласіпед і паехаў у Цецярукі.

Ехаць было не вельмі зручна, і Цыбулька злез з веласіпеда і павёў яго ў руках. У дарозе ён акідваў позіркам прыгожыя сельскія пейзажы, недалёкі лес, хутары пры ім. Пагода стаяла ціхая, ясная, на небе толькі дзе-нідзе трымаліся белыя, пёрыстыя аблачынкі. Прыпякала. Хацелася як мага хутчэй дабрацца да Цецярукоў, але з грузам не паспяшыш.

...Як здзівіўся Цыбулька, калі ўбачыў на сваім падворку ажыўленую мітусню жанчын. Яны мылі, адшароўвалі лавы, стол, слончык, ложка, іконы. Ад радасці ён хацеў заплакаць: якую прыхільнасць да яго лёсу праявілі вяскоўцы!

– Наводзім парадак, – прамовіла Каця.

– Я сёння і сам хацеў гэтым заняцца.

– Мы зробім не горш за цябе. Патрэбна, каб да ўсяго прыклалася жаночая рука.

Цыбулька, задаволены, прытуліў да сцяны веласіпед і сам ўключыўся ў работу: цягаў з суседняга калодзежа ваду, апалосквал стол, лавы. Пасля ўсе разам пабялілі ў хатцы столь, сцены. Падлогу вымылі ў апошнюю чаргу.

Пад цёплым ветрыкам і ласкаючым сонцам на падворку бабылёвае багацце хутка высахла – і ўсё пазаносілі ў сярэдзіну. На іконы навесілі прыгожы, з вышыўкамі саматканы ручнік, на вокны цюль, на ложка паклалі новы цюфяк, які навасёл прывёз з горада. Падушку адзелі ў белую, свежую навалачку. Агледзеліся жанчыны з Цыбулькам вакол сябе і здзівіліся: хатка засвяцілася, як святліца. І твары ў людзей пахарашэлі, сталі ўсцешанымі. Здатна лілася размова і нікому не хацелася разыходзіцца.

– Калі будзем рэпеціравацца? – запытала Каця.

– Прыходзьце хоць заўтра, падвечар.

– Ой, як добра!

А вечарам таго ж дня пад свежы пах пабелкі з хатку ўварваліся тры мужчыны. Яны ўжо ад некага даведаліся, што тут пасяліўся новы чалавек і захацелі з ім пазнаёміцца, уцягнуць у сваю кампанію.

– Прыйшлі павіншаваць цябе з наваселлем, – прамовіў самы малы з іх Вінцуська.

– Ды я не ведаю ці доўга тут затрымаюся. Як падкажа жыццё.

– У нас людзі добрыя, не пакрыўдзяць. Пабудзеш – нікуды не захочацца ад'язджаць.

– Пабачым…

Мужчыны паставілі на стол тры бутэлькі "чарніла", паклалі некалькі кавалачкаў хлеба, булачку. Разлілі па шклянках віно і звярнуліся да Цыбулькі:

– За тваё наваселле.

– Я не п'ю, – адказаў ён.

– Ну за знаёмства. Нельга ж у такім выпадку адмаўляцца.

– Мне ўрачы забаранілі.

– Прыгубі хоць кроплю за кампанію. Не слухаў ты гэтых урачоў. Яны ўсім забараняюць. А самы п'юць.

Цыбулька, крывячыся, з напарстак выпіў. Неўзабаве мужчыны захмялелі і распачалі гарачыя спрэчкі, але не пра палітыку і пра рост цэн, а пра вясковых сабак і коней. Вінцуська даказваў, што самы злосны сабака ў Цыпрука. Той, калі не навязаны, дык аж вароты грызе, каб вырвацца з падворка і пакусаць каго-небудзь. Шурка запярэчыў:

– Зласнейшага сабакі, чым у Кабачкі, ні ў кога няма. Яму цераз заднія ногі пераехала машына, дык ён зараз ашчэрыўшыся, паўзе толькі на пярэдніх і імкнецца ўгрысці прахожага за лытку.

– А вазьмі коней, – уставіў слова Паўлюта. – Я лічу, што кожны конь падобны на свайго гаспадара.

– І не скажы, – не пагадзіўся Шурка. – Вунь Цівунчык

які спакойны чалавек, а конь у яго, як звер, нярвовы, палахлівы. Колькі ён ужо аглобляў паламаў, парваў хамутоў. А Катрач злосны, крыклівы, бандыцкага складу, а конь у яго лагодны, пакладзісты. Так што не твая праўда.

…У суботу, а сёмай гадзіне прыйшлі на першую рэпітыцыю жанчыны. Паселі на лавы за сталом, накрытым белым абрусам. Цыбулька стаяў перад імі, запяваў і дырыжыраваў рукамі. Спачатку спявалі тыя святочныя песні, якія ўсе добра ведалі, пасля развучвалі новыя. І так усё хораша ў іх атрымлівалася, так лёгка, зладжана, нібы яны рэпітыруюцца ўжо даўно. На развітанне Клаўдзя сказала:

– Нарэшце прыйшла радасць і ў нашу вёску. Добра нам тут, утульна, сум сплыў.

Паступова круг жанчын шырыўся, заглядвалі ў хатку і мужчыны. Хто меў добры голас, спяваў, іншыя проста сядзелі і слухалі.

Неяк Цыбулька сустрэў на вуліцы Паўлюту і спытаў:

– Чаму не заглядваеш да нас, спадар Паўлюта?

– Сорамна неяк, ведаеш.  У вас святое месца, а мы…

– Ды не выпіваць жа, а песні спяваць.

– Пагавару з Вінцуськам і Шуркам. Можа калі і прыйдзем. У іх то добрыя галасы, а ў мяне слабы.

– Нічога, будзеш падцягваць.

… Пакуль Цыбулька ў Цецяруках весяліў людзей і сам весяліўся, па пад'ездзе яго дома ў Лідзе папаўзлі плёткі: быццам бы ад Бібічыхі ўцёк муж. Ужо нават і ў яе самой пыталіся:

– А дзе ж гэта твой Віталь? Нешта не бачна яго…

– Паехаў у Маскву на заробкі, – казала яна. – Можа хутка вернецца.

Але ніхто гэтаму не верыў, а найбольш ядавітыя пляткаркі ўкрадкай за яе спіною пасміхваліся. Гэта злавала

Галіну – і яна падала заяву ў аддзел унутраных спраў на пошукі мужа. Адтуль каманда паступіла ва ўсе міліцэйскія пункты, і неўзабаве ў Цецярукі прыехаў на матацыкле малады фанабэрысты ўпаўнаважаны. Ён сустрэў на вуліцы пажылога, сівога дзядзьку, які вёў на валаводзе карову на пашу, і спытаў:

– Ці пражывае ў вашай вёсцы які-небудзь новы чалавек?

– Вось тут адзін жыве, – адказаў стары і паказаў рукою на бабылёву хату. – Але ён ніякай шкоды не робіць. Святыя песні спявае з бабамі.

– Гэта мя яшчэ паглядзім, як ён спявае.

Упаўнаважаны падруліў матацыкл да плоту, заглушыў і сам пайшоў на падворак. Убачыў на дзвярах замок і асёкся: "Уцёк. Не я ўсё роўна буду каравуліць, пакуль не вернецца. Трэба ж выконваць загад начальства".

Міліцыянт пачаў праходжвацца сюды-туды па падворку, заглядваючы ва ўсе куткі прыбудовак.

Праз паўгадзіны з'явіўся і сам Цыбулька, насцярожыўся: "Што яго прынясло сюды? У чым я правініўся?"

– Вашы дакументы? – адразу патрабаваў упаўнаважаны.

Цыбулька спакойна пасунуў руку ва ўнутраны кішэнь пінжака, дастаў пашпарт і падаў міліцыянту.

– Ага!.. Цыбулька Віталь Сяргеевіч. Той самы, каго я шукаю.

– А ў чым справа?

– Паедзем у Ліду і там будзем разбірацца.

Абодва поруч пайшлі да матацыкла, адзелі шлемы, паселі і па палявой дарозе, пакідаючы за плячыма шэрыя пасмы пылу, паехалі ў горад. У аддзеле ўнутраных спраў дзяжурны міліцыянт найперш пазваніў па мабільніку Галіне і сказаў:

– Прыходзьце і забірайце сваю прапажу.

Пасля звярнуўся да Цыбулькі:

– А вас, паважаны Віталь Сяргеевіч, прыйдзецца аштрафаваць.

– За што?

– Вы больш як два месяцы жывіце ў Цецяруках без прапіскі.

– Страх невялікі.

– Што?!

– Я кажу, што штраф заплачу. Грошы ў мяне ёсць.

– Не спрабуй з намі жартаваць.

– Я не жартую, сур'ёзна кажу: грошы маю.

– Ты вось што, – працягваў міліцыянт, – разбірайся са сваёй жонкай, як хочаш, але дзе не будзеш жыць абавязкова павінен прыпісацца. Бо на выпадак вайны, дзе мы цябе будзем шукаць?

– Я ўжо стары ваяваць.

– Нічога, аўтамат Калашнікава ўтрымаеш. Вунь дзед Талаш які быў стары, а колькі немцаў упаляваў.

– Слабы з мяне паляўнічы…

– Выпішы яму штраф на тры базавыя велічыні, – звярнуўся дзяжурны міліцыянт да напарніка, які сядзеў побач.

– На такую суму?! – устрывожыўся Цыбулька. – Пашкадавалі б хоць мяне як пенсіянера.

– Будзеш выступаць, яшчэ прыбавім столькі.

– Цяпер плаціць ці пасля?

– Аплаціце цераз банк. Там наш рахунак указаны.

Ледзь паспеў Цыбулька пакласці паперку ў кішэнь, як у прыхожую перад дзяжуркай увайшла Галіна. Яна наблізілася да акенца, павіталася з міліцыянтамі, падзякавала за находку і спытала:

– Можна забіраць?

– Забірайце.

Галіна злёгку тузанула Цыбульку за рукаво, і яны

выйшлі з будынка на вуліцу. Ідучы дадому, жонка моцна дакарала Віталя за самавольную адлучку:

– Не патрэбна было так рабіць. Увесь пад'езд з мяне смяецца: ўсё дзе твой муж, ды дзе твой муж. Я сказала, што ты паехаў у Маскву на заробкі. І ты падцвердзі гэта, калі спытаюць. Можа заткнуцца. Я больш не буду цябе абдзіраць. Жыві ў Лідзе.

– Ты ўжо многа разоў абяцала не пускаць кіпцюры ў ход, – загарачыўся Цыбулька, – а свае звярынай звычкі ўсё роўна не кідаеш. Гэта ў цябе хранічная хвароба. Я ўжо не веру ні аднаму твайму слову. Зняверыўся ў табе. Разумееш? От дзень-два пажыву тут, а пасля зноў паеду ў Цецярукі. Прыпішуся і буду там жыць, пакуль не памру.

Праз тры дні ён ўцёк і дзякаваў Богу, што зноў прыдбаў душэўны спакой і раўнавагу. Аднак, рай трываў не доўга: у Цецярукі на легкавушцы прыехалі Галіна з двума сваімі братамі. Яны вывалаклі Цыбульку з хаткі, упакавалі ў машыну, прывезлі дамоў і прыгразілі:

– Яшчэ раз уцячэш у вёску – мала табе не пакажацца.

Такая пагроза яго не вельмі напалохала. Супакойвала толькі тое, што Галіна пакуль трымала свае кіпцюры пры сабе. Але пад восень яна зноў дала ім волю, і твар Цыбулькі "упрыгожылі" новыя, яшчэ больш глыбокія пісакі. Цыбулька першы раз у жыцці мацюкнуўся, асядлаў веласіпед і па знаёмай дарозе зноў пакіраваў у Цецярукі.

Параўняўшыся з дваром, дзе стаяла бабылёва хатка, ён толькі войкнуў: ад яе застаўся толькі адзін падмурак. Спытаць не было ў каго, што здарылася. І ён заглянуў у краму. Прадаўшчыца сказала:

– Старшыня СВК Шула загадаў знясці бабылёву хатку, парэзаць на дровы і спаліць, каб у ёй не збіраліся п'яніцы…

Абураны нагрувашчаннем такіх дрэнных падзей, Цыбулька зноў пакруціў педалі свайго старэнькага драндулета ў бок Ліды.

*2017*

# На залатой планеце

*Фантастычная аповесць для дзяцей*

## *Сустрэча з іншапланяцянамі*

Пяцікласнікі Жэнька і Алесік выправіліся ў лес па ягады, прыхапілі з сабою рэчмяшкі, два літровыя слоікі, фарфоравыя размаляваныя кубкі. На ўскрайку лесу ўбачлі шмат чырвоных паземак і пачалі іх збіраць. Ужо набралі амаль па палавіне кубкаў, як пачулі нейкі незразумелы шум-гул. З-за магутных соснаў вынырнула лятаючая талерка і села на полі ўпоравень з хлопчыкамі. З яе выйшлі тры касманаўты, наблізіліся да Алесіка і Жэнькі. Гэта былі іншапланяцяне, адзетыя ў спецыяльную вопратку. Нічога грознага яны сабой не ўяўлялі. Чыстыя, усмешлівыя твары, разумныя, уважлівыя вочы.

– Ягады збіраеце? – спытаў самы высокі з іх.

– Ага.

– Пакаштаваць можна?

– Калі ласка.

– Салодкія, – заўважыў іншапланецянін, – але малыя. У нас паземкі, як курынае яйко.

Жэнька хацеў спытаць, дзе гэта ў вас, але пабаяўся.

– Ну, а цяпер паедзем, адведаем нашых ягадаў.

Хлопчыкі насцярожыліся:

– Бацькі падумаюць, куды мы прапалі, упадуць у роспач, будуць шукаць па лесе.

– Вы ім патэлефануеце па мабільніках.

– У нас няма мабільнікаў.

–Мы вам падорым.

Малыя зразумелі, што такім дзядзькам супраціўляцца марна, і разам з іншапланяцянамі залезлі ў лятаючую талерку.

–Пазвоніце, як адляцім ад Зямлі на трыста тысяч кіламетраў, – прамовіў усё той жа высокі і даў кожнаму па мабільніку, зусім не падобнаму на нашы.

Лятаючая талерка ўзмыла ў неба і з неверагоднай хуткасцю ўвайшла ў касмічную прастору.

– Можаце звязвацца з бацькамі. Скажыце, што доўга не будзеце.

Першым патэлефанаваў Жэнька.

– Тата, мы з Алесікам у космасе.

– Як у космасе?! О, Божа! Куды вы ляціце?

– Не ведаю… На нейкую загадкавую планету. Пазваню пазней. Іншапланяцяне падарылі нам мабільнікі, з дапамогай якіх можна звязацца з вамі за мільёны кіламетраў.

– О, Божа! Што я скажу маці?!

– Скажы, што з намі нічога дрэннага не здарыцца. Хутка вернемся.

Прыкладна, такая ж размова адбылася ў Алесіка са сваімі бацькамі. Колькі ляцелі ў космасе – хлопчыкі не ведалі, бо пайшло зусім іншае вымярэнне часу. Нарэшце, лятаючая талерка села ў вызначаным месцы. Першымі з яе выйшлі Жэнька і Алесік, за імі – іншапланяцяне.

–Вось тут будзе ваша стаянка.

Юныя зямляне агледзеліся. Злева – лес. Дрэвы ў ім такія тоўстыя, што трыццаць чалавек не абдымуць аднаго ствала. Голле звісае да самай зямлі, лісце, як дзве сшытыя коўдры. Справа, непадалёку, срэбранымі

хвалямі пеніцца мора.

– Не хвалюйцеся. Наша планета называецца Залатая, і ядуць на ёй усё падрад: ягады, сырыя грыбы, лісце, кветкі, траву, плады дрэў. Вада ў моры прэсная.

– Але ж нас звяры разарвуць. Нідзе ніякага сховішча, – не ўтрымаўся Жэнька.

– Ніхто вас не зачэпіць. Будзеце жыць спакойна.

– А спаць дзе? Ні доміка, ні шалаша…

– Спаць пад адкрытым небам.

Іншапланяцяне сарвалі некалькі вялізарных лісцяў, паслалі па зямлі. Два лісты скруцілі і параілі малым:

– Гэты скрутак пакладзіце сабе пад галаву замест падушкі. Адным лістом будзеце накрывацца. Калі пойдзе дождж, можаце нацягнуць на сябе два ці тры лісты. Яны не прамакаюць.

– Не замерзнем?

– У нас халадоў не бывае. Круглы год лета. Нашу планету абагравае зусім іншае сонца. Размяшчайцеся і адчувайце сябе, як на Зямлі.  Нам пара адлятаць. Да сустрэчы.

## *Арол і бегемот*

Як толькі лятаючая талерка знікла з поля зроку, хлопчыкі пачулі далёкі, рэзкі свіст, накшалт такога, калі над галавою ляцяць лебедзі. А неўзабаве ўбачылі і самую птушку. Гэта быў вялізны арол. Размах крылаў у яго дасягаў сарака метраў.

– Хавайся! – крыкнуў Жэнька і першым залез пад шырокі, гібкі ліст. Следам шмыгнуў Алесік.

Арол праляцеў над морам, апісаў круг і вярнуўся

назад. Алесік крыху высунуў з-пад ліста галаву, каб лепш разглядзець крылатага драпежніка.

–Не вылазь, – прашаптаў Женька. – Убачыць арол – дваіх панясе ў неба. – А сам краем вока ўсё жназіраў за птушкай.

У гэты час з мора вылез бегемот. Арол рэзка кінуўся на яго, запусціў ў спіну доўгія, вострыя кіпцюры і падняў жывёліну ў паветра. На ўсю сілу бегемот выкручваўся, перабіраў нагамі, матаў галавою. Нарэшце, рэзка крутануў дужым, цяжкім тулавам і вырваўся з кіпцюроў драпежніка, грузка бухнуўся ў мора. Хвалі крутымі коламі разбегліся ва ўсе бакі. Малыя падумалі, што з мірнай жывёлінай сталася нешта нядобрае. Але не. Неўзабаве бегемот вынырнуў з вады, паглядзеў угору: арла ўжо не было.

–Вось нам і першы сюрпрыз, - прамовіў Алесік. – Іншапланяцянін суцяшаў: ніхто вас не зачэпіць… А вылязлі б мы з-пад ліста – было б тое самае, што і з бегемотам.

### *Сіненькія кветачкі*

–Нам трэба даследваць гэтую мясцовасць, – прапанаваў Жэнька.

Хлопчыкі закінулі за плечы рэчмяшкі і пакрочылі ўбок ад свае стаянкі. Хутка ўбачылі, як угору б'е срэбраны фантан. Падышлі бліжэй і адчулі, што з нетраў зямлі выбіваецца сапраўдны кіпяток.

–Эх, каб заварыць чаю, – прамовіў Алесік. – Так захацелася піць…

–А як ты да фантана падступішся, ашпарыць, – насцярожыўся Жэнька.

– А ты паглядзі: ад фантана цячэ гарачы ручай. Мы з яго і набярэм вады.

Над ручаём і морам у тым месцы, куды ён упадаў, злёгку паднімалася белая пара. Хлопчыкі дасталі з рэчмяшкоў фарфоравыя кубкі і зачарпнулі.

– Але што заварыць? – задумаўся Алесік. – Чаю ж у нас няма.

– Давай нарвём гэтых сіненькіх кветачак. Можа не атруцімся, – прапанаваў Жэнька. Яны нарвалі і ўкінулі ў кіпяток. Далі заварцы астыць, пасля па кроплі адпілі.

– Во смаката! – узрадаваўся Алесік, – наш зямны чай не дакажа да гэтага.

Пакрысе яны апаражнілі кубкі і адразу адчулі, як прыбывае энергія, мацнеюць мускулы.

– Цяпер бы з кім падужацца, – закарцела Жэньку. – Я яго ўраз расклаў бы на лапаткі.

– А ты захавай сваю сілу на будучае. Яшчэ спатрэбіцца.

Сябры пайшлі ўздоўж ручая, пасля пераскочылі цераз яго, пашыбавалі берагам мора. Неўзабаве натрапілі на мноства залатых камянёў, валуноў, дробных, круглых шарыкаў. Абмацвалі іх рукамі, радаваліся.

– Даставіць бы іх на Зямлю, – уздыхнуў Алесік, – усё чалавецтва пабагацела б.

– А як? – задумаўся Жэнька. – Можа нам іншапланяцяне дапамогуць?

– Папросім…

Алесік падсунуў рукі пад ніз вялізнага каменя і падняў яго над галавой. Жэнька зрушыў з месца валун.

– Ну і сіненькія кветачкі, пацяшаліся малыя. – Колькі прыдалі сілы!

## *Капітан Зайцава Вуха*

Мора буйнымі хвалямі набягала на жоўценькі пясочак, лашчыла слых. Хлопчыкі спадзяваліся ўбачыць у вадзе якія-небудзь дробныя рыбкі ці кіта… Не ўдалося.

З-за гарызонта паказаўся карабель. Ён падплываў усё бліжэй і бліжэй і неўзабаве пакіраваў уздоўж берага, спыніўся якраз насупраць малых. Даўжыня судна была не менш кіламетра, а шырыня каля трохсот метраў.

На палубу выйшлі маракі. Усе яны былі рослыя магутныя. Самы высокі з іх, напэўна, капітан дасягаў пятнаццаці метраў. Фуражка на ім нагадвала кола ад грузавой аўтамашыны.

– Што там за двуногія мурашкі ходзяць па беразе? – спытаў ён у марака, які стаяў побач.

– Гэта не мурашкі, а дзеці. Яны прыляцелі з Зямлі. Я пазнаў іх па гамонцы.

– Даставіць малых на карабель. Бяры шлюпку і плыві. Марак па канапе спусціўся ўніз, сеў у шлюпку і, заграбаючы вёсламі, кіраваў да берага. Жэнька і Алесік кінуліся наўцёкі.

– Пастойце! – закрычаў марак. – Я ваш зямляк, Беларус. Не бойцеся!

Хлопчыкі спыніліся. Марак сцягнуў шлюпку на пясок і наблізіўся да землян.

– Адкуль вы? – спытаў ён.

– З Беларусі.

– А канкрэтна?

– З Ліды.

– А я з Навагрудка.

– Як вы, дзядзечка, трапілі сюды?

– Мяне іншапланяцяне прывезлі на лятаючай талерцы трыста гадоў таму. Я тады таксама быў маленькі, а цяпер, бачыце, які высокі. Завіце мяне проста Беларусам. Капітан Зайцава Вуха хоча, каб вы прыбылі на карабель.

– А што ў капітана прозвішча Зайцава Вуха? – спыталі.

– Не, гэта мянушка. Я яму такую даў. Паглядзіце, якія ў яго вялікія вушы, большыя, чым у зайца. А прозвішча яго складаецца з трыццаці літараў. Сам не вымавіць і я не вымаўлю.

Падплылі да карабля. Па канаце ўсе трое ўзабраліся на палубу. Капітан усміхнуўся з іх малога росту, сагнуўся ў дугу, падаў кожнаму руку.

– Па раніцах будзеце чысціць мой абутак, – загадаў ён. Хлопчыкі зірнулі на яго мятровыя туфлі і жахнуліся. Але выгляду не паказалі. Свой абавязак штодзённа выконвалі акуратна. Пасля Жэнька кажа:

– Што мы рабы ў яго, ці што? Давай уцячэм.

– А як? Гэта ж не проста.

– Папросім у Беларуса, няхай дапаможа.

Сябры пайшлі па каютах шукаць Беларуса. Знайшлі ў 101-ым нумары.

– Дзядзечка, – прамовіў Алесік, – мы не хочам тут быць. Нам трэба даследваць Залатую планету. Высадзі нас на бераг.

– Добра, – пагадзіўся Беларус. – Гэта зробім ноччу. Зайцава Вуха спіць так моцна, што хоць з гарматы страляй над галавою – не разбудзіш. Пабег адбыўся

ўдалым. Назаўтра капітан падняў шум:

–Дзе гэтыя малыя мурашкі?! Чаму не пачысцілі туфлі?

–У іх рэчмяшках былі штучныя крылы на акамулятарах, – апраўдваўся Беларус, – вось зямляне і паляцелі на іх у невядомым накірунку.

Капітан Зайцава Вуха са злосцю сплюнуў за борт карабля каструлю сліны і супакоіўся.

### *Крылаты чалавек*

Апоўдні Жэнька і Алесік зноў пачулі свіст крыл, але ўжо не такі моцны, як тады, калі ляцеў арол, а больш сцішаны. Сябры залезлі пад авальны ліст, стаіліся. Хутка побач нешта села.

–Вылазьце, – пачулі яны чалавечы голас – я ведаю, што вы тут.

–Што рабіць? – зашапталіся малыя.

–Прыйдзецца вылазіць. Інакш ён сілком выцягне нас адсюль.

Хлопчыкі вылезлі. Перад імі стаяў чалавек высокага росту ў нейкай доўгай каляровай камізэльцы. Тулава з бакоў здатна аблягалі шырокія, цёмна-зялёныя крылы. З-пад іх праглядваліся кісці рук. Крылы таксама тырчэлі ў два бакі ад каленяў да ступеняў ног.

–Я буду апекавацца над вамі, – загаварыў незнаёмец. – Зваць мяне Рут. Прыляцеў пацікавіцца, як жывеце, што хвалюе, непакоіць.

–Усё добра.

–Чым харчуецеся?

–Паземкамі. Адной ягады можна наесціся.

–Вядома ж . Нічога не баіцеся?

–Арол напалохаў.

–Дык вось ведайце: на нашай планеце акрамя арла няма ніякіх драпежнікаў. Усе жывёлы і птушкі мірныя. Тут не сустрэнеце ні гадзюкаў, ні ўдаваў, ні вужоў. Спакойна і ўпэўнена адчувайце сябе. Чым будзеце займацца сёння?

–Вывучаць мясцовасць.

–Я хачу павадзіць вас па лесе, пазнаёміць з прыродай. Згодны?

–З вялікай радасцю.

Усе трое рушылі ў дарогу. Малых усё вельмі моцна ўражвала, займала.

–Што гэта за плады на дрэвах справа? – пацікавіўся Жэнька.

–Абакуры.

–А з левага боку?

–Абадоры. Наперадзе, паглядзіце, красуюцца прыгожыя чырвоныя плады накшалт вашых яблыкаў – гэта курамякі.

–Іх можна есці?

–Канешне. Яны вельмі смачныя і спажыўныя.

–Дзядзечка, а якія жывёлы водзяцца ў гэтым лесе? – запытаў Алесік.

–Паласатыя бурамуры, рыжыя барамолы. Усякія ёсць. Яны на людзей не нападаюць. Паўдня хадзілі малыя з дзядзькам Рутам, які вельмі здатна пра ўсё апавядаў. Па дарозе дадому назбіралі шмат абадораў, абакураў, курмякаў. На стаянцы крыху пастаялі, пагаманілі пра жыццё на Зямлі, на Залатой планеце. Пасля Рут запытаў:

–Бацькам тэлефанавалі?

– Не.

– Ну во. Тыя недзе перажываюць, трывожацца, а вы і голасу не падаеце. Зараз жа званіце.

Жэнька і Алесік дасталі з кішэняў мабільнікі, трошкі разышліся ў розныя бакі, каб не перашкаджаць адзін другому, набралі нумары дамашніх тэлефонаў. Праз некалькі мінут адклікнуліся бацькі.

– Тата, – прамовіў Алесік, – мы ўжо на Залатой планеце. Тут вельмі прыгожа, вакол добрыя людзі. Над намі апекуецца дзядзька Рут.

– Глядзіце, не ўлезце куды-небудзь. Будзьце асцярожнымі, абачлівымі.

– Не хвалюйся, тата. Усё будзе добра.

Бацька Жэнькі пасля такой жа размовы сказаў:

– Мама хоча з табой пагаварыць. Перадаю трубку.

– Сынок, ну як ты там?

Усё выдатна, мама. Хутка вернемся на Зямлю. Прывязу вам падарункі. Не перажывайце!

Размова скончылася. Рут заўважыў:

– Вось так, і бацькам стала лягчэй на душы, і ў вас пасвятлела ў вачах. На развітанне Рут сказаў:

– Я яшчэ буду заглядваць сюды. А пака бывайце.

На шырокіх крылах ён узняўся ў неба і паляцеў дадому.

## *Арлінае гняздо*

Раніцаю пасля снядання Жэнька выказаў хваляванне:

– Штосьці ў мяне пачалі здаваць сілы. Ці не папіць нам чаю з сініх кветачак?

– Не перашкодзіла б, – падтрымаў яго Алесік.

Яны ўзялі кубкі і накіраваліся да кіпучага фантана.

Як толькі выпілі там, на беразе ручая чаю, адразу захацелася бегчы, падскокваць, ісці далёка-далёка… Алесік прапанаваў прагуляцца ўздоўж мора.

–Капітан Зайцава Вуха, – прамовіў ён, – ужо адплыў на сваім караблі, і нам нішто не перашкаджае. Жэнька падтрымаў ідэю сябра. Яны ішлі поруч, смяяліся, жартавалі, размаўлялі. На шляху трапляліся то высокія, тоўстыя дрэвы, то густое кустоў'е, то вузкія прагаліны.

У хуткім часе, выбраўшыся з лесу, малыя ўбачылі перад сабой гару, не вельмі высокую, але і не нізкую. Закарцела ўзабрацца на самую вяршыню.

–Ці хопіць сілы? – засумняваўся Жэнька.

–Дык папілі ж цалебнага чаю. Чаго ты яшчэ хочаш?..

Праз колькі часу хлопчыкі наблізіліся да гары. У падножжа і вышэй раслі кусты, дзе гусцейшыя, дзе радзейшыя. Яны прасоўвацца малым не перашкаджалі. Ды і звілістая сцяжынка не была крутою. Сябры ўзбіраліся ўгору даволі шпарка.

…І вось вяршыня. А на ёй вялікае, круглае гняздо. Юныя зямляне перагнуліся цераз яго край і убачылі на дне агромністыя, як валейбольныя мячы, рабыя яйкі.

–Гэта арліныя, – сцвердзіў Алесік.

–І я так думаю, – пагадзіўся Жэнька. Падлічылі: іх аказалася дваццаць пяць.

–Давай дастанем адно і пусцім уніз па схіле, няхай коціцца ў мора – прапанаваў Жэнька.

–Ты што?! Наляціць арол, разарве нас на кавалкі. Лепш, пакуль не позна, зматаем вудачкі.

Яны паспяшылі ўніз. І ледзь паспелі дабрацца да кустоў'я, як пачуўся рэзкі свіст крыл. Здагадаліся – гэта

арол.

– Што я табе казаў, – задаволены сваім прароцтвам прамовіў Алесік. Якраз застаў бы нас на месцы злачынства. Было б, то было б... Хавайся пад галінкі, каб не прыкмеціў. Драпежнік не ўбачыў малых і з растапыранымі крыламі сеў у сваё гняздо.

## *Барамолы*

Пераканаўшыся, што арол супакоіўся ў гняздзе, Алесік і Жэнька выбраліся з кустоў'я і назад шыбавалі праз лес.

У вочы ім кінулася тоўстае, метраў дзесяць у дыяметры, дрэва з чырвоным лісцем. Тут жа хлопчыкі ўбачылі, як аднекуль выскачылі і пабеглі па ствале ўгору два рыжыя зяркі, падобныя на нашы вавёркі, толькі большыя – велічынёю мо з гадавалых аўчарак.

– Гэта, напэўна, барамолы, – выказаў меркаванне Алесік. – Бачыш, рыжыя. Дзядзька Рут казаў, што яны рыжыя.

– Барамолы, барамолы – і не сумнявайся. Зяркі ўлезлі ў шырокае, круглае дупло, прымасціліся там, высунулі галовы і пазіралі на малых.

– От цікава, чым яны харчуюцца? – услых задумаўся Жэнька.

– Касманаўт жа гаварыў, што на гэтай планеце і людзі і жывёлы ядуць усё падрад.

– Я запытаю, – не супакойваўся Жэнька. – Эй, барамолы, што вы ясцё?

Адзін са зяркоў выкінуў з дупла карычневы шарык, накшалт невялікага дзіцячага мячыка. Жэнька паспрабаваў яго раскусіць. Не тут тое было: аказаўся не па зубах. Барамолы зразумелі гэта і самыя раскусвалі

шарыкі і кідалі малым. Сябры вылузвалі са шкарлупак ежу. На смак яна была такая, як грэцкія арэхі. Алесік і Жэнька добра падсілкаваліся і ўсё глядзелі і глядзелі на барамолаў.

–Можа папросім у іх няхай яшчэ накідаюць. Возьмем з сабою, – прапанаваў Жэнька. І Алесік тут жа выкрыкнуў:

–Мілыя барамолы! Накідайце нам больш арэхаў!

Тыя пераглянуліся, азірнуліся ў дупло, нешта прыкінулі пра сябе і скінулі ўніз яшчэ нямала арэхаў.

–Мы будзем помніць пра вашу дабрыню! – запэўніў звяркоў Алесік. – І раскажам пра вас дзецям на Зямлі.

## *Бурамур*

У малых скончыліся прадукты, і яны вырашылі прайсціся па той самай дарозе, па якой прагульваліся з Рутам. Спачатку нішто здзіўляючае не траплялася на вочы. А праз некаторы час з-за паварота высунулася вялізная жывёліна. Яна была ў тры разы вышэй і даўжэй за слана. Толькі ў яе адсутнічаў хобат. На баках, спіне і шыі віднеліся шырокія цёмна-белыя палосы, такія самыя, як у зебры. Працягваліся ж яны не ўпоперак, а ўздоўж тулава. Хлопчыкі здагадаліся – гэта бурамур.

–Што будзем рабіць – уцякаць, ці пастаім? – параіўся Жэнька з Алесікам.

–Давай пойдзем насустрач. Рут жа казаў, што ён ні на каго не нападае.

Сябры не збочылі. Ды бачаць: бурамур сам пахіліўся направа, дайшоў да разгалінастага дрэва і пачаў аб’ядаць на ім лісце.

–Эй, бурамур, ідзі да нас, – выгукнуў Алесік. – Мы цябе не пакрыўдзім.

“Яшчэ б, – падумаў бурамур, – толькі гэтага мне не хапала, каб усякая казяўка крыўдзіла”. – Ён глянуў на малых цёмна-ліловымі, выпуклымі як фары ў аўтамашыны вачыма і зноў пачаў сілкавацца.

–Давай мы яго чым-небудзь пачастуем, – прапанаваў Жэнька.

–А чым?

–Ну хоць бы травою. Нарвём і прыпаднясём да пысы.

Сябры так і зрабілі. Бурамур па чарзе то ў аднаго, то ў другога хлопчыка браў з рук траву, жаваў і праглынаў.

–Не бойся нас, бурамур, – падбадзёрыў жывёліну Алесік. – Мы не ліхія.

“Ну і сказаў, – падумаў бурамур. – Я адною нагою магу расціснуць вас дваіх разам. Проста я добры”.

–Не будзем перашкаджаць яму, – прамовіў Жэнька. – Няхай есць. А мы ідзём сваёй дарогай.

## *У горадзе Гурон*

Набліжаўся надвячорак. У далечыні недзе грымела. Алесік і Жэнька больш нарыхтавалі лісцяў, каб надзейней схавацца ад дажджу.

Хутка сцямнела. Праз некаторы час моцна загрымела над самай галавой. На лісце хлынуў буйны лівень. Яно вады не прапускала.

Дождж струменіў усю ноч. Пад раніцу распагодзілася. Сябры вылезлі з-пад “коўдры” і ўбачылі: над зямлёй павісла шырокая вясёлка. У ёй былі

чатырнаццаць колераў і ўсе такія яркія, прыгожыя, што проста вачэй не адвесці.

Жэнька прыкмеціў пад аркаю вясёлкі дробную цёмную плямку, накшалт птушкі. Нешта ляцела.

–Можа дзядзька Рут? – прамовіў ён.

Сябры стаялі, пазіралі туды і чакалі. Неўзабаве распазналі ў плямцы чалавека. Пазней стаў выразна бачны твар.

–Дзядзька Рут! – узрадаваліся малыя. Ён апусціўся побач з іх стаянкай.

–Ну, як пераначавалі? – спытаў.

–Добра. Не прамоклі.

–Я хачу вас звазіць у горад Гурон. Гэта наша сталіца. Вы не супраць?

–Не, не, дзядзечка. Але на чым мы паедзем?

–Выклічу лятаючую талерку.

–Было б выдатна.

Рут дастаў з кішэні круглы мабільнік і пачаў націскаць на кнопкі. Нехта там адгукнуўся.

–Прышліце да нас талерку. Я на стаянцы ў юных зямлян.

–Праз паўгадзіны прыляцім, – пачуўся голас у мабільніку.

І, праўда, праз некаторы час талерка апусцілася ў вызначаным месцы. Адчыніліся дзверы.

–Заходзьце, – запрасіў дзядзька Рут і прапусціў хлопчыкаў наперад.

Прызямліліся бліз горада Гурон. Дзядзька Рут вывеў малых на цэнтральную вуліцу. Хлопчыкі жахнуліся: амерыканскія небаскробы ў параўнанні з гэтымі дамамі выглядалі б проста запалкавымі скрыначкамі. Наўкола хадзілі пешшу, пералятал з

балкона на балкон крылатыя людзі: мужчыны, жанчыны, хлопцы, дзяўчаты, дзеці. Некаторыя ляцелі ў вышыні ўздоўж вуліцы.

–Чаму тут няма ніякіх машын? – пацікавіўся Жэнька.

–Таму, каб не забруджваць асяроддзе. Мы толькі ходзім пешшу, ці пералятаем з месца на месца на сваіх крылах. А на далёкія адлегласці перамяшчаемся на лятаючых талерках.

–Прыгожа ў вас тут, чыста! – захапляўся ўбачаным Алесік.

–Заставайцеся жыць у нашым горадзе, – прапанаваў дзядзька Рут.

–Не, нас цягне на прыроду, бліжэй да мора, да лесу. Хочам лепш пазнаёміцца з раслінным і жывёльным светам. На адной з вуліц убачылі, як бурамур цягнуў вялізны воз, велічынёй з наш белазаўскі самазвал. Мажны ездавы сядзеў на агромістым залатым валуне, паставіўшы ногі на два меньшыя, злёгку памахваў перад сабою доўгай пугай, нібы дырыжыраваў сам сабе, і спяваў працяглую песню.

–Што бурамур перавозіць? – запытаў Алесік.

–Розныя грузы. Зараз, бычыце, вязе золата.

–Але і дужы!

–Ваш зямны цягнік больш пацягне.

Пад вечар касманаўты на той самай талерцы даставілі малых на іх стаянку.

## *Лебедзі-веліканы*

У гэты дзень малых зноў пацягнула на бераг мора.

–Колькі мы будзем хадзіць у левым накірунку,

прамовіў Алесік. – Давай павернем направа. А вось што-небудзь здатнае таксама напаткаем у дарозе. Жэнька паслухаў сябра, і яны спакойна крочылі па выбраным шляху.

–Паглядзі, што там бялее на моры непадалёку ад берага, – насцярожыўся Алесік.

Сябры ўтаропілі позіркі ў далячынь. Нейкія белыя гурбы ўсё прыбліжаліся і прыбліжаліся. Пасля іх стала бачна выразна.

–Лебедзі! – ускрыкнуў Жэнька. Яны плывуць да нас. У хуткім часе птушкі параўняліся. Яны былі вялічынёй з аднапавярховы дом. Аднак, на месцы доўга не затрымаліся, паплылі далей, уздымаючы перад сабою і з бакоў паўмятровыя хвалі. Ды што гэта? Лебедзі ўвачавідкі павярнулі назад, зноў спыніліся насупраць хлопчыкаў.

–Ге-ге! – падавалі птушкі незразумелыя гукі і паварочвалі дзюбы ў той бок, адкуль плылі спачатку.

–Нешта яны хочуць гэтым сказаць, – прамовіў Жэнька, – пайшлі туды, куды яны паказваюць дзюбамі. Сябры пашыбавалі берагам, а лебедзі плылі ўпоравень з імі. На шляху трапіўся невялікі пагорак. Хлопчыкі ўзабраліся на яго паверхню і ўбачылі адзінокага лебедзя, які стаяў непадалёку на адной назе. Другую падкурчыў. Прыйшлі да самай птушкі. З падкурчанай нагі капала кроў.

–Яму патрэбна дапамога, – рашыў Жэнька. – Бачыш, параненны. Ці не патэлефанаваць дзядзьку Руту. Самы мы з гэтым не справімся.

–Вось чаму лебедзі напачатку абмінулі нас, – заўважыў Алесік. – Яны палічылі, што мы малыя, бездапаможныя, нічога не зробім і шукалі дарослага

чалавека, ды не знайшлі і вярнуліся назад.

Зараз птушкі стаялі паблізу берага і падавалі тыя ж трывожныя гукі:

– Ге-ге-ге!

Жэнька дастаў з кішэні мабільнік і набраў нумар тэлефона Рута. Той адклікнуўся. Уважліва выслухаў Жэньку і запэўніў:

– Зараз прылячу. Будзьце на месцы.

І, сапраўды, ён неўзабаве прызямліўся каля птушкі. Агледзеў яе рану, змазаў нейкай маззю, забінтаваў.

– Праз дзве гадзіны рана загоіцца, – сказаў Рут.

Траіх яны сядзелі на беразе і чакалі. Лебедзі стаіліся ў вадзе насупраць.

– Дзядзька Рут, а што з ім зрабілася? – пацікавіўся Алесік. – Недзе аб рыф моцна стукнуўся нагою і пакалечыў. Але пералому няма.

– Мазь вельмі цалебная, дапаможа.

Спакваля лебедзь пачаў выпростваць параненую нагу і асцярожна прыступіў ёю на пясок. Рут і хлопчыкі абрадаваліся. Ажывіліся і ўсе вадаплаваючыя птушкі. Яны з надзеяй чакалі, калі нарэшце пакутнік увальецца ў іх зграю. Прайшло яшчэ з паўгадзіны – велікан ўпэўнена ўступіў у мора, паплыў. Лебедзі дружна загегеталі:

– Ге-ге-ге!

– Гэта яны дзякуюць нам за дапамогу, – узрадавана ўздыхнуў Рут.

… Белыя птушкі пакіравалі ў сінюю далячынь. Рут узняўся ў неба. А Жэнька і Алесік вярнуліся “дамоў”.

## *Чацвёрты прылёт Рута*

Юныя зямляне толькі што паснедалі, папілі чаю і збіраліся ісці ў новую дарогу, як прыляцеў Рут. Хлопчыкі насцярожыліся: што ён скажа.

– У вас цераз месяц канчаюцца канікулы і вам неабходна вяртацца на Зямлю, – прамовіў апякун. – Вось я і хачу дапамагчы вам сабрацца ў далёкі шлях. Трэба ж набраць для родных, сяброў знаёмых такіх-сякіх прысмакаў, падарункаў. У вас усяго, мабыць, па адным рэчмяшку, ды я прынёс яшчэ чатыры.

– А што нам можна ўзяць з сабою? – запытаў Жэнька.

– Ну, набярыце абадораў, курамякаў, абакураў.

– А ці можна захапіць нешта падобнае на нашы арэхі? – уставіў слова Алесік.

– А-а, гэта біяры. Імі харчуюцца барамолы. Вазьміце і іх.

– Дзядзька Рут, мы бачылі крушню залатых камянёў, валуноў, шмат дробных залатых шарыкаў. Вось каб з гэтага што-небудзь даставіць дамоў?

– Шарыкаў можаце набраць, колькі вам захочацца. А валуноў і камянёў – не трэба. Я не хачу раздражняць апетыты зямлян. Яны падкія на золата. Як даведаюцца, што тут гэтага метала мерана-нямерана, зачасцяць на нашу планету. Да таго ж яшчэ пачнуць праяўляць агрэсіўныя памкненні. Яны любяць ваяваць. Колькі жывуць, столькі ваююць паміж сабою. А навошта гэта бяздумнае ўзаемнае забойства? Усё з-за нажывы.

Па праўдзе кажучы, ніякага нашэсця мы не баімся.

А вашу Зямлю можам пакарыць за адзін дзень. І не зброяй, а іншымі сродкамі.

–Якімі? – зацікавіўся Алесік.

–Гэта сакрэт.

–Дзядзька Рут, – папрасіў Жэнька, раскажыце яшчэ што-небудзь цікавае.

–На нашай планеце налічваецца больш ста мільярдаў чалавек, кожны з якіх жыве па тысячы і больш гадоў. Ёсць людзі крылатыя і бяскрылыя. Канфліктаў паміж намі не бывае, войнаў – таксама. У нас няма дзялення на расы і нацыяальнасці. Мы адзіны народ.

Сушу на Залатой планеце абмываюць дваццаць чатыры акіяны, пяцьдзесят восем мароў. Шмат рэк у шырыні дасягаюць шасці-сямі кіламетраў. Зямля ў параўнанні з нашай планетай – макавае зерне. А золата, якое так цэняць вашы людзі, мы замест звычайных камянёў кладзём у падмуркі дамоў. Наша планета ўсыпана золатам.

–Дзядзька Рут, – усхваляваўся Жэнька, – а ці ёсць хто мацнейшы за вас у сусвеце?

–Пакуль што няма. У будучым, магчыма, хто і аб'явіцца. У гэты дзень дзядзька Рут дапамог хлопчыкам набраць шмат абакураў, абадораў, курамякаў, біяраў.

Пасля ўсе трое пакіравалі да крушні залатых зліткаў, дзе набралі нямала залатых шарыкаў.

Развіталіся на стаянцы.

–Прыляцім цераз два дні, – папярэдзіў Рут. – Каб былі гатовы для адпраўкі на Зямлю.

## *Вяртанне на Зямлю*

Рут, як і абяцаў, прыляцеў на лятаючай талерцы з поўным экіпажам касманаўтаў раніцай. Ён падаў яшчэ адзін рэчмяшок хлопчыкам і дапамог пакласці ў яго засушаныя сінія кветачкі. Касманаўты, тры маладыя хлопцы, паглядзелі на Жэньку і Алесіка і адзін з іх спытаў:

– Вы пазналі нас?

– Пазналі.

– Ну, як вам жылося на нашай планеце?

– Нармальна. Не горш, чым на Зямлі. Так цікава ўсё тут!

– Яшчэ можа калі захочаце пабываць?

– Пры выпадку не адмовімся.

Час прыспешваў. Дзядзька Рут, касманаўты і хлопчыкі пагрузілі рэчмяшкі, самы занялі адпаведныя месцы, прышчапіліся рамянамі – і лятаючая талерка ўзяла курс да сонечнай сістэмы.

Калі да Зямлі заставалася некалькі тысяч кіламетраў, камандзір экіпажа спытаў:

– Дзе вас высадзіць?

– У Беларусі, – адказаў Алесік.

– Я ведаю, што ў Беларусі. Але ў якім месцы?

–У Лідзе, на пляцоўцы, дзе ў 2010 годзе праводзіліся дажынкі.

Перад вачыма касманаўтаў ляжала дакладная карта ўсёй Зямлі, у тым ліку і Беларусі. Яны ўбачылі на ёй кружок і надпіс “Ліда”. Пры набліжэнні да Зямлі лятаючая талерка збавіла скорасць, пранеслася над

новым лідскім паркам і села акурат на пляцоўку, дзе ладзяцца розныя святочныя мерапрыемствы. З яе выйшлі касманаўты і дзядзька Рут. Адпачываючыя на беразе Лідзейкі, дарослыя і дзеці, якіх тут было нямала, напалохаліся і пачалі адступацца. Але калі ўбачылі, што з талеркі выйшлі два хлопчыкі, супакоіліся і спыніліся.

– Не бойцеся! – моцна выгукнуў Жэнька, – гэта іншапланяцяне, а мы з Алесікам вашы землякі, лідчане.

Малыя паставілі рэчмяшкі, узнялі рукі і прывіталі натоўп. Следам за імі пачалі махаць рукамі касманаўты і дзядзька Рут.

– Падыходзьце бліжэй! – запрасіў Алесік. – Усё будзе спакойна.

Некаторыя пасмялелі і сталі прыбліжацца. У натоўпе аказаўся і аднакласнік хлопчыкаў нехта Лёня Амбражук з восьмай школы. Ён падышоў да самых іншапланяцян і сваіх сяброў.

– Дзе вы былі? – спытаў.

– У космасе. На Залатой планеце.

– Раскажаце пасля пра свае прыгоды мне?

– Абавязкова.

У экіпажа час быў распісаны па мінутах – іншапланяцяне спяшаліся. Пры развітанні дзядзька Рут і касманаўты ўзялі ў Жэнькі і Алесіка нумары дамашніх тэлефонаў і мабільнікаў, пяшчотна па чарзе абнялі малых.

Праз хвілю лятаючая талерка адарвалася ад Зямлі.

А Лёня Амбражук дапамог сябрам, якія жывуць з ім у адным пад’ездзе, данесці дадому рэчмяшкі з падарункамі.

# *Змест*

Паэзія ........................................................................ 5
Вершы для дзяцей ........................................................ 98
Проза ........................................................................ 106

Літаратурна-мастацкае выданне

**ВАСЬКО**
Уладзімір Гаўрылавіч

ЭНЕРГІЯ ДУШЫ

Адказны за выпуск *В. У. Нічыпар*
Кампутарная вёрстка *В. І. Грышко*
Карэктар *В. І. Грышко*

Падпісана да друку 24.09.2018. Фармат 60×84/16 12+
Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 9,3. Ул.-выд. арк. 10,7.
Тыраж 100 экз. Заказ 2770.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
ГАУПП «Лідская друкарня».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў:
№ 1/281 от 07.04.2014, № 2/101 от 01.04.2014.

Вул. Ленінская, 23, 231300, г. Ліда.